Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

№ 98 (28714)

25 МАЯ 2018 г.

ПЯТНІЦА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

+TV ПРАГРАМА

Новабудоўлі ці другасны рынак?

СТАР. 7

Папярэдзіць траўматызм на працы

Сакрэты «Нацыянальнага хіт-парада»

СТАР. 13

У МІНСКУ ГАВОРАЦЬ ПРА МІР

Прэзідэнт узяў удзел у міжнародным форуме экспертнай ініцыятывы «Мінскі дыялог»

Сёлета ён атрымаў назву «Усходняя Еўропа: у пошуках бяспекі для ўсіх». У цяперашнім форуме бяруць удзел 350 экспертаў і афіцыйных асоб больш чым з 40 краін. Другі дзень маштабнага дыялогу адкрыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

ЗНАЧНАСЦЬ ПЛЯЦОЎКІ ЎЗРАСТАЕ

У пачатку свайго выступлення кіраўнік дзяржавы адзначыў, што сама назва канферэнцыі сведчыць аб тым, што вынесеныя на разгляд удзельнікаў пытанні прадыктаваныя часам і актуальныя для многіх дзяржаў.

«Невыпадкова гэта мерапрыемства праходзіць у Мінску. Тут ужо традыцыйна прадстаўнікі розных краін і рэгіёнаў планеты могуць у абсалютна спакойнай абстаноўцы, поўнай бяспецы абмяркоўваць абсалютна любыя, нават самыя вострыя пытанні, — падкрэсліў ён. — Дзякуючы шматвектарнай знешняй палітыцы Беларусі, павазе да замежных партнёраў, устойліваму сацыяльна-эканамічнаму развіццю нашай дзяржавы ўзрастае яе значнасць як зручнай пляцоўкі, зручнага месца для любых перагавораў».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што на канферэнцыі прысутнічаюць эксперты, навукоўцы і прадстаўнікі краін Заходняй і Усходняй Еўропы, Расіі, ЗША і Кітая, што пацвярджае глабальнасць разглядаемых праблем.

Беларускі лідар дадаў, што Мінская экспертная пляцоўка закліканая спрыяць абмену думкамі, аргументаванай дыскусіі і пачатку дыялогу, дэфіцыт якога выразна адчуваецца ў цяперашніх міжнародных адносінах. На яго думку, важна выпрацаваць і прадставіць палітыкам акрэсленыя прапановы, як зрабіць гэта з захаваннем інтарэсаў усіх бакоў.

Фота БелТА.

«Для многіх людзей відавочна, што з моманту заканчэння халоднай вайны еўрапейская архітэктура бяспекі яшчэ не перажывала такога глыбокага сістэмнага крызісу», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

НІЯКІХ ГАРАНТЫЙ, ШТО ЎСЁ НЕ ПАЎТОРЫЦЦА

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што важнасць існуючых сусветных праблем разумеюць і парламентарыі розных краін. «Менш за год таму на адкрыцці сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ тут жа, у Мінску, адбыўся шырокі абмен думкамі па гэтай тэматыцы, — нагадаў Прэзідэнт. — Тады Беларусь унесла ініцыятыву аб неабходнасці пачатку новага маштабнага міжнароднага дыялогу па пытаннях бяспекі. Ён павінен быць накіраваны на пераадоленне існуючых супярэчнасцяў ва ўзаемаадносінах дзяржаў на агульнай прасторы Еўраатлантыкі і Еўразіі».

Паводле яго слоў, важна, каб такі дыялог пачаўся і яго вынікам стала рэальнае ўмацаванне міжнароднай бяспекі, паколькі апошнія канфлікты толькі пацвярджаюць горшыя меркаванні наконт развіцця сітуацыі ў свеце. «Вялікія дзяржавы, якім належыць быць надзейнымі гарантамі стабільнасці, сёння не могуць прыйсці да адзінага меркавання ні па адным з сур'ёзных пытанняў», — дадаў ён.

Беларускі лідар падкрэсліў, што неспакой, перш за ўсё, выклікае адсутнасць гарантый недапушчэння маштабнага ўзброенага канфлікту, бо сёння трэць дзяржаў планеты ўцягнутыя ў баявыя дзеянні. Па вялікім рахунку, гэта перавышае колькасць краін — удзельніц Другой сусветнай вайны, таму нельга чакаць, пакуль шугане пажар трэцяй.

На думку Прэзідэнта, буйным геапалітычным гульцам час задумацца аб стане сучасных міжнародных адносін, якія вельмі нагадваюць сітуацыю перад Першай сусветнай вайной.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ва ўмовах цяперашніх глабальных геапалітычных і эканамічных трансфармацый прынцыповыя супярэчнасці паміж дзяржавамі назапашваюцца і прымаюць вострую форму, а на авансцэну зноў выходзіць стратэгічнае сапернiцтва, канкурэнцыя паміж вядучымі краінамі.

Адбываецца прамое і ўскоснае парушэнне міжнароднага права, грэбаванне ім становіцца жахлівай практыкай, якая апраўдваецца аналагічнымі дзеяннямі апанентаў.

СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ

Павел САПОЦЬКА, дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея:

«Прыйшоўшы ў Нацыянальны гістарычны музей у ролі кіраўніка, я быў вельмі здзіўлены, якім велізарным багаццем валодае музей і якая колькасць узрушальных, унікальных экспанатаў ёсць у запасніках. У Нацыянальным гістарычным захоўваецца больш як 50 % усяго аб'ёму музейнага фонду — каля 450 тысяч адзінак захоўвання. Усё трэба максімальна паказваць за кошт часовых выставак, сумесных міжнародных праектаў, а для гэтага — шырока выкарыстоўваць патэнцыял супрацоўніцтва падчас праграм абмену, дзён культуры. Патрэбна шматгранная, шматаспектная праца. Усё гэта павінна быць вядома шырокім слаям насельніцтва, гэта трэба беларусам, нам ёсць чым ганарыцца».

■ Класныя навіны

Сустрэча світання не забараняецца

Выпускныя вечары адшумяць 9 і 10 чэрвеня

Рэспубліканскае свята «Апошні званок» упершыню пройдзе 30 мая ў шматфункцыянальным культурна-спартыўным комплексе «Мінск-Арэна». Яго ўдзельнікамі стануць выпускнікі сталічных школ плюс больш за тысячу выпускнікоў з рэгіёнаў Беларусі — па сто найлепшых прадстаўнікоў з пяці абласцей і каля 600 выпускнікоў з Мінскай вобласці.

Як паведаміла журналістам **кансультант галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Ларыса ЕМЯЛЬЯНЧЫК,** плануецца, што гэта свята стане традыцыйным. Запрашэнне на яго атрымалі кіраўнікі горада, міністэрстваў, дэпутаты Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, выбітныя спартсмены, удзельніцы конкурсу «Міс Беларусь — 2018» і іншыя. Святочныя мерапрыемствы распачнуцца на прылеглай да «Мінск—Арэны» тэрыторыі ў 16 гадзін. Там пройдзе культурна-забаўляльная праграма «Парк маладзёжных культур». Праграма ўключае выступленні творчых калектываў, забаўляльныя гульні, спартыўныя спаборніцтвы, навучанне танцам. Будуць працаваць таксама фотазоны. А ў 18 гадзін распачнецца само свята. Падчас урачыстай часткі найлепшых выпускнікоў — пераможцаў міжнародных алімпіяд, спартыўных спаборніцтваў, творчых конкурсаў — узнагародзяць каштоўнымі прызамі і памятнымі знакамі. Будуць вызначаны пераможцы ў намінацыях «Талент», «Чэмпіён-2018», «Самы класны класны». У апошняй узнагародзяць найлепшых класных кіраўнікоў, якія перамаглі ў сваіх абласцях і ў сталіцы.

СТАР. 3

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

НЯСУМНАЕ ЛЕТА З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Вы гарантуеце сабе і сваім блізкім, аформіўшы падпіску на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

ISSN 1990 - 763X

У МІНСКУ ГАВОРАЦЬ ПРА МІР

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Паміж Захадам і Расіяй набіраюць абароты санкцыйнае і інфармацыйнае супрацьстаянне, гандлёвыя войны. Яны сталі штодзённасцю, штодзённай справай. Не відаць канца нагнятанню сітуацыі паміж ЗША, ЕС і Расіяй, а цяпер уцягваюць і Кітай, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Актыўна раскручваецца махавік гонкі ўзбраенняў. І многія ўсведамляюць высокі ўзровень супрацьстаяння — пакуль, праўда, без маштабнага «гарачага» канфлікту. На думку спецыялістаў, сёння сітуацыя горшая, чым у часы халоднай вайны».

Фота БелТА.

ПАГРОЗЫ НОВЫЯ, РАШЭННЯЎ НЯМА

Прэзідэнт дадаў, што ў адрозненне ад даволі прадказальнага саперніцтва Савецкага Саюза і ЗША, найважнейшай адзнакай сённяшняй сітуацыі, наадварот, з'яўляецца непрадказальнасць.

Таксама беларускі лідар звярнуў увагу, што разам з беспрэцэдэнтным ростам тэрарызму, колькасці рэгіянальных канфліктаў, магутнымі сацыяльна-эканамічнымі дысбалансамі, фундаментальнымі пагрозамі дэмаграфічнага і экалагічнага характару мы сутыкаемся з новымі выклікамі, якія трансфармаваліся.

Паводле яго слоў, сваю ролю выконваюць электронныя і лічбавыя метады, якія выкарыстоўваюцца ў палітычнай барацьбе і медыяпрасторы, бо, па сутнасці, інфармацыя — гэта новая зброя.

«Кіберуздзеянне стала фактарам усеагульнай уразлівасці, тым больш пры адсутнасці якіх-небудзь правілаў у гэтай сферы. І часцяком адразу не зразумееш, хто за ўсім гэтым стаіць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Стала відавочна, што многія ранейшыя рэцэпты глабальнага і рэгіянальнага кіравання, пераадолення канфліктаў і натуральных супярэчнасцяў ужо не падыходзяць. Яны часта не спрацоўваюць, а новыя яшчэ не выпрацаваны.

Кіраўнік дзяржавы са шкадаваннем адзначыў, што ў гэтых умовах сусветныя гульцы не гатовыя да спынення канфрантацыі і нават да кампрамісаў. «Мы бачым, што ніводная міжнародная праблема рэальна не вырашаецца», — дадаў ён.

У якасці прыкладаў беларускі лідар прывёў Блізкі Усход, Сірыю, Украіну, абстаноўку вакол Паўночнай Карэі, «вузел» вакол пагадненняў па іранскай ядзернай праграме. Неабходны глыбокі аналіз.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што і Беларусі, і шматлікім краінам Цэнтральнай і Усходняй Еўропы пагражае апынуцца на лініі цывілізаванага разлому, бо бяспека з абстрактнага паняцця стала канкрэтнай з'явай, а яе адсутнасць у любы момант можа закрануць кожнага.

«Таму калі сёння вялікія дзяржавы не могуць дамовіцца паміж сабой, то гэта не азначае, што ўсе астатнія краіны павінны сядзець моўчкі і чакаць іх указанняў, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Перакананы, што Еўропа можа і павінна паказаць прыклад у вырашэнні пытанняў, якія існуюць паміж Усходам і Захадам. Стаць месцам урэгулявання надзённых праблем. Перш за ўсё такіх, як украінскі крызіс».

ДАПАМОГА БЛІЖНЯМУ

«Найбліжэйшая да Беларусі і геаграфічна, і ў чалавечым дачыненні гарачая кропка — Данбас, дзе працягваюць гінуць ні ў чым не вінаватыя мірныя жыхары, перш за ўсё — старыя і дзеці, якія там засталіся. Да гэтага часу цалкам не выкананы ніводны пункт мінскіх пагадненняў», — канстатаваў беларускі лідар.

Ён таксама дадаў, што Украіна — не проста сусед, а, як і расіяне, гэта братэрскі народ. «Мы прынялі ў сябе — удумайцеся толькі — за кароткі прамежак часу больш за 150 тысяч бежанцаў, украінскіх перасяленцаў і іх сем'яў. Дапамагаем ім у працаўладкаванні, медабслугоўванні, сацыяльнай і псіхалагічнай адаптацыі. Аказваем гуманітарную дапамогу людзям па абодва бакі «лініі размежавання» на Данбасе», — распавёў Аляксандр Лукашэнка.

Ён таксама адзначыў, што апошнім часам некаторыя СМІ пачынаюць папракаць Беларусь, што наша краіна нібыта рвецца ў міратворцы. «Паважаныя спадары, мы нікуды не рвёмся. У нас сваіх праблем больш, чым дастаткова. Але я ўжо сказаў пра нашу зацікаўленасць у спакоі ва Украіне. Калі там не будзе міру, то будзе горача не толькі нам, але і ўсім вам. Гэта канфлікт трэба як мага раней не проста пагасіць — ліквідаваць. І ў гэтым вы можаце на нас разлічваць. Мы зробім усё, пра што дамовяцца канфліктуючыя бакі», — сказаў Прэзідэнт.

Па словах кіраўніка дзяржавы, адзіны шлях урэгулявання любых міжнародных спрэчак — адмовіцца ад эмоцый, назапашаных крыўд, прадузятасцяў, узаемных абвінавачванняў і вярнуцца да дыялогу.

ЗБЛІЖАЕМ ПОЛЮСЫ

Далей Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь — гэта суверэнная дзяржава, якая выразна ўсведамляе сваё становішча на міжнароднай восі каардынат. Наша краіна не з Расіяй супраць Еўропы і не з Еўропай супраць Расіі, для нас у прынцыпе непрымальнае пытанне, з кім мы, дадаў беларускі лідар.

Саюзніцкія адносіны з Расіяй, арыентацыя на інтэграцыю ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза ні ў якай меры не ўшчамляе інтарэсаў краін Еўропы. І наадварот: развіццё адносін з ЕС, ЗША, Захадам не супярэчыць дынаміцы цеснага ўзаемадзеяння на Усходзе, а служыць стварэнню зоны даверу.

Для Беларусі адным з ключавых кампанентаў бяспекі быў і застаецца эканамічны. На думку кіраўніка дзяржавы, ён павінен быць у аснове ўсяго.

«Гэты падыход мы мэтанакіравана прасоўваем на ўсіх узроўнях, уключаючы АБСЕ, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Знаходзячыся на стыку Еўразійскага і Еўрапейскага саюзаў, Беларусь асабліва зацікаўлена ў іх узаемным збліжэнні. Трэба пераходзіць ад абстрактных гутарак да пэўнага ўзаемадзеяння».

Гэтага, паводле меркавання беларускага лідара, можна дасягнуць у эканоміцы, энергетыцы, экалогіі, гуманітарным супрацоўніцтве, транспарце, лагістыцы, у барацьбе з нелегальнай міграцыяй, трансгранічнай злачыннасцю.

Прэзідэнт дадаў, што гэта нясе велізарныя выгады для ўсяго кантынента — ад Атлантыкі да Ціхага акіяна, і новыя раздзяляльныя лініі з'яўляцца не павінны.

«Трэба зноў навучыцца слухаць і чуць аргументы адзін аднаго, быць гатовымі да разумных кампрамісаў. Гавару і пра расійскіх, і пра еўрапейскіх, і пра амерыканскіх, і пра кітайскіх партнёраў. Аб вялікіх і малых краінах, блізкіх і далёкіх суседзях», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Адной з дзейсных пляцовак для дыялогу і з'яўляецца АБСЕ, Беларусь гатовая да актыўнага ўзаемадзеяння з кіраўніцтвам, выканаўчымі структурамі і інстытутамі гэтай арганізацыі, італьянскім старшынствам, з усімі ўдзельнікамі, якія падзяляюць гэтыя падыходы, дадаў кіраўнік дзяржавы.

А ШТО РАБІЦЬ ДАЛЕЙ?

«Ужо сёння бачна, што гэтая праца будзе цяжкай, доўгай і запатрабуе кансалідацыі нашых намаганняў. Але мы можам і павінны абапірацца на гэтым шляху на пазітыўны вопыт Хельсінкскага працэсу, які сапраўды вырашыў шмат міжнародных пытанняў, — падкрэсліў беларускі лідар. — Сёння рэальнасцю стаў свет шматпалярны. Узрос уплыў іншых, нееўрапейскіх, рэгіёнаў».

На думку Прэзідэнта, неабходна паступова пашыраць фармат дыялогу ў рамках АБСЕ. Прыцягваць да яго такія краіны, як Індыя, Японія і Кітай.

З прычыны непрымірымасці пазіцый ключавых гульцоў менавіта сярэднія і малыя дзяржавы атрымліваюць унікальную магчымасць ініцыяваць прапановы па дыялогу і мерах даверу.

«Неабходна гэтай магчымасцю скарыстацца, а не выконваць ролю «статыстаў» ці саюзнікаў па ваенна-палітычных блоках, такіх як НАТА або АДКБ. Трэба ў добрым сэнсе парушыць манаполію дыялогу па гэтых пытаннях толькі паміж вялікімі краінамі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён таксама дадаў, што больш адказную пазіцыю варта было б заняць і НАТА, а шматлікія праблемы, з якімі дзяржавы сутыкнуліся сёння, былі выкліканыя пашырэннем гэтай структуры на Усход.

Прэзідэнт канстатаваў, што пасля Другой сусветнай вайны, нягледзячы на ўсе рознагалоссі, лідары краін-пераможцаў змаглі дамовіцца, стварыць ААН, якая адыграла і адыгрывае сваю ролю ў гарантаванні бяспекі.

«Больш за 40 гадоў таму ў Хельсінкі нашы папярэднікі выпрацавалі асноўныя прынцыпы мірных узаемаадносін і падпісалі Заключны акт, у рамках Хельсінскага працэсу сфарміравалі архітэктуру еўрапейскай бяспекі, — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. — Сёння ўсім дзяржавам — вялікім і малым, усім палітыкам, экспертам трэба задумацца пра тое, што мы пакінем у спадчыну будучым пакаленням, нашым дзецям. Нягледзячы на крызіс даверу паміж некаторымі дзяржавамі, сёння сусветнай супольнасці варта вызначыць канкрэтныя напрамкі супрацоўніцтва, якія адказваюць агульным інтарэсам».

Аляксандр Лукашэнка выказаў надзею, што вынікам канферэнцыі ў Мінску стане выпрацоўка канкрэтных рашэнняў па самых актуальных для чалавецтва пытаннях, такіх як тэрарызм, эканамічная бяспека, экалогія, кіберзлачынствы, міграцыя, урэгуляванне «замарожаных» канфліктаў.

У завяршэнні беларускі лідар заклікаў захоўваць мір і запрасіў у Мінск прадстаўнікоў любых палітычных поглядаў.

ЯК ДЫЯЛОГ, ТАК І ІМПУЛЬС

Як распавёў генеральны сакратар АБСЕ Томас Грэмінгер, ператварэнне форуму «Мінскі дыялог» у вялікі перамоўны працэс было б выдатным варыянтам. «Мы павінны зноў паказаць сваю прыхільнасць тым абавязацельствам і прынцыпам, якія былі выпрацаваны падчас Хельсінкскага працэсу. Калі гэта будзе той працэс, які дапаможа нам у гэтым, будзе вельмі добра», — сказаў ён.

Томас Грэмінгер таксама назваў крызіс ва Украіне самай вялікай праблемай у рэгіёне і заклікаў надаць палітычны імпульс мінскім пагадненням. На яго думку, арганізацыя з часам зможа прадставіць зручную платформу для дыялогу. У сувязі з гэтым Томас Грэмінгер адзначыў, што АБСЕ трэба падумаць аб «Хельсінкі-2».

Палітык таксама выказаў падзяку Беларусі за сталічную пляцоўку, таму што ёсць сур'ёзная занепакоенасць узаемаадносінамі паміж краінамі ў свеце.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

■ Ва ўрадзе

Лічбавай трансфармацыяй трэба кіраваць

Ва ўрадзе разгледзелі пытанні дзяржаўнага рэгулявання развіцця лічбавай эканомікі. Падчас пасяджэння Савета па развіцці лічбавай эканомікі прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ адзначыў, што ўкараненне лічбавых тэхналогій ва ўсе сферы вытворчага сектара павінна павысіць эфектыўнасць вытворчасці, забяспечыць канкурэнтаздольнасць прадукцыі. Гэта шмат у чым будзе вызначацца тэмпамі пераходу да новых бізнес-працэсаў.

«У выніку лічбавай трансфармацыі сістэмы дзяржаўнага кіравання неабходна стварэнне гнуткага і эфектыўнага механізму для рэалізацыі асноўных функцый сучаснай дзяржавы: аховы здароўя, падтрымання міжнароднага ўзроўню сістэмы адукацыі і навукі, бяспекі і юрыдычнай абароны насельніцтва, эфектыўнага кіравання дзяржаўнай уласнасцю і павышэння канкурэнтаздольнасці нацыянальнай эканомікі. Для дасягнення гэтай мэты неабходна мадэрнізаваць тэхналогію прыняцця рашэнняў і метады кіравання», — заявіў Андрэй Кабякоў.

Прэм'ер-міністр звярнуў увагу прысутных, што кіраванне працэсамі лічбавай трансфармацыі — складаная і шматгранная задача. Для яе рэалізацыі патрабуецца адпаведная кіраўнічая структура, якая забяспечыць каардынацыю лічбавай трансфармацыі ўсіх удзельнікаў на міжведамасным узроўні.

Падчас пасяджэння Савета яго ўдзельнікам таксама быў прадэманстраваны падрыхтаваны бізнес-супольнасцю відэаролік пра лічбавую трансфармацыю эканомікі.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.

Давыд Гарадзенскі вярнуўся ў Гродна

Помнік адной са знакавых гістарычных фігур краіны быў у чацвер устаноўлены на скрыжаванні гродзенскіх вуліц Замкавай і Давыда Гарадзенскага побач са Старым і Новым замкамі. Вышыня помніка з пастаментам — каля 4 метраў. Яго ўстаноўку прымеркавалі да XII Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур, які пройдзе ў горадзе над Нёманам 1—2 чэрвеня. Менавіта ў першы дзень фестывалю запланавана ўрачыстае адкрыццё помніка: тут з удзелам сярэднявечных рыцараў чакаецца тэатралізаваны паказ.

Вырабіў помнік з суцэльнага кавалка граніту сталічны скульптар Сяргей Аганаў. Ён стаў пераможцам конкурсу эскізных праектаў, які праводзіўся ў пачатку 2017 года. Заказчык — Гродзенская дыяцэзія БПЦ, усе выдаткі ўзяў на сябе мецэнат.

Давыд Гарадзенскі (каля 1283—1326) — кашталян гарадзенскі,ваначальнік і дзяржаўны дзеяч ВКЛ. Ён праславіўся як мужны абаронца Гродна. Па адной з легенд, ён пахаваны каля сцен Каложскай царквы.

Фота БелТА.

Сустрэча світання не забараняецца

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Затым усіх чакае канцэрт. «Нас прасілі не агучваць загадзя імёны, каб захаваць інтрыгу, але Ягора Крыда дакладна не будзе, — адказала на пытанне журналістаў Ларыса Емяльянчык. — Адважуся сказаць, што гэта будуць самыя папулярныя сярод моладзі на сёння артысты беларускай эстрады». Мяркуецца, што мерапрыемства завершыцца ў 21.00. Затым усіх адзінаццацікласнікаў чакае дзень адпачынку, а ўжо 1 чэрвеня ў навучальных установах стартуюць выпускныя іспыты.

Навучэнцы 11-х класаў будуць здаваць чатыры абавязковыя экзамены. Пісьмовыя іспыты па рускай або беларускай мове (на выбар) і матэматыцы пройдуць 1, 4 і 6 чэрвеня. Тэксты і заданні для правядзення выпускных экзаменаў у пісьмовай форме будуць аб'яўляцца праз сродкі масавай інфармацыі, а таксама іх размесцяць на партале Міністэрства адукацыі. Навучэнцы сярэдніх школ, у якіх было арганізавана вывучэнне гэтых прадметаў на павышаным узроўні, будуць пісаць пераказ і экзаменацыйную работу па матэматыцы па розных заданнях і тэкстах. Акрамя таго, адзінаццацікласнікам трэба будзе здаць экзамен па замежнай мове і гісторыі Беларусі.

У Мінску выпускныя пройдуць 9 чэрвеня. Мяркуецца, што ўрачыстасці распачнуцца ў 20 гадзін і працягнуцца да 4-6 гадзін раніцы.

Пасля заканчэння базавай школы вучні будуць здаваць тры экзамены: беларускую мову (дыктоўку), рускую мову (дыктоўку) і матэматыку (пісьмова). Даты правядзення пісьмовых экзаменаў — 2, 5 і 7 чэрвеня.

Пры складанні экзаменацыйнага раскладу павінны ўлічвацца санітарныя нормы і правілы. Перапынак паміж экзаменамі — не менш за адзін дзень. Для выпускнікоў базавай школы на выкананне пісьмовай работы па беларускай і рускай мове адводзіцца 1 астранамічная гадзіна і 4 астранамічныя гадзіны — для напісання матэматыкі. Адзінаццацікласнікі пішуць пераказ па мове 4 астранамічныя гадзіны, а на матэматыку даецца на гадзіну больш. Для падрыхтоўкі да вуснага адказу выпускнікам адводзіцца не больш за 30 хвілін.

Выпускныя вечары для адзінаццацікласнікаў пройдуць 9 і 10 чэрвеня. Рашэнне аб даце і месцы іх правядзення, працягласці па часе прымаюць кіраўнікі ўстаноў адукацыі сумесна з бацькоўскімі камітэтамі і ўзгадняюць з мясцовымі органамі ўлады. Толькі ў асобных выпадках выпускны можа прайсці ва ўстанове дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ці ўстанове культуры. Такая сітуацыя магчымая, калі, напрыклад, у школе старой пабудовы няма актавай залы або колькасць выпускнікоў перавышае колькасць месцаў у ёй. У сталіцы 17 установ адукацыі ўзгаднілі ў якасці базы правядзення выпускнога іншыя аб'екты ў горадзе. У Мінску выпускныя пройдуць 9 чэрвеня. Мяркуецца, што ўрачыстасці распачнуцца ў 20 гадзін і працягнуцца да 4-6 гадзін раніцы.

У 2017/2018 навучальным годзе ў Беларусі функцыянуе 3067 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, у якіх навучаюцца 994,5 тысячы навучэнцаў. У 9-х класах вучацца 85 тысяч хлопчыкаў і дзяўчынак, а ў 11-х класах — 58 тысяч чалавек.

«Сустрэча выпускнікамі світання дапускаецца пры ўмове, што адказнасць за дзяцей нясуць як педагагічныя работнікі, так і бацькі, — папярэдзіла Ларыса Емяльянчык. — І калі бацькі забіраюць сваё дзіця з выпускнога раней, то яны павінны папярэдзіць класнага кіраўніка і адміністрацыю ўстановы адукацыі. Мы строга парадак не рэгламентуем, але пажадана ўсё зрабіць у пісьмовай форме, таму што ў гэтым выпадку яны бяруць адказнасць на сябе».

Ужо не першы год у дні правядзення апошніх званкоў і выпускных вечароў у краіне дзейнічае забарона на продаж алкаголю ў гандлёвых аб'ектах. І гэта мера, як лічыць **старшы інспектар па асаблівых даручэннях упраўлення прафілактыкі ГУАПП МУС Аркадзь ХАРЫТОНЕНКАЎ,** прыносіць свой плён. У апошнія гады выпадкаў ужывання спіртных напіткаў на школьных святах заўважана не было. «Калі параўнаць з маім досведам 15—20-гадовай даўнасці, калі я працаваў інспектарам па справах непаўналетніх, то хачу заўважыць, што культура ўзрасла: калі раней многія спрабавалі праносіць з сабой алкаголь, а на свята імкнуліся трапіць пабочныя людзі, то цяпер выпускныя праходзяць спакойна», — падкрэсліў Аркадзь Харытоненкаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Дыялог з уладай

Як паказвае вопыт, суботнія тэлефонныя лініі дапамагаюць аператыўна вырашыць праблемныя сітуацыі, якія ўзнікаюць у людзей. Упершыню такі дыялог адбыўся каля двух гадоў таму. За гэты час значна павысілася эфектыўнасць работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб.

Чарговыя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 26 мая ў Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах з 9.00 да 12.00, у гэтую суботу іх правядуць:

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Андрэй Анатолевіч КЛЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;

першы намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Алег Сяргеевіч МАЦКЕВІЧ. Тэл. 8 021 222 22 22;

першы намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Аляксандр Віктаравіч МІКАЛУЦКІ. Тэл. 8 023 233 12 37;

першы намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Іван Алейзавіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;

кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8 022 250 18 69;

старшыня МІНСКАГА аблсавета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;

старшыня МІНСКАГА гарвыканкама Андрэй Віктаравіч ШОРАЦ. Тэл. 8 017 222 44 44.

ПРЫЗАВЫЯ — ЗА ПАСАДУ

У Мінску распачата крымінальная справа ў дачыненні да дырэктара цэнтра па Параалімпійскіх і Дэфлімпійскіх відах спорту

Пра гэта паведамляе Следчы камітэт Рэспублікі Беларусь. Крымінальная справа ўзбуджаная па матэрыялах упраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ГУУС Мінгарвыканкама.

Следствам устаноўлена, што галоўны трэнер нацыянальнай каманды па інваспорце цэнтра перадала ў якасці хабару 15 тыс. долараў дырэктару ўстановы пры пасярэдніцтве сястры-блізняці кіраўніка за спрыяльнае вырашэнне пытання аб заключэнні новага працоўнага кантракта. Гэтыя грошы раней былі пералічаны галоўнаму трэнеру каманды ў якасці ўзнагароджання за падрыхтоўку спартсменаў, якія занялі прызавыя месцы на Параалімпійскіх гульнях у Пхёнчхане. Пры гэтым дырэктар дала зразумець, што толькі ў выпадку перадачы ёй гэтых грошай 37-гадовая жанчына зможа працягнуць працу на пасадзе галоўнага трэнера.

46-гадовы дырэктар затрыманая, следчыя будуць хадайнічаць перад пракурорам аб прымяненні да яе меры стрымання ў выглядзе заключэння пад варту. Расследаванне крымінальнай справы працягваецца, устанаўліваюцца акалічнасці супрацьпраўных дзеянняў.

Спецыялісты Следчага камітэта адзначаюць, што асоба, якая дала хабар, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці, калі ў адносінах да яе мела месца вымагальніцтва хабару альбо калі гэта асоба пасля дачы хабару добраахвотна заявіла аб зробленым.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ІРАН ПАСТАВІЎ ПЕРАД ЕЎРОПАЙ СЕМ УМОЎ ДЛЯ ЗАХАВАННЯ ЯДЗЕРНАЙ ЗДЗЕЛКІ

Іран прад'явіў еўрапейскім краінам сем умоў, выкананне якіх захавае прыхільнасць Тэгерана ядзернай здзелцы. Пра гэта паведамляе тэлеканал Al Jazeera ў сваім «Твітэры» са спасылкай на духоўнага лідара Ісламскай Рэспублікі аяталу Алі Хаменеі. У прыватнасці, Тэгеран настойвае на тым, што Еўропа павінна забяспечыць гарантыі для продажу іранскай нафты, а таксама адсутнасць перашкод для супрацоўніцтва еўрапейскіх банкаў з Іранам. У адваротным выпадку Іран пакідае за сабой права аднавіць сваю ядзерную актыўнасць, заявіў Хаменеі. Як вядома, Тэгеран і шэсць краін-пасярэднікаў (Расія, ЗША, Вялікабрытанія, Кітай, Францыя, Германія) вызначылі ўмовы іранскай ядзернай праграмы летам 2015 года. Па дагаворы Іран адмаўляецца ад далейшага развіцця гэтай праграмы ў абмен на зняцце санкцый.

МЭЙ ПРАПАНУЕ ЕЎРАСАЮЗУ ДАМОВІЦЦА АБ ДРУГІМ ПЕРАХОДНЫМ ПЕРЫЯДЗЕ ПАСЛЯ БРЭКСІТУ

Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Тэрэза Мэй плануе прапанаваць Еўрасаюзу ўзгадніць другі пераходны перыяд пасля выхаду краіны з ЕС. Пра гэта паведаміла газета The Times. Паводле яе даных, мяркуецца, што пераходны перыяд будзе доўжыцца да 2023 года. Падчас яго будуць вырашацца мытныя і гандлёвыя пытанні. Чакаецца, што брэксіт пройдзе 29 сакавіка 2019 года, пасля чаго, згодна з планам, павінен наступіць пераходны перыяд, які будзе доўжыцца да 31 снежня 2020 года. На дадзены момант Мэй не накіравала прапанову ў Брусель з-за адсутнасці кансэнсусу з боку ўдзельнікаў перагавораў ад ЕС і Кансерватыўнай партыі Вялікабрытаніі, адзначае выданне. Перагаворы па брэксіце павінны працягнуцца да лістапада 2018 года.

СТРАТЫ КІТАЙСКАЙ ZTE З-ЗА АМЕРЫКАНСКІХ САНКЦЫЙ СКЛАЛІ БОЛЬШ ЗА 3 МЛРД ДОЛАРАЎ

Кітайская кампанія ZTE ацаніла свае страты ад спынення дзейнасці ў выніку санкцый ЗША як мінімум у 20 млрд юаняў (каля 3,1 млрд долараў), паведамляе «Інтэрфакс». Як вядома, карпарацыя займае пятае месца па аб'ёме выручкі сярод сусветных вытворцаў тэлекамунікацыйнага абсталявання.

Нагадаем, у красавіку ЗША ўвялі сямігадовую забарону на закупку ZTE прадукцыі амерыканскіх тэхналагічных кампаній. Цяпер карпарацыя разлічвае неўзабаве дасягнуць пагаднення з уладамі ЗША, каб аднавіць нармальныя аперацыі. Раней на гэтым тыдні стала вядома, што Пекін і Вашынгтон у агульных рысах узгаднілі схему аднаўлення дзейнасці ZTE.

ЯЙКІ ЎКЛЮЧЫЛІ Ў «ДЫЕТУ ЗДАРОЎЯ»

Ужыванне ў ежу хоць бы аднаго яйка ў дзень зніжае рызыку сардэчна-сасудзістых захворванняў. Да такой высновы прыйшлі брытанскія навукоўцы на падставе вынікаў даследавання, праведзенага ў Кітаі, у якім узялі ўдзел каля паўмільёна чалавек. Вынікі даследавання апублікаваныя ў часопісе Heart. Навукоўцы лічаць, што яйкі ў дзённым рацыёне чалавека — залог здароўя. Шэраг спецыялістаў цяпер мяркуюць, што прысутнасць яек у штодзённым рацыёне — частка «дыеты здароўя». І тлумачаць гэта тым, што яйкі — адзін з самых насычаных па складзе карыснымі рэчывамі прадуктаў харчавання. У іх змяшчаецца шмат бялку, вітаміны A, D, B і B12, а таксама лютэін і зеаксанцін, якія спрыяюць умацаванню зроку. «З'ядаць адно або нават два яйкі ў дзень — гэта выдатна. Не трэба іх баяцца», — лічыць доктар Фрэнкі Філіпс з Брытанскай дыеталагічнай асацыяцыі. Ён, праўда, папярэджвае: яйкамі не варта злоўжываць, як і любой іншай ежай. У іх шмат бялку, лішак якога ў арганізме стварае празмерную нагрузку на ныркі.

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуюць у сувязі са смерцю былога міністра ўнутраных спраў БССР, дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь адзінаццатага і дванаццатага скліканняў ПІСКАРОВА Віктара Аляксеевіча і выказваюць шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

ПРАВІЛЫ ДОБРЫХ КАНІКУЛ

Спецыялісты нагадалі, як правесці лета без траўмаў

Большасць ДТЗ, у якіх церпяць дзеці, здараецца ў цёплы час года. Гінуць у вадзе школьнікі таксама пераважна летам. Доўгія канікулы — перыяд вялікай адказнасці для бацькоў, і напярэдадні лета важна нагадаць дзецям аб правілах паводзін на дарогах, вадаёмах, у лесе і іншых месцах.

Паводле інфармацыі **старшага навуковага супрацоўніка РНПЦ траўматалогіі і артапедыі, дзіцячага артапеда-траўматолага Аляксандра МУХЛІ,** у структуры дзіцячай смяротнасці ад знешніх прычын на першым месцы знаходзяцца ДТЗ (20 %), на другім — утапленні (19,5 %), на трэцім — самагубствы (18,8 %). Нягледзячы на тое, што апошнія дзесяць гадоў лічбы дзіцячага траўматызму ў цэлым і пацярпелых у ДТЗ у прыватнасці зніжаюцца, паказчыкі ўсё роўна застаюцца дастаткова высокія. У ДТЗ, якія здарыліся сёлета, ужо загінула шэсць дзяцей і 125 паранена. Сярод загінулых чацвёра былі пасажырамі аўто, адзін хлопчык — веласіпедыстам. Прычым у большасці выпадкаў за рулём знаходзіліся маці, якія не справіліся з кіраваннем. Жанчына, якая перавозіла чатырох дзяцей, выехала для абгону на сустрэчную паласу руху, зразумела, што не паспявае, і вярнулася ў сваю, зачапіўшы абочыну. У выніку машыну вынесла на сустрэчную паласу, дзе яна сутыкнулася з іншым аўтамабілем. Двое з чатырох дзяцей загінулі. Яшчэ адна маці перавозіла дзіця ў аўталюльцы, якая ніяк не была замацавана. Жанчына не справілася з кіраваннем, а дзіця таксама загінула.

Як адзначае **старшы інспектар па асобых даручэннях УДАІ МУС Ганна БАНАДЫК,** калі яшчэ 10 гадоў таму 90 % ДТЗ з удзелам дзяцей адбывалася па віне самых малых, то сёння большасць ДТЗ — па віне дарослых, бо школьнікі ў пераважнай большасці ведаюць і выконваюць правілы паводзін на дарогах. З пачатку года пацярпела 55 дзяцей, якія былі пешаходамі, і толькі 15 з іх парушылі правілы дарожнага руху. Амаль тры дзясяткі дзяцей атрымалі траўмы на пешаходных пераходах. Адметна, што пераважная большасць ішлі або на зялёны сігнал святлафора, або пераходзілі вуліцу па пераходзе, які не рэгулюецца, дзе і пацярпелі з-за няўважлівасці кіроўцаў. Сямёра дзяцей траўміравана ў дварах. Дарэчы, дзеці-кіроўцы таксама становяцца віноўнікамі і ахвярамі ДТЗ. Сёлета пацярпелі 16- і 17-гадовыя хлопцы — яны селі за руль аўтамабіляў, а таксама 14-гадовая дзяўчынка, якая вырашыла пракаціцца на мапедзе.

Каб нагадаць дарослым пра адказнасць падчас перавозкі дзяцей і ўважлівасць на дарогах, супрацоўнікі ДАІ наведаюць працоўныя калектывы, бацькоўскія сходы, выпускныя вечары. А таксама правядуць шэраг акцый. Адна з іх — «Увага, дзеці!» — закране літаральна ўсіх кіроўцаў. З 25 мая па 5 чэрвеня ўсе аўтамабілі павінны рухацца з уключаным святлом фар. За невыкананне гэтага патрабавання прадугледжана адміністрацыйная адказнасць — ад папярэджання да штрафу ў дзве базавыя велічыні. За перавозку дзяцей без аўтакрэслаў ці з непрышпіленымі рамянямі бяспекі прадугледжана яшчэ больш сур'ёзная адказнасць — штраф да чатырох базавых велічынь.

Дарэчы, летась былі праведзены маштабныя праверкі аб'ектаў дарожнай інфраструктуры побач з сярэднімі школамі і гімназіямі, а таксама музычнымі і спартыўнымі школамі. У 74 % былі выяўлены парушэнні, большая частка з якіх ужо ліквідавана. Пераважная большасць устаноў адукацыі належным чынам абсталявана дарожнымі знакамі, «ляжачымі паліцэйскімі» і нават турнікетамі, якія спыняюць выхад на праезную частку.

Падчас пажару сёлета ў краіне загінула адно дзіця. Пажар здарыўся ў лютым у Асіповіцкім раёне. Ён пачаўся ў чатыры гадзіны раніцы ад кароткага замыкання, у агні загінула ўся сям'я. Падчас пажараў і ДТЗ супрацоўнікі МНС выратавалі 14 дзяцей. Як адзначыў **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ,** бацькі павінны вызначыць для дзяцей так званы радыус бяспекі, у ім могуць знаходзіцца і дарогі, і вадаёмы, і лес. Важна расказаць школьнікам, як паводзіць сябе ў гэтых месцах. Таксама можна ўстанавіць на дзіцячы тэлефон дадатак МНС «Дапамога побач». Там пазначаны не толькі нумары тэлефонаў экстранных службаў, але і правілы паводзін з тэстамі ў больш як 50 небяспечных сітуацыях. МНС правядзе і сваю акцыю — «Канікулы без дыму і агню».

Алена КРАВЕЦ.

■ Надвор'е

Прыпячэ як у ліпені

На наступным тыдні будзе да плюс 28

У гэтыя выхадныя ўмовы надвор'я на тэрыторыі Беларусі будзе вызначаць скандынаўскі антыцыклон, які перамяшчаецца на цэнтральныя раёны Расіі. Антыцыклон сфарміраваны ў халаднаватым паветры, так што ў паўночна-ўсходніх раёнах нашай краіны па начах будзе халаднавата, але днём паветра прагрэецца. А ў пачатку наступнага тыдня ўсталюецца па-летняму цёплае надвор'е, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Сёння ўдзень тэрыторыя краіны апынецца на перыферыі антыцыклону. Па паўднёва-заходняй частцы дзяржавы пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах з навальніцамі. Раніцай месцамі чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ў другой палове дня дасягне ад плюс 20 да 26 градусаў. У суботу будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах па крайнім паўднёвым захадзе Брэсцкай і Гродзенскай абласцей пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Уначы і раніцай месцамі па краіне — слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 5 па паўночным усходзе да плюс 15 па паўднёвым захадзе краіны. Удзень паветра прагрэецца і будзе 19—26 цяпла.

Пераважна без ападкаў будзе ў нядзелю. Уначы і раніцай месцамі чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы будзе знаходзіцца ў межах ад плюс 5 па паўночным усходзе да плюс 13 па паўднёвым захадзе краіны, удзень — ад плюс 20 да плюс 26 градусаў.



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак і аўторак умовы надвор'я на тэрыторыі краіны вызначыць антыцыклон. Чакаецца малавоблачнае, без ападкаў надвор'е. Тэмпература паветра па краіне ў начныя гадзіны будзе да 7—14 цяпла, удзень складзе ад плюс 22 да плюс 28 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ

Рэспубліканскі савет Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю члена Прэзідыума Рэспубліканскага савета Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў, былога міністра ўнутраных спраў БССР, старшыні Беларускай грамадскай арганізацыі ветэранаў органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў, генерал-лейтэнанта ў адстаўцы ПІСКАРОВА Віктара Аляксеевіча і выказвае шчырыя спачуванні родным і блізкім.

Рэспубліканскі савет Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю намесніка старшыні, члена Прэзідыума Рэспубліканскага савета Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў, палкоўніка ў адстаўцы РЫЛЬКОВА Рыгора Сямёнавіча і выказвае шчырае спачуванне родным і блізкім.

Извещение
о реализации транспортных средств – спецтехника ОАО «Барановичидрев», имеющих высокий износ
1-е повторные торги по Лотам

ЛОТ № 14. Трактор МТЗ-82 АА 54-47 (БУ), инв. № 090672, год выпуска – 1984.
ЦЕНА лота: 22 500,00 рубля, без НДС.
ЛОТ № 15. Автокран КС МАЗ-5337 87-60АЕ, инв. № 028952, год выпуска – 1992.
ЦЕНА лота: 45 000,00 рубля, без НДС.
Состояться 6 июня 2018 года, в 14.00.
По адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3.
Цена Лотов №№ 14, 15 установлена ликвидационной комиссией, без НДС.
Сумма задатка:10 % от начальной цены Лотов в рублях РБ.
Получатель платежа: 225410, ОАО «Барановичидрев», г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3.
Р/с: BY68BPSB30121226161389330000; БИК BPSBBY2X в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, УНН 200299909.
Назначение платежа – задаток за участие в аукционе.
Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в аукционе. Заверенный банком платежный документ прилагается к заявлению.
Заявление на участие в аукционе направляются лицами, желающими принять участие в аукционе в срок до 14.00 01.06.2018 года организатору торгов, председателю ликвидационной комиссии Мищуку А. М. по адресу:
225320, Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3, ОАО «Барановичидрев».
Конт. тел.: 8 029 6332490 (vel); (029) 8248026 (МТС); факс (0163) 455124;
Emal: mischuk_am@mail.ru
Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.
Торги осуществляются в соответствии с постановлением СМ РБ № 16 от 08.01.2013.
Более подробно с условиями и объектами аукциона можно ознакомиться на сайтах Госкомимущества и Министерства строительства и архитектуры с 26.05.2018 года.

■ Далучайцеся

Зоаветэрынарнае спаборніцтва

ўпершыню адбудзецца сёлета ў Беларусі

Пазмагацца за званне «Найлепшай ветэрынарнай клінікі», «Найлепшай ветэрынарнай аптэкі» і «Найлепшага зоамагазіна» па выніках мінулага года змогуць дзяржаўныя і прыватныя аб'екты зоаветэрынарнага бізнесу. Мэта рэспубліканскіх конкурсаў, якія плануецца зрабіць штогадовымі, — абагульніць вопыт найлепшых прадстаўнікоў гэтай галіны, распаўсюдзіць перадавыя тэхналогіі ў лячэбнай і аптэчнай сферах, расказаць грамадству пра тых, хто карыстаецца найбольшым даверам у насельніцтва. Пераможцы і прызёры будуць вызначаны ў канцы чэрвеня.

Колькасць хатніх гадаванцаў павялічваецца, як і пералік паслуг для жывёл, аднак колькасць прафесійных ветэрынарных клінік і аптэк, асабліва ў маленькіх населеных пунктах, недастатковая. Разам з тым у гэтай сферы няма сур'ёзнай канкурэнцыі. Згодна са статыстыкай на два мільёны гадаванцаў прыходзіцца каля 50 ветэрынарных аптэк.

Арганізаваны конкурс дапаможа не толькі вызначыць найлепшых гульцоў ветэрынарнага рынку, але і больш дакладна вывучыць асартымент клінік і іх тэхнічную абсталяванасць, прааналізаваць цэнаўтварэнне паслуг у гэтай сферы, зразумець, якія спецыялісты працуюць у гэтай галіне, мяркуюць прадстаўнікі аднаго з арганізатараў спаборніцтваў кампаніі «Аўтаматызаваныя тэхналогіі турызму».

Галоўнымі суддзямі стануць прафесарска-выкладчыцкі склад Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны і іншыя аўтарытэтныя эксперты ў галіне зоаветэрынарыі.

Для ўдзелу ў спаборніцтвах трэба накіраваць у камісію конкурсную карту, узор якой можна паглядзець на сайце https://atb-belarus.by/, а таксама графікі, табліцы, інфармацыйныя, фота- і відэаматэрыялы, граматы, дыпломы, лісты падзякі. Усе звесткі неабходна збрашураваць у альбом і заверыць подпісам кіраўніка і пячаткай арганізацыі. Інфармацыя ад канкурсантаў прымаецца да 10 чэрвеня на паштовы адрас: 220007, г. Мінск, вул. Маскоўская, 6, офіс 4 або на электронную скрыню info@atb-belarus.by.

Ірына СІДАРОК

■ Трагедыя

ЕГЕР СТРЭЛІЎ ПА НЕВЫРАЗНА БАЧНАЙ ЦЭЛІ...

У Мсціслаўскім раёне падчас палявання загінуў чалавек.

Яго на дзіка і казулю ва ўгоддзях каля вёскі Басценавічы ўвечары праводзіў егер Мсціслаўскай раённай структуры «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў». Апроч самога кіраўніка палявання, у ім ўдзельнічалі яшчэ два паляўнічыя, а таксама жыхар вёскі Белы Мох. Ён і патрапіў пад выпадковы стрэл.

— Згодна з папярэдняй версіяй, вясковец быў у зарасніку маліннік, куды егер стрэліў карцечу, думаючы, што там хаваецца казуля. 41-гадовы мужчына атрымаў раненне ў галаву і сканаў на месцы, — расказалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету. — Мсціслаўскі РАУС праводзіць праверку па гэтым здарэнні. Егер прызнаў, што парушыў тэхніку бяспекі палявання — зрабіў стрэл на шум, шоргат, па невыразна бачнай цэлі, што катэгарычна забаронена Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПРЫШЧЭПКА АД ХЛУСНІ

Гэта здарылася даўным-даўно прыгожым вясновым ранкам. Па мяне, тады пяцігадовага, зайшлі такія ж сябрукі — паклікалі гуляць. І я з імі, вядома ж, пайшоў бы, з падскокам, але... Усе яны былі без шапак, а мяне з голай галавой тата не пускаў — казаў, што холадна яшчэ.

Таму з хаты я не пайшоў, а паплёўся — у шапцы.

Зараз не ўспомню, ці доўга ў ёй «парыўся», але ж збрыдзела. А таму ўбачыў, што бацька сышоў на працу, што кантролю болей няма, і шапку з той радасці не проста зняў, а яшчэ і закінуў... на дах. (Не, каб дзе блізка пакласці і потым надзець...)

Карацей, вяртаюцца бацькі дадому, а я на вуліцы — з голай галавой.

— Дзе шапка? — пытае тата.

Праўду сказаць я чамусьці не змог і замест яе выдумаў цэлую гісторыю, што мы пасварыліся з сябрам Колькам, што ён мяне пабіў, потым схапіў маю шапку і закінуў у раку. А далей — плынь падхапіла яе і панесла ў невядомыя далі.

Легенда, карацей, атрымалася цікавая, але ж галоўнае я ў ёй не ўлічыў: тата папрасіў завесці яго да той рэчкі, і я не ведаў, што ж мне рабіць.

Не, рэчка недзе была. І непаводдаль... Але ж дзе канкрэтна, я не ведаў яшчэ. Прыйшлося павесці тату, куды вочы глядзяць.

Хадзіў ён за мной досыць доўга: я ўсё спадзяваўся, што яму надакучыць... Але ж не — ён ішоў ды ішоў, аж пакуль наперадзе не з'явілася балотца, а ў ім — і нейкая ручаінка, пакуль я, чырванеючы, не прамовіў:

— Вось тут.

Тата мне ў адказ нічога не сказаў. І ўжо сам, моўчкі, нібы шукаючы шапку, павёў мяне ўздоўж ручаіны, якая з кожным крокам усё вузела і мялела, а ўрэшце і зусім «высахла». Тата паглядзеў на мяне, і я ва ўсім прызнаўся.

А ўвечары да нас прыйшоў Колька.

— Вы чаго сёння біліся? — спытаў яго тата. — І нашто было шапку тапіць?

Я спалохана маўчаў: баяўся, што Коля возьмецца нешта хлусіць, але ж ён зацягнуў «спрадвечную» песню:

— Мы болей не будзем...

— Абяцаеце? — папытаўся тата, гледзячы нам у вочы.

— Абяцаем... Пусціце нас пагуляць...

Праз нейкую хвіліну мы з Колькам былі на дварэ і, можна сказаць, на свабодзе.

...Другі выпадак адбыўся значна пазней — гадоў праз дзесяць.

Неяк вечарам і зімой (а зімы тады былі снежныя) я выйшаў на двор. Там было ціха-ціха і цёмна-цёмна, бо вуліца зусім не асвятлялася.

Па ёй, аднак, нехта ішоў: да вушэй маіх далятаў п'яны спеў: спачатку — здалёк, потым бліжэй і бліжэй, побач...

Што мяне падштурхнула, не ведаю, але я зляпіў вялікую снежку, кінуў убок «спевака» і... не прамахнуўся: снежка праляцела над дахам хаты, трапіла ў п'янага дзядулю-ўкраінца, насустрач якому ішоў наш кінамеханік Васіль.

Адкуль я пра гэта даведаўся? Ды з размовы, якая пачулася з вуліцы:

— Васыль, шо я тобі зробыў, — пытаўся дзед, — шо ты кідаешся снегом?

— Я не кідаўся, — адказваў той, — можа, нейкія дзеці?

— Здурнів ты ці шо? Ніч на вуліці... Які такі дзеці?

Я слухаў гэта і аж душыўся ад смеху! Ён проста распіраў мяне...

Каб падзяліцца, я куляй уляцеў у хату — расказаў, што адбылося...

Аднак разам са мной ніхто не засмяяўся. Наадварот:

— Заўтра зранку пойдзеш да дзеда — папросіш у яго прабачэння, — сказаў мне тата, нібы вадой халоднай абліў!

...Пацярпелы дзед жыў у маленькай хатцы на нашай вуліцы, блізка...

Як я ішоў туды, як мармытаў словы прабачэння, памятаю дрэнна. Затое добра, што дзед дараваў мне, прычым — з самай раніцы: не давялося мучыцца цэлы дзень.

Вось такія былі татавы ўрокі, свайго роду прышчэпкі — ад хлусні, ад безадказнасці за свае ўчынкі.

Яўген Шастакоў,
г. Гомель.

З ПЕРШАГА ПОЗІРКУ

Самой не верыцца: я выйшла замуж за... тры дні.

З чаго пачалося? Раскажу.

Змалку я вельмі любіла чытаць, а потым і пісаць сачыненні, была рэдактарам школьнай насценгазеты... А таму (хоць у нашай вёсцы гэта і «не ў модзе» было) пасля школы вырашыла паступаць на філалагічны факультэт універсітэта.

І вось мне амаль 22. Я і разумная, як у вёсцы кажуць, і амаль настаўніца, але ж «хлопца не маю, замуж ніхто не бярэ».

Затое — цешу сябе — бяруць на бульбу: гэта значыць, што я разам з іншымі студэнтамі і кожную восень амаль месяц працую на калгасных палетках...

У той год наш курс адправілі ў Бярэзінскі раён, у вёску Каменны Барок. Сустракала там мясцовае начальства, і сярод яго я прыкмеціла аднаго маладога чалавека. Потым, калі нас сталі «разводзіць» па кватэрах, менавіта ён узяў мой чамадан...

Але ж да хаты паднёс і паставіў: ні аб чым я больш не падумала, бо трэба было асвойвацца на новым месцы, рыхтавацца да працы, прычым не на бульбе: у «нашым» калгасе яшчэ не скончылі жаць збожжа, таму нас, чатырох дзяўчат, што жылі на адной кватэры, адправілі на ток — загадалі накідваць на транспарцёр зерне, якое з палёў прывозілі машыны.

І вось пад'язджае чарговы грузавік, з кабіны яго выходзяць двое маладых людзей (адзін з іх — той, што нёс чамадан), пачынаюць адкрываць борт.

— Дзяўчаткі, адкіньце транспарцёр, — крычыць нам начальнік зернесклада, — а то вам цяжка будзе.

Я кідаюся выконваць гэты загад, і... борт машыны (хлопцы не ўтрымалі яго) б'е мяне па спіне.

У вачах, помню, адразу пацямнела, усё паплыло, я ўпала... Але тут жа падхапілася.

Убачыўшы гэта, мясцовыя жанчыны, якія працавалі разам з намі, з палёгкай уздыхнулі і тым хлопцам сталі крычаць:

— Ну што — скалечылі дзеўку? Хто яе замуж возьме? Хіба зломак які ці гультай?

Хлопец «з чамаданам» трохі падумаў і сказаў:

— Я вазьму...

На наступны дзень на работу я не пайшла: трэба было адляжацца, бо вельмі балела спіна (потым яна счарнела, як вугаль).

А пад вечар з'явіўся «жаніх», і я даведалася, што ён з мясцовых, што заканчвае Горкаўскую сельгасакадэмію, што тут на практыцы.

Праз тры дні (а сустракаліся мы кожны) ён прапанаваў мне выйсці замуж, і я адразу ж згадзілася. Праўда, вяселле мы згулялі толькі ў маі, бо ён хацеў скончыць вучобу, а я — чарговы курс універсітэта.

...Пражылі мы з мужам 30 гадоў (і ўжо трынаццаць, як яго не стала), выгадавалі траіх дзяцей, старэйшай унучцы ўжо 18. І яна, помню, упершыню пачуўшы гэту гісторыю, вельмі здзівілася. Спытала: «Бабуля, а як гэта ты адважылася — на трэці дзень пасля знаёмства ўжо выйсці замуж?»

Што адказаць ёй, я не ведала. Проста прызналася, што з першага позірку адчула, што знайшла свайго чалавека, родную душу.

Таіса Несцяровіч,
м. Кляннік, Смалявіцкі раён.

ВАРЫЦЬ... ТРЭБА ВАРЫЦЬ...

Было гэта ў мінулым стагоддзі, у далёкім ужо 1980-м...

Наш саўгас «За мір» у перадавіках тады не хадзіў, але і ў хвасце не плёўся: моцны быў серадняк і працавалі ў ім не з-за страху (што звольняць, аштрафуюць, пакараюць), а па сумленні. Заробкі ў людзей былі добрыя, павага адчувалася. А ўжо механізатараў дык дырэктар наогул цаніў: ім і ўчасткі пад бульбу лепшыя, і сена для кароў найперш, і партрэты на дошку гонару, і сцягі на флагшток, і падарункі... Помню, з якім жа хваляваннем трактарысты ішлі па іх, падымаліся на сцэну — пад апладысменты... Як жа ганарыліся імі дзеці, жонкі...

Але ж і дысцыпліна была.

А тут неяк дзіва дзіўнае: у самую гарачую пару трактар — на прыколе, а трактарыста і не відаць, і не чуваць. «Мусіць, захварэў? — мяркуе начальства, бо не было ў Грышы звычкі спазняцца. — А можа, здарылася што?»

Карацей, механік на машыне памчаў у вёску, зайшоў да трактарыста ў хату (бо хто тады дзверы замыкаў?), пагукаў каго ў пярэднім пакоі... У адказ — цішыня, пайшоў у бок спальні — на храп... Бачыць — спіць там Грыша як пшаніцу прадаўшы! Механік давай будзіць...

Падхапіўся небарака — на гадзіннік зірк і аж вочы на лоб:

— Спазніўся?!

Схапіў з крэсла порткі, ускінуў на плечы кашулю і лёцьма ў машыну.

Едзе з механікам ды «спавядаецца»:

— Гэта ж, — расказвае, — з поля ўчора позна прывезлі — жонка ўжо спаць лягла. Пашкадаваў будзіць — выпіў кубак малака ды лёг... І натаміўся ж, як быццам, а заснуць не магу: кішкі марш іграюць! Пакруціўся з боку на бок, паляжаў. Не, думаю, праўду кажуць: «Не еўшы ляжаш, не спаўшы ўстанеш». Падняўся, пайшоў у кухню — знайшоў толькі хлеб, малако ды трохі варанай бульбы. А мне бы мяса якога...

Ці паверыш, пайшоў у хлеўчык, злавіў курыцу, засек, кіпнем апарыў, абскуб, разабраў, паставіў на газ. Яна, як на ліха, доўга варылася — мусіць, старую схапіў? Ведама, упоцемках... Але ж я дачакаўся — ад пуза пад'еў! А тады ўжо лёг дый заснуў — нават на гадзіннік не глянуў.

...За размовамі неўпрыкмет мужчыны падрулілі да мехдвара, Грыша сеў за «штурвал» свайго трактара, механік «далажыў» дырэктару прычыну спазнення.

І ўжо разам, падумаўшы, яны вырашылі нікому і нічога пра яе не казаць (бо мужыкам жа толькі зачэпку дай, — да скону будуць зубы скаліць), гэта па-першае. А па-другое — у поле рабочым прывозіць не толькі абеды, але і падвячоркі.

...На жаль, сусед мой (гэта ён быў механікам) на падмацунак разлічваць не мог, а таму час ад часу жонцы казаў: «Тася, вары мне вячэру... Калі хочаш, каб куры жылі».

Л. М. Чыгрынава,
г. Мінск.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Ад яе ж напамін — новым падпісчыкам альбо тым, хто забыўся, што «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі» на старонках «Звязды» не проста друкуюцца, — усе яны ўдзельнічаюць у конкурсе на найлепшую...

Вынікі яго вялікае чытацкае журы разам з маленькім рэдакцыйным падвядзе ў канцы года, а пакуль...

■ Неасабісты суб'ектыў

ПРАВІЛЫ НАЦІСКУ

Як не страціць аўтэнтычнасць у тапонімах

УЧОРА ў рэдакцыі сутыкнуліся з цікавым філалагічным выпадкам. Ставілі на першую старонку фота бортніка з Лельчыцкага раёна, а подпіс да яго ў арыгінале быў толькі па-руску. Дык з назвай аграгарадка «Милошевичи» намучыліся. Па-руску як ні вымаўляй, напісана ўсё роўна будзе аднолькава. А вось мова наша да націскаў больш адчувальная, яе пісьмовы варыянт у многім менавіта ад іх залежыць. Вось і мы ўчора думалі-гадалі, як правільна напісаць — Міло́шавічы ці Мілашэ́вічы, каб жыхароў таго паселішча не пакрыўдзіць. Добра, што згадалі пра даведнік «Назвы населеных пунктаў Беларусі», які ў стыльрэдактараў на паліцы стаіць. Зазірнулі ў том, прысвечаны Гомельскай вобласці, — і на табе! — трэці варыянт, пра які нават не падумалі, — Мі́лашавічы. Такія вось сюрпрызы нацыянальнай тапанімікі.

Гэты выпадак, калі былі сумненні, знайшлася дакладная крыніца і памылкі ўдалося пазбегнуць, — адначасова і тыповы, і хутчэй выключэнне, чым правіла. Выключэнне — гэта пра дакладную крыніцу і пра недапушчаную памылку. Бо, едучы ад вёскі да вёскі, гледзячы на шыльды-паказальнікі, напісаныя па-беларуску, з сумам канстатуеш, што Баркі́ сталі Бо́ркамі, Мянькі́ — Ме́нькамі, Янко́ўцы — Я́нкаўцамі, Хі́марады — Хімаро́дамі... І здагадваюцца пра назвы-пярэваратні, бо дакладна ведаюць правільны варыянт, толькі тыя, для каго наваколле гэтых вёсак — тая самая малая радзіма, пра якую сёлета гаворым так часта і так шмат. Яны вымаўляюць родныя назвы з цеплынёй і любоўю, але з цягам часу носьбіты аўтэнтычных тапонімаў пойдуць у нябыт, а напісанае — на шыльдах, у папяровых ці электронных дакументах — застанецца надоўга і пакрысе стане адзінай крыніцай інфармацыі нават для новых насельнікаў тых вёсак. І назвы, перакручаныя на новы лад толькі таму, што калісьці той, хто іх пісаў, не ведаў, на які склад ставіць націск, заменяць спрадвечныя, якія адлюстроўвалі асаблівасці і самой мясцовасці, і мясцовай гаворкі.

За гэта вельмі хвалявалася светлай памяці Валянціна Пятроўна Лемцюгова, якая дзесяцігоддзі стаяла на варце айчыннай, менавіта беларускамоўнай, тапанімікі. У многім дзякуючы яе клопату і карпатлівай працы і з'явіўся на свет ужо згаданы даведнік. Гэты шасцітомнік — сапраўдная знаходка для ўсіх, хто мае дачыненне да тапонімаў, асабліва ў плане іх правільнага напісання. Кожнай вобласці прысвечаная асобная кніга, там усё распісана па раёнах і нават па сельсаветах. Прычым даецца і беларускі варыянт з правільнымі націскамі, і рускі, і напісанне лацінкай. Нават страчаныя назвы — вёсак, якія зніклі з твару зямлі, — па кожным раёне сабраныя і зафіксаваныя. Атрымліваецца, справа па ўдакладненні правільнага напісання родных назваў роднай зямлі на роднай мове паспяхова зробленая?

Але ж чаму тады паўсюль трапляюцца надпісы-калекі — як іх ніхто ў тых мясцінах не вымаўляе? Таму што крыніцамі іх нярэдка служаць менавіта рускамоўныя дакументы. Другая дзяржаўная — мова хоць і адной групы з беларускай, але са сваімі адметнымі правіламі, у якіх пры напісанні той жа націск не ўлічваецца зусім. А па-беларуску можа быць і два, і нават тры (як у прыкладзе з Мілашавічамі) варыянты — і любы можа аказацца правільным! Але ці ведаюць, які менавіта, тыя, хто шыльды і паказальнікі піша? Падазраю, што пра існаванне даведніка, які можа гэта падказаць (і які, дарэчы, ужо ёсць у электронным варыянце), многія нават не здагадваюцца...

Здаецца, цікавая ідэя акрэсліваецца акурат у кантэксце Года малой радзімы. Паклапаціцца менавіта пра захаванне ў правільным, спрадвечным выглядзе мясцовых тапонімаў. Праверыць шыльды, паказальнікі, надпісы на транспарце. Задача няпростая? Не такая і складаная, калі ёй зоймуцца ў кожным асобна ўзятым сельсавеце, асобна ўзятай школе, дзе ламаюць галаву, чым жа такім цікавым і карысным заняць вучняў у летнім лагеры.

Дарэчы, пра цікавае і карыснае для школьнікаў. Ёсць яшчэ адна цікавая ідэя, таксама з тапанімікай звязаная. Яна прыйшла па пошце ад нашай сталай чытачкі Яўгеніі Кулевіч з вёскі Сялец Смаргонскага раёна. «У нас нават маленькага лапіка зямлі безназоўнага няма, — піша Яўгенія Барысаўна. — Вакол нашага Сяльца гляньце, якія прыгожыя назвы мясцінак: Грэбля, Бабішча, Забрады, Смыкава, Іерусалім, Маслаўшчына (гэта вялікі луг, паша і сенакос. Сапраўды, масла адсюль). Але ў вёсцы сёння няма ні адной кароўкі, дый жыхароў зусім няшмат. Вёска не пустая, тут цяпер у многіх лецішчы. Хаты абнавіліся, дагледжаныя, а вось назвы мясцінак забываюцца, іх новыя гаспадары ўжо так не называюць...» Сапраўды, назвы пералескаў, урочышчаў, паплавоў — бадай, самы незвычайны і стракаты пласт нашай лакальнай тапанімікі, але і самы ўразлівы, бо фактычна гэтыя назвы нідзе не зафіксаваныя пісьмова. Чаму б менавіта ў Год малой радзімы не ўзяцца за гэта на месцах, каб захаваць тое, што маем і яшчэ не паспелі страціць, прапануе наша чытачка.

Каму гэта патрэбна? Думаю, нам усім. Бо не будзе дробязяў — не будзе і вялікай Радзімы, з якіх яна складаецца. А хто мы будзем без яе?

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Мозырьагропромснаб» (продавец) извещает о проведении 11 июня 2018 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
1	**Капитальное строение с инв. № 330/С-25115**, назначение – сооружение специализированное транспорта, наименование – **стоянка (инв. № 217), общей площадью 0,0 кв. м,** 2000 г. п. **Составные части:** площадка асфальтобетонная площадью **2 986,0 кв. м**, газон травяной площадью **2 376,0 кв. м**, дорожка бетонная площадью **11,2 м**, ограждение ж/б протяженностью **160,9 м**, ограждение металлическое протяженностью **124,3 м**, туалет площадью **2,5 кв. м**, эстакада, материал – металл. Информация о земельном участке: кадастровый номер **323500000001000006** общей площадью **0,5389 га (право аренды).** Местонахождение: **Гомельская область, Мозырский р-н, Р-31, 161-й км**	**47 550,00**	4 755,00

Продавец: ОАО «Мозырьагропромснаб», Гомельская область, Мозырский район, д. Козенки, ул. Спортивная 77А. Контактный тел. 8 (0236) 23-25-26, Древило Оксана Михайловна. **Шаг аукционных торгов – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Мозырьагропромснаб»):** р/с BY28 SLAN 3012 1124 3001 9000 0000 в ЗАО «Банк ВТБ» г. Минск, РД № 100 г. Мозырь, код банка SLANBY22, УНП 490803594, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1. **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 25 мая 2018 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00; **прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 7 июня 2018 г. в 16.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.**

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **15 (пятнадцати) рабочих дней** и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 18.04.2018 г. **Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62. Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, размещены на сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы»**

ОАО «Минскэнергострой» (г. Минск, ул. Монтажников, 39) проводит внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Минскэнергострой» в очной форме 5 июня 2018 года в 11.00. Место проведения собрания: ОАО «Минскэнергострой», г. Минск, ул. Монтажников, 39 к. 208.

Повестка дня собрания:

1. О сделках общества.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться в день проведения собрания с 10.00 до 10.45 по адресу: ОАО «Минскэнергострой», г. Минск, ул. Монтажников, 39 к. 208.

Участники собрания должны иметь при себе документ, удостоверяющий личность (представители акционера – документ, удостоверяющий личность, и доверенность).

Дата составления списка владельцев ценных бумаг для регистрации участников собрания по состоянию реестра акционеров на 28.05.2018 г.

Время и место ознакомления лиц, имеющих право на участие в собрании, с материалами по вопросам повестки дня общего собрания: с 9.00 до 9.30, в рабочие дни с 30.05.2018 г. по 05.06.2018 г. по адресу: ОАО «Минскэнергострой», г. Минск, ул. Монтажников, 39, к. 208.

УНП 100008291

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 412/С-26444 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание стеклоприемного пункта), площадью 276,0 кв. м, расположенное по адресу г. Мосты, ул. Песочная, 13А

Лот № 1 расположен на земельных участках, кадастровый номер 424050100014000195 (назначение – для обслуживания здания стеклоприемного пункта), площадью 0,1440 га, расположенный по адресу: г. Мосты, ул. Песочная, 13А, и кадастровый номер 424050100014000194 (назначение – для обслуживания здания стеклоприемного пункта), площадью 0,0073 га, расположенный по адресу: г. Мосты, ул. Песочная, 13А

Начальная цена продажи – 50 000 руб. (пятьдесят тысяч рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 5 000 руб. (пять тысяч рублей)

Продавец – Мостовский филиал Гроднооблпотребобщества, 231600, г. Мосты, ул. 30 лет ВЛКСМ, 1, тел./факс 8-01515-325-22

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия аукциона – возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта.

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 26 июня 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя, и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 21 июня 2018 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by

В суд Советского района г. Гомеля поступило заявление о признании безвестно отсутствующим Бикетова Олега Ивановича, 11.12.1959 года рождения. Последнее известное место пребывания: г. Гомель, проспект Речицкий, д. 29, кв. 57. Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о Бикетове О. И., сообщить их суду Советского района г. Гомеля по адресу: г. Гомель, Речицкое шоссе, 45, канцелярия суда или по тел. 294489. Сведения принимаются в течение двух месяцев со дня опубликования объявления.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	Копыльское районное потребительское общество, г. Копыль, пл. Ленина, 21

Предмет аукциона

Наименование	Общ. пл.	Инв. номер	Адрес
Магазин «Комиссионные товары»	118,5 кв. м	642/С-11409	Минская обл., Копыльский р-н, г. Копыль, ул. Тимковичская, д. 22

Сведения о земельном участке: пл. **0,0530 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для размещения объектов розничной торговли

Начальная цена с НДС 20 % – 39 600,00 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30** (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Аукцион состоится 29.06.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 27.06.2018** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. www.cpo.by**. Email: auction@cpo.by**

Утерян Сертификат Централизованного Тестирования по биологии 2017 года на имя **Лепеши Евгении Зеноновны**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении повторных торгов в виде открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Агросервис»

Лот № 1. **Капитальное строение с инв. № 700/С-90254 – компрессорная,** площадью 11,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, пер. Урожайный, 1Б/1.

Начальная цена продажи – 10 829,80 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка – 1 082,98 бел. руб.

Лот № 2. **Капитальное строение с инв. № 700/С-100457 – здание склада № 1,** площадью 22,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, пер. Урожайный, 1В/1. **Капитальное строение с инв. № 700/С-100458 – здание склада № 2,** площадью 32,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, пер. Урожайный, 1/4. **Капитальное строение с инв. № 700/С-100456 – здание гаража,** площадью 40,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, пер. Урожайный, 1/2. **Капитальное строение с инв. № 700/С-87173 – мощение,** площадью 7071 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, пер. Урожайный, мощение территории пер. Урожайный, 1В.

Начальная цена продажи – 20 652,17 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка – 2 065,22 бел. руб.

Продавец	ОАО «Агросервис», УНП 700010487, г. Могилев, ш. Славгородское, 44а
Расчетный счет для перечисления задатка	Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, МФО BIC банка BPSBBY2X
Дата, время и место проведения аукциона	**Аукцион проводится 6 июня 2018 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 5 июня 2018 года до 15.00
Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества	Победитель аукциона обязан в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи. Оплата производится на условиях заключенного договора купли-продажи
Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 25.01.2018, 10.03.18 и 11.04.18	

Участник, выигравший торги, уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона, в соответствии со счетом-фактурой, которые подлежат уплате в течение 3 рабочих дней после проведения аукциона.

Дополнительную информацию можно получить по тел.: (8 0222) 72-41-14, 8 029 624-26-25, 8 044 738-18-99

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Белсвязьстрой» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **одним лотом имущества производственной базы, расположенной на земельных участках с кадастровым номером 623683400001000160 по адресу: Минская область, Минский район, Колодищанский с/с, 86, район а. г. Колодищи, площадью 0,9012 га и кадастровым номером 623683403101007618 по адресу: Минская область, Минский район, Колодищанский с/с, аг. Колодищи, ул. Промышленная, 24, площадью 0,1816 га в составе:**

капитальных строений:

1. незавершенное законсервированное здание склада с инвентарным номером 600/U-91473 площадью 331,4 кв. м;
2. здание сезонных авторемонтных мастерских с инвентарным номером 600/С-154909 площадью 1130,3 кв. м;
3. внутриплощадочные сети ливневой канализации протяженностью 150,1 м с инвентарным номером 600/С-154853;
4. резервуар противопожарный с сетью противопожарного водопровода с инвентарным номером 600/С-154854;
5. административно-хозяйственное здание (административно-бытовой корпус со складскими и вспомогательными помещениями) с инвентарным номером 600/С-91465, площадью 882,6 кв. м;

основных средств (машин и оборудования, производственного и хозяйственного инвентаря):

№ п/п	Наименование объекта	Инв. № по бухгалтерскому учету	Дата ввода в эксплуатацию
1	Автоматическая пожарная сигнализация в пос. Колодищи по ул. Промышленной, 24	1868	01.02.08
2	Автоподъемник 4-стоечный ОМА-528	1854	01.11.07
3	Автоподъемник гидравлический AMI-3	1855	01.11.07
4	АСКУЭ – автоматическая система контроля и учета электроэнергии	1976	30.04.11
5	Безинерционный водонагреватель ОКС 500	1859	01.02.08
6	Благоустройство территории прилег. к АБК п. Колодищи	1916	01.01.09
7	Временная ремонтная мастерская 10х6 м	2124	27.10.17
8	Кран мостовой электрический подвесной однобалочный	1848	01.09.07
9	Оборудование к пожарной автоматической сигнализации в пос. Колодищи	1869	01.02.08
10	Ограждение производственной базы п. Колодищи	2022	31.08.12
11	Подстанция трансформаторная МТП-250	1974	31.03.11
12	Подъемник платформенный ПП-10	1850	01.03.08
13	Система очистки и фильтрации воды в бассейне	2062	31.10.14
14	Станок 3-Е642 заточной	1376	01.12.90
15	Станок вертикально-сверлильный 2Н135	340	01.06.69
16	Станок горизонтально-сверлильный	1820	01.01.07
17	Станок радиально-сверлильный 2А-55	1392	01.12.91
18	Станок токарно-винторезный 1А-616	1394	01.12.91
19	Станок токарный Е35	816	01.04.76
20	Станок универсально-фрезерный- 675	1393	01.12.91
21	Станок фрезерный 675	1390	01.12.91
22	Тельфер электрический 2Т	1372	01.12.90
23	Тельфер электрический 0,5Т	40	01.12.74
24	Установка тепловая УТ-15	1842	01.12.07
25	Установка тепловая УТ-15	1843	01.12.07
26	Установка УТ20	2008	03.02.12
27	Туалет деревянный (1,34х3)	2125	27.10.17
28	Ворота распашные ВРС 4100-4200	1861	01.02.08
29	Ворота распашные ВРС 4100-4200	1862	01.02.08
30	Ворота секционные промышленные СВП ш 5600 мм в. 4000 мм с калиткой	1852	01.09.07
31	Ворота секционные промышленные СВП-1 Ш.5400 мм, В.4000 мм с калиткой 3 окна	1851	01.09.07
32	Ворота секционные промышленные СВП-1 2320-2900 в комплекте	1863	01.02.08
33	Ворота секционные промышленные СВП-1 4100х4200 мм с калиткой и 3 окна	1856	01.03.08
34	Ворота секционные СВП-1 3075х3000 мм в к-те	1864	01.03.08
35	Печь HARVIA K-15	1874	01.05.08
36	Телефонизация произв. базы п. Колодищи	1924	01.08.09
37	Вагон-бытовка УКМС	49В	01.08.80
38	Диспетчерский пункт внутр. разм. 8х3 м	1982	29.08.11
39	Очистные сооружения (водоочистительная установка для очистки поверхностных (ливневых дождевых) ст. вод	1145	26.10.16
40	Пристройка	1150-Б	26.10.16
41	Проезды и покрытия	1150-В	26.10.16
42	Площадка открытая для хранения кабельной продукции	2057	31.05.14
43	Автоматическая пожарная сигнализация и система оповещения о пожаре. Авторемонтные мастерские	1148	31.12.15
44	Система хозяйственно-бытовой канализации, и водопровода произв. базы в п. Колодищи, ул. Промышленная, 24	2053	30.01.14
45	Система электроснабж. произв. базы фил. № 1 ОАО «БС» в п. Колодищи, ул. Промышленная, 24А вн. элект.	992	31.12.12
46	Водонагреватель THERMEX ER 80 Y	2012	28.03.12
47	Станок СР-6-9 рейсмусовый	1353	01.06.90
48	Станок фрезерный ФСШ-1А	1352	01.06.90

МБП

№ п/п	Наименование материала, марка, размер	Код материала	Ед. изм.	Количество
1	Контейнер 0,75 куб. м с крышкой	5204179	шт.	5
2	Контейнер 0,75 куб. м с крышкой на колесах	5204180	шт.	2
3	Контейнер для сбора ПЭТ сетчатый	5204181	шт.	1
4	Урна металлическая, 25 л	5207111	шт.	3
5	Контрольный груз	4000749	шт.	3

(далее – Объект).

Начальная цена с НДС (20 %) – 2 401 452,00 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены (240 145,00 бел. руб.).

Задатки перечисляются на р/с BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 2 (двух) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **04.07.2018** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.06.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

НОВАБУДОЎЛІ: БЮДЖЭТНЫХ ПРАПАНОЎ АМАЛЬ НЕ ЗАСТАЛОСЯ

Але на другасным рынку «хапун» на нерухомасць хутка скончыцца, лічаць эксперты

Вось ужо амаль год, як на сталічным рынку новабудоўляў назіраецца высокая актыўнасць спажыўцоў жылля. Зніжэнне ставак крэдытавання адкрыла для іх недаступныя раней фінансавыя магчымасці, а дзякуючы спецыяльным праграмам фінансавання ўсё больш пакупнікоў выбіралі кватэру ў новабудоўлі, а не на другасным рынку. Аднак усё гэта стымулявала і рост цэн. Сумесна з экспертамі мы пастараліся разабрацца, ці засталіся яшчэ ў сталіцы прапановы новабудоўляў па цане квадрата ніжэй за 2000 рублёў.

Даражэюць не ўсе кватэры

За першыя чатыры месяцы года ўзровень цэн на новабудоўлі Мінска ў сярэднім вырас на 6 %. А ў параўнанні з красавіком мінулага года — амаль на 8 %. Але сказаць, што ўсе новабудоўлі падаражэлі аднолькава — нельга, лічыць кіраўнік аддзела агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Наталля Жалава. Напрыклад, па класе «Прэстыж» (самы якасны і дарагі з прадстаўленых цяпер на рынку) сярэдні ўзровень цэн паказвае нават невялікую адмоўную дынаміку. У той жа час па першым класе якасці — «Эканом» — кошты выраслі ў бягучым годзе на 9 %, а за апошнія 12 месяцаў — на 13 %.

— Паняцце сярэдняй цаны ў адносінах да новабудоўляў вельмі ўмоўнае, паколькі на яе ў той ці іншы перыяд часу можа ўплываць досыць шмат фактараў, — расказвае спецыяліст. — Напрыклад, для любога дома, акрамя непасрэдна класа якасці, вялікае значэнне мае стадыя будаўнічай гатоўнасці. Клас якасці вызначае стартавы ўзровень коштаў, а стадыя будаўнічай гатоўнасці паступова яе павялічвае: чым вышэйшая гатоўнасць дома, тым большая цана.

На багатае жыллё попыт мінімальны

У сітуацыі інтэнсіўнага попыту павялічваць цану квадратнага метра ў новабудоўлях можа і невялікая плошча кватэры, і прадуманая планіроўка, і маляўнічы пейзаж за акном, і нават паверх — чым вышэй, тым даражэй. Акрамя таго, часцяком цэны павялічваюцца і на асобныя найбольш папулярныя сярод пакупнікоў кватэры. Як правіла, гэта невялікія па плошчы адна-трохпакаёвыя кватэры. У той час як прасторныя пентхаусы на апошніх паверхах, якія цяпер сустракаюцца ўжо не толькі ў класах «Камфорт» і «Прэстыж», але і ў «Стандарт» таксама, часцяком прадаюцца са зніжкай ад першапачатковага кошту. Попыт на падобныя кватэры да гэтага часу мінімальны.

Паводле звестак партала ProMetr.by, найбольшы роскід цэн адзначаецца ў класе «Прэстыж». Менавіта ў гэтым класе якасці значэнне кожнага з фактараў — месцазнаходжання, акружэння, вышыні паверху, выгляду з акна і інш. — узмацняецца. Напрыклад, у межах аднаго жылога комплексу, пры аднолькавай будаўнічай гатоўнасці дамоў і колькасці пакояў у кватэры, кошт «квадрата» можа адрозніваць на 200—400 рублёў.

— Кватэры класа «Прэстыж» не разлічаны на масавы попыт, — тлумачыць Наталля. — Нават нягледзячы на больш танныя крэдыты, толькі нешматлікія ахвотныя змогуць асіліць куплю кватэры без аздаблення, плошчай больш за 100 квадратных метраў па цане 3000 рублёў за квадратны метр. Для іх патрэбен асаблівы пакупнік. Для падобных спажыўцоў мае першараднае значэнне аднастайны сацыяльны склад жыхароў, малапавярховая забудова, ізаляванасць дваровай тэрыторыі, свабодныя планіроўкі і маляўнічыя краявіды з вокнаў, і яны гатовы за гэта плаціць.

Топ-3 прапаноў да 2000 рублёў за «квадрат»

Згодна з інфармацыяй даведніка па новабудоўлях, выбар кватэр з коштам квадратнага метра ніжэй за 2000 рублёў ёсць, але ў абсалютнай большасці сваёй ён сканцэнтраваны ў прыгарадзе Мінска. У самой жа сталіцы выбар вельмі сціплы.

Напрыклад, у жылым доме з маляўнічай назвай «Хваля» ёсць выбар з 90 метровых кватэр свабоднай планіроўкі. Цана квадратнага метра ў раёне 1900 рублёў. Цана за «квадрат» кватэр з меншым метражом будзе значна вышэйшая.

Ці, напрыклад, каркасна-блочны дом у раёне вуліц Алешава — Усходняй. У пачатку мая былі даступныя некалькі кватэр па цане каля 1920 рублёў за квадратны метр. Аднак ёсць адно «але»: пры куплі кватэры ў абавязковым парадку неабходна набыць яшчэ і машына-месца ў паркінгу. За кошт гэтага цана любой кватэры павялічваецца больш чым на 31 тысячу рублёў.

Замыкаюць тройку даступных па цане квадратнага метра сталічных прапаноў жылыя дамы па вуліцы Карвата. Цэны на трохпакаёвыя кватэры пачынаюцца ад 1860 рублёў, а на двухпакаёвыя — ад 1960 рублёў за «квадрат». Спецыялісты call-цэнтра даведніка адзначаюць, што патэнцыйныя пакупнікі часта цікавяцца кватэрамі з найменшымі плошчамі, у той час як па факце аднапакаёвыя маюць плошчу 45 квадратных метраў, двухпакаёвыя — 61 і трохпакаёвыя — 78.

Прыгарад — больш за тысячу

Калі паглядзець на прыгарад Мінска, то цэны тут істотна ніжэйшыя, а некаторыя прапановы вельмі блізкія да запаветнай для многіх пакупнікоў лічбы ў 1000 рублёў за квадратны метр. Напрыклад, па цане 1155 рублёў за метр можна пазначыць адна- ці двухпакаёвую кватэру ў новабудоўлі ў Смалявічах. Сёлета плошчы аднапакаёвых кватэр — ад 39 да 49 квадратных метраў, двухпакаёвых — ад 62 да 68 «квадратаў». Мінімальная па кошце «аднапакаёўка» абыдзецца ў зусім невялікую па мінскіх мерках суму — крыху больш за 44 тысячы рублёў, а двухпакаёвая — каля 70 тысяч.

Найбліжэйшая па цане прапанова яшчэ ёсць у новым жылым комплексе, што будуецца ў Дзяржынску. Квадратны метр у трохпакаёвай кватэры абыдзецца ў 1260 рублёў, у двухпакаёвай — ад 1280 рублёў і ў аднапакаёвай — ад 1380 рублёў.

Таксама ў тройку рэйтынгу найбольш даступных новабудоўляў прыгарада трапляе жылы комплекс у аграгарадку Азярыцкая Слабада, што за 15 кіламетраў ад МКАД. Нягледзячы на тое, што апошняя секцыя яшчэ не дабудаваная, кватэр ужо засталося зусім няшмат. Прычына высокага попыту ў невялікіх плошчах кватэр (аднапакаёвыя 38—42 квадратных метраў, двухпакаёвыя 56—61 «квадратаў») і коштах ад 1640 рублёў за метр.

— Пакупнікам кватэры ў новабудоўлі не варта асабліва арыентавацца на сярэднія цэны па Мінску, — тлумачыць Наталля Жалава, — паколькі нават у рамках аднаго класа якасці разбежка мінімальных і максімальных цэн можа дасягаць 40 %. Напрыклад, у цяперашні час па класе «Эканом» цэны вар'іруюцца ад 1900 рублёў да 2400 рублёў за квадратны метр. А па астатніх класах якасці шкала цэн яшчэ даўжэйшая.

Важна іншае: у той ці іншы перыяд часу забудоўшчыкі могуць праводзіць разнастайныя акцыі або прапаноўваць спецумовы на асобныя кватэры. Падобныя варыянты могуць быць вельмі цікавыя. Адзіная складанасць у тым, каб своечасова пра іх даведацца і быць гатовым у самыя кароткія тэрміны абдумаць.

Другасны рынак прытармажвае?

Сярэдняя цана сталічных кватэр у рэальных здзелках куплі-продажу выросла ў красавіку на 2,2 % і склала 2530 рублёў за квадратны метр: за чатыры месяцы «квадрат» падаражэў у сярэднім на 200 рублёў. Але спецыялісты кажуць: «хапун» хутка скончыцца.

Справа ў тым, што ўсё ў свеце цыклічна. Цяпер эксперты адзначаюць: патэнцыял росту цэн як на новабудоўлі, так і на кватэры другаснага рынку вычарпаны. Попыт зменшыўся, а прапанова расце.

Што датычыцца кватэр другаснага рынку, то за студзень-красавік бягучага года кватэры стандартных спажывецкіх якасцяў падаражэлі ў сярэднім на 9 %, або прыкладна плюс 200 рублёў на 1 квадратны метр. Гэта значыць, за сённяшні кошт кватэры яшчэ ў канцы 2017-га можна было не толькі купіць кватэру, але яшчэ і зрабіць у ёй касметычны рамонт. Больш за ўсё падаражэлі аднапакаёвыя кватэры: за 2018 год на плюс 220 рублёў за «квадрат», а за апошнія 12 месяцаў — на плюс 380 рублёў за метр. Гэта значыць, сярэднестатыстычная «аднапакаёўка» плошчай 35 квадратных метраў за апошні год выросла ў цане прыкладна на 12 тысяч рублёў — з 78 тысяч да 90 тысяч рублёў.

Як зніжаюцца цана і попыт?

У залежнасці ад тыпу дома, у якім размяшчаецца кватэра, цэнавая сітуацыя і пакупніцкі попыт розныя.

Попыт на кватэры **ў дамах хрушчоўска-брэжнеўскага перыяду** за апошнія два месяцы знізіўся на фоне агульнага зніжэння попыту, у выніку чаго колькасць прапаноў на продаж кватэр пачала павялічвацца. Аднак такое зніжэнне попыту меншае, чым па іншых тыпах дамоў. Тэмпы росту цэн зніжаюцца, складваецца тэндэнцыя да плаўнай стабілізацыі цэн. Найбольш запатрабаваныя сярод хрушчовак адна- двухпакаёвыя кватэры.

Стандартныя дамы (1971—1999 год пабудовы). Менавіта ў гэтым сегменце найбольшы выбар кватэр рознай якасці. Дзякуючы шырокаму выбару, цэны здзелак хутчэй за ўсё стабілізаваліся менавіта ў гэтым сегменце. З прычыны даступнасці цэн на кватэры гэтага тыпу попыт на гэтыя кватэры працягвае заставацца стабільны, што і ўтрымлівае рост аб'ёму прапановы.

Сучасныя дамы (з 2000 года пабудовы). Адчувальны рост цэн захаваўся толькі ў сегменце сучасных дамоў, па-за залежнасці ад матэрыялу сцен. У асноўным гэта абумоўлена тым, што для большасці пакупнікоў кватэры менавіта гэтай групы найбольш жаданыя для набыцця. Аднак досыць высокі ўзровень цэн не для ўсіх пад'ёмны. У выніку — змяншэнне попыту, тэмп росту цэн пачаў зніжацца.

Што будзе з цэнамі заўтра?

Аналітыкі лічаць, што аб'ектыўных перадумоў да яшчэ большага патаннення крэдытаў няма. А менавіта яны выступалі асноўным драйверам росту фінансава-забяспечанага попыту, а разам з ім і коштаў. Альтэрнатывай крэдытаў маглі б выступіць вялікія зарплаты, але...

Ужо цяпер адкладзены пакупніцкі попыт, які да гэтага назапашваўся гадамі, паступова сыходзіць на нішто: у сітуацыі адсутнасці заўважнага росту заробкаў колькасць пакупнікоў, якім пад сілу ўзяць крэдыт, з кожным месяцам становіцца ўсё меншай.

Да таго ж у маі ўведзеныя каэфіцыенты пазыковай нагрузкі для крэдытаатрымальнікаў, што пагоршыла даступнасць крэдытных рэсурсаў.

Зніжаецца каэфіцыент пакупніцкай актыўнасці. Цяпер прапанова вырасла больш чым на 15%, а ахвотных набыць жыллё стала менш на траціну. З факультатыўных фактараў уплыву на попыт можна назваць і зусім блізкі сезон адпачынкаў. А гэты час называюць яшчэ мёртвым сезонам. Чакаем.

МЯНЯЕМ «ПАПЕРКІ» НА АКЦЫІ

Сёлета больш актыўна прыватызуюць будаўнічую галіну

Цяпер жыхары горада Мінска могуць абмяняць імянныя прыватызацыйныя чэкі (ІПЧ) «Маёмасць» на акцыі 22 прадпрыемстваў. У аддзяленнях Беларусбанка, дзе робіцца абмен акцый адкрытых акцыянерных таварыстваў на чэкі, для гэтага адкрыты спецыяльны чэкавы рахунак, паведамілі ў Мінскім гарадскім тэрытарыяльным фондзе дзяржмаёмасці.

Дарэчы, шэсць з 22 акцыянерных таварыстваў — гэта прадпрыемствы з доляй уласнасці Мінска, удакладнілі спецыялісты. Пералік гэтых акцыянерных таварыстваў размешчаны на сайце Мінскага гарвыканкама ў рубрыцы «Гэта актуальна».

Найбольшую цікавасць мінчане праяўляюць да акцый МАПІДа, Мінскага вагонарамонтнага завода, гастранома «Бляск», а таксама Заводскага райхарчгандля, адзначылі ў Беларусбанку.

Як растлумачылі ў аддзеле арганізацыі ўладальніцкага нагляду і распараджэння акцыямі фонду «Мінскгармаёмасць», для абмену чэкаў на акцыі трэба прадставіць сертыфікат чэкаў «Маёмасць» і пашпарт.

Больш актыўны абмен чэкаў на акцыі назіраецца і ў Гомельскім рэгіёне. Там з 21 мая на абмен прапанаваны акцыі 11 прадпрыемстваў будаўнічага комплексу Гомельшчыны і аднаго гандлёвага — «ОРС Гомель»

Цяпер грамадзяне могуць абмяняць акцыі прапанаваных таварыстваў на ІПЧ «Маёмасць» 1:1, за выключэннем ААТ «Гомельбудматэрыялы», адна акцыя якога абменьваецца на два чэкі. Укласці можна чэкі асабіста налічаныя — без абмежавання, а таксама перааформленыя ад блізкіх сваякоў (бацькоў, дзяцей, мужа або жонкі, родных братоў і сясцёр, унукаў, бабуль, дзядуль, свекрыві, свёкра, цесця і цешчы) — але не больш за 250 чэкаў. Азнаёміцца з вынікамі фінансава-гаспадарчай дзейнасці таварыстваў можна на Адзіным партале фінансавага рынку. Звяртаем увагу, што тэрмін абарачэння чэкаў завяршаецца 30 чэрвеня 2019 года.

Матэрыялы падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.

СКАНВОРД



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Аэрадром. Бык. Арда. Руно. Туш. Талер. Лона. Ага. Брута. Рып. Рана. Аўран. Амар. Мімоза. Рай. Верш. Асалода. **Па вертыкалі:** Лібералізм. Аркан. Рэйд. Мурашка. Рота. Адлер. Трата. Напалм. Ганна. Бяроза. Урна. Размова. Рыкша. Орша. Айва.

Склаў Юрый ФАЛІНСКІ, *г. Мінск.*

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.52	21.21	16.29
Віцебск —	4.35	21.18	16.43
Магілёў —	4.42	21.12	16.30
Гомель —	4.47	21.00	16.13
Гродна —	5.09	21.35	16.26
Брэст —	5.18	21.28	16.10

Месяц

Першая квадра 22 мая. Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Германа, Дзяніса, Пятра.*
К. *Віялеты, Магды, Барыса, Лявона, Рыгора, Урбана.*

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

25 МАЯ

У краіне

1933 год — нарадзіўся (в. Хвоева, цяпер у Нясвіжскім раёне) Рамуальд Іосіфавіч Клім, беларускі спартсмен (лёгкая атлетыка, кіданне молата), заслужаны майстар спорту СССР, заслужаны дзеяч фізічнай культуры Беларусі. Чэмпіён (1964) і сярэбраны прызёр (1968) Алімпійскіх гульняў. Неаднаразовы прызёр чэмпіянатаў Еўропы, уладальнік Кубкаў Еўропы. Памёр у 2011 годзе.

1933 год — у Мінску на базе Беларускай студыі оперы і балета заснаваны Беларускі дзяржаўны тэатр оперы і балета (цяпер — Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь).

1938 год — нарадзіўся (в. Закружка Мінскага раёна) Уладзімір Іванавіч Карызна, беларускі паэт, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. Працаваў на Беларускім радыё, у часопісах «Полымя», «Крыніца», выдавецтве «Юнацтва». Аўтар паэтычных зборнікаў «Край мой сінявокі», «Жураўліны досвітак», «Шумяць вербы...» і іншых, кніг для дзяцей. Больш як 200 яго вершаў пакладзены на музыку беларускімі кампазітарамі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Аўтар тэксту Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь.

1944 год — французскі знішчальны полк «Нармандыя» пад камандаваннем маёра П. Пуяда накіраваны на 3-і Беларускі фронт. Удзельнічаў у Беларускай наступальнай аперацыі 1944 года, у тым ліку ў разгроме авіяцыі і войскаў праціўніка на аэрадромах Балбасава (Аршанскі раён), Дакудава (Крупскі раён), у Талачыне і Барысаве. За паспяховыя дзеянні пры фарсіраванні Нёмана палку прысвоена ганаровае найменне «Нёманскі». За 1943—1945 гады 148 лётчыкаў авіяпалка «Нармандыя-Нёман» здзейснілі больш як 5 тысяч баявых вылетаў, правялі 869 паветраных баёў, збілі каля 280 варожых самалётаў і 80 пашкодзілі.

У свеце

Дзень Афрыкі. Адзначаецца па ініцыятыве ААН у гадавіну стварэння Арганізацыі афрыканскага адзінства (1963; з 2002 года — Афрыканскі саюз).

1918 год — нарадзіўся Канстанцін Навумавіч Воінаў (1918—1995), расійскі савецкі кінарэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР, народны артыст СССР. Паставіў фільмы «Сёстры», «Молада-зелена», «Жаніцьба Бальзамінава», «Рудзін» і іншыя.

1941 год — нарадзіўся Алег Іванавіч Даль (1941—1981), рускі савецкі акцёр тэатра і кіно. Здымаўся ў фільмах «Жэня, Жэнечка і «кацюша», «Старая, старая казка», «Кароль Лір», «Зямля Саннікава» і іншых.

1946 год — у Вашынгтоне было падпісана міжнароднае пагадненне, у адпаведнасці з якім былыя нейтральныя краіны абавязаліся вярнуць законным уладальнікам золата, атрыманае ў фашысцкай Германіі.

УСМІХНЕМСЯ

— Люся, ну як табе даказаць, што мы з Таняй проста сябры і паміж намі нічога няма?..

— Прынясі мне яе галаву.

Яна і ён.

— Што робіш?

— Чытаю Булгакава.

— Гэта той, які напісаў пра Валдэморта?

— Добра, што ты прыгожая.

— Скажыце, доктар, якія лекі з'яўляюцца адначасова антысептыкам, болесуцішальным і супрацьзапаленчым?

— Гарэлачка, галубок, толькі гарэлачка!

— Я так і думаў, дзякуй, родненькі!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1897. Нумар падпісаны ў 19.30 24 мая 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Мясцовае самакіраванне

Штотыднёвы дадатак газеты Звязда

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

25 мая 2018 г. № 21 (454)

ДОБРАЯ НАВІНА!

З людзьмі, пра людзей, для людзей

Спяшаемся паведаміць, што днямі распачалася не толькі традыцыйная падпіска на штодзённую газету «Звязда» на III квартал і II паўгоддзе 2018 года, але і адкрылася асобная — на пятнічны нумар «Звязды» з дадаткам «Мясцовае самакіраванне» па асобных індэксах (індывідуальным і ведамасным).

Падпісаўшыся па адным з гэтых індэксаў (на месяц, некалькі месяцаў ці на паўгода), вы кожны тыдзень будзеце атрымліваць: пятнічны нумар газеты «Звязда» (на 8 старонках) і газету «Мясцовае самакіраванне» з праграмай тэлеперадач на тыдзень (на 16 старонках) у адным «пакеце».

Штотыднёвік «Мясцовае самакіраванне» — гэта ўнікальны медыйны прадукт, створаны спецыяльна для выбаршчыкаў і дэпутатаў усіх узроўняў. У ім вы заўсёды знойдзеце артыкулы пра:

ролю і месца органаў мясцовага самакіравання ў вырашэнні надзённых праблем насельніцтва;

найлепшы вопыт па сацыяльна-эканамічным развіцці рэгіёнаў;

падрыхтоўку і рэалізацыю заканадаўчых актаў, якія датычацца павышэння якасці жыцця людзей;

новыя цікавыя формы і метады работы дэпутатаў мясцовых Саветаў з насельніцтвам і многае іншае.

Падпіска на асобны штотыднёвы (пятнічны) нумар «Звязды» з дадаткам «Мясцовае самакіраванне» на III квартал і II паўгоддзе правядзіцца па індэксах: 633072 (ведамасная, цана на 1 месяц — 11 руб. 79 кап.), 63307 (індывідуальная, цана на 1 месяц — 4 руб. 64 кап.).

ТЭМА ТЫДНЯ

НЕ ЎПЭЎНЕНЫ — НЕ РЫЗЫКУЙ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Што прыводзіць да траўмаў на вытворчасці?

Здымак носіць ілюстрацыйны характар.

ЛЕТАСЬ на вытворчасці адбылося амаль 1400 няшчасных выпадкаў. Многа гэта ці мала? Чаму людзі атрымліваюць траўмы на рабоце — з-за памылак наймальніка ці ўласнай халатнасці? На якіх прадпрыемствах большая рызыка атрымаць прафзахворванне? І што робіцца, каб няшчасных выпадкаў станавілася менш? Разбіраемся з экспертамі.

Упаў з вышыні... і не ачуўся

Самыя траўманебяспечныя галіны вытворчасці — гэта прамысловасць (на яе прыпадае амаль 28 % траўмаваных з цяжкімі наступствамі), сельская гаспадарка (21 %) і будаўніцтва (20 %).

Што становіцца прычынай няшчасных выпадкаў? Часцей за ўсё парушэнне пацярпелым працоўнай і вытворчай дысцыпліны, патрабаванняў нарматыўных прававых актаў — пятая частка здарэнняў на працы адбываецца менавіта праз гэта. У 16,1 % выпадкаў справа ў невыкананні кіраўнікамі і спецыялістамі абавязкаў па ахове працы, у 7,4 % — у асабістай неасцярожнасці пацярпелага. Прычынай траўмаў становяцца таксама допуск да работы без навучання і праверкі ведаў (5,5 %) і нездавальняючае ўтрыманне і недахопы ў арганізацыі працоўных месцаў (4,5 %).

стар. 4

ДЫЯЛОГІ «МС»

«БЫЦЬ НАРОДНЫМІ, А НЕ «ІНШАРОДНЫМІ»

Наталля СУШКО па адукацыі педагог. Уласна, з дзяцінства хацела стаць настаўніцай, і мара збылася. Пачынала Наталля Міхайлаўна ў гімназіі г. Беразіно — настаўніцай пачатковых класаў. Пасля абавязковай адпрацоўкі прыехала ў Жодзіна, «дапрацавалася» да дырэктара школы, а па выніках 2013 года нават стала лепшым маладым дырэктарам Мінскай вобласці. Але на пэўным этапе, як прызналася Наталля Сушко, захацелася паспрабаваць свае сілы ў іншай дзейнасці — дэпутацкай. Калі была абрана старшынёй Жодзінскага гарадскога Савета дэпутатаў, давялося многаму вучыцца, у тым ліку і эканоміцы, з якой раней блізка не сутыкалася. У выніку на сёння ёсць узаемаразуменне з кіраўнікамі прадпрыемстваў і арганізацый, што, безумоўна, дапамагае ў працы.

— Наталля Міхайлаўна, поспех у любой справе залежыць ад прафесіяналаў, ініцыятыўных і творчых людзей. Вы задаволены сваёй камандай?

— У нас пасля выбараў у мясцовыя Саветы значна абнавіўся дэпутацкі корпус. З 38 дэпутатаў 24 — новыя. Сярод іх — кіраўнікі прадпрыемстваў, арганізацый, прадстаўнікі прыватнага бізнесу, прамысловасці, навукі. Словам, у гарадскім Савеце дэпутатаў прадстаўлены людзі з усіх сфер дзейнасці народнай гаспадаркі. Віталь Бубелеў — дырэктар завода цяжкіх штамповак, старшыня Савета кіраўнікоў арганізацый горада. Чалавек вельмі аўтарытэтны. Мяркую, як дэпутат прынясе гораду шмат карыснага. У межах падрыхтоўкі да 55-годдзя Жодзіна ён адказвае за ўладкаванне спартыўнай пляцоўкі ў парку адпачынку. Дэпутат Аляксандр Буцько — адказны за праект па ўладкаванні дзіцячай зоны «Акваторыя» — узначальвае гарадскі Савет па развіцці прадпрымальніцтва, у яго шмат ініцыятыў, ідэй, прапаноў. А вось Міхаіл Васілевіч Бараноўскі выбраны дэпутатам пяты раз. Можна сказаць, ён — аксакал сярод калег.

Ёсць і маладыя людзі да 31 года, чаго не было ў мінулым скліканні, а значыць, забяспечана добрая пераемнасць пакаленняў. З аднаго боку, прысутнічаюць вопыт, мудрасць, з іншага — маладосць, ініцыятыўнасць. Маладыя хлопцы прыйшлі сюды, таму што неабыякавыя да роднага горада. Ім цікава ўсё, яны хочуць добраўпарадкаваць свой двор, вуліцу, горад, каб пакінуць добры след. Спалучэнне вопыту і маладосці, аптымізму даюць добрыя вынікі.

стар. 3

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Сур'ёзная размова ў святочным антуражы

Вынікам Форуму рэгіёнаў павінны стаць прапановы, якія паўплываюць на перспектывы Саюзнай дзяржавы

На гэта звярнуў увагу старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандр ПАПКОЎ на пасяджэнні арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

Сфармуляваць прапановы, якія прасунуць беларуска-расійскую інтэграцыю наперад, магчыма пры добрай падрыхтоўцы работы секцый, пленарнага пасяджэння і выніковага дакумента форуму. Таму гэтай частцы арганізатары надаюць вялікае значэнне. Тэма пленарнага пасяджэння — «Прыярытэтныя кірункі развіцця рэгіянальнага супрацоўніцтва як ключавога фактару інтэграцыі і саюзнага будаўніцтва». Секцыі прысвечаны наступным кірункам: аграрная палітыка, гарманізацыя заканадаўства, моладзь і лічбавая эканоміка. Форум пройдзе на пачатку кастрычніка ў Магілёўскай вобласці. Чакаецца, што ў ім возьмуць удзел лідары дзвюх дзяржаў.

— Пытанні, якія будуць абмяркоўвацца на выніковым пасяджэнні, прапрацоўваюцца са студзеня на навукова-практычных канферэнцыях і круглых сталах, — паведаміла журналістам **намеснік старшыні Савета Рэспублікі, старшыня аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні форуму Марыяна ШЧОТКІНА.** — Не менш важная праблематыка прагучыць на Савеце дзелавога супрацоўніцтва. На форуме не толькі дэманструецца дружба народаў, яго прыярытэтам з'яўляюцца эканамічныя пытанні, адпаведныя пагадненні і кантракты.

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, кіраўнік секцыі, прысвечанай уніфікацыі і гарманізацыі заканадаўства Саюзнай дзяржавы, Ала БОДАК расказала, што падчас падрыхтоўкі да форуму на працягу года сумесна з Пастаянным камітэтам і Сакратарыятам Парламенцкага сходу была ўпершыню прааналізавана прававая прастора Саюзнай дзяржавы. «Мы маем цэлы шэраг прававых механізмаў, закладзеных у інтэграцыйных дакументах, якія яшчэ ніколі не выкарыстоўваліся. Цяпер высвятляем, што перашкаджае іх задзейнічаць. Па выніках плануем выйсці на канцэпцыю ўдасканалення заканадаўства Саюзнай дзяржавы, якую прапануем для разгляду на Вышэйшым дзяржаўным савеце», — праінфармавала сенатар.

Праграма форуму вельмі насычаная і рознабаковая. На пасяджэнні Міжпарламенцкай камісіі верхніх палат Беларусі і Расіі будзе прааналізаваны маніторынг выканання палажэнняў Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы. Яшчэ адным пытаннем стане развіццё канкурэнтаздольнай галіны жывёлагадоўлі на аснове селекцыйна-генетычных цэнтраў.

Вялікі блок мерапрыемстваў будзе прысвечаны моладзі, супрацоўніцтву ў сферы культуры і грамадскіх арганізацый.

Пра тое, наколькі абласны цэнтр і іншыя пляцоўкі рэгіёна гатовы прыняць форум, журналістам расказаў **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Віктар НЕКРАШЭВІЧ:** «Усе этапы, якія былі вызначаны Саветам Рэспублікі, выконваюцца. Пакуль не завершана фінансаванне будаўніцтва новага корпуса Беларуска-Расійскага ўніверсітэта, але мы праводзім работу за кошт мясцовага бюджэту. Высокую ступень гатоўнасці мае Палац культуры вобласці. Таксама прыводзім у парадак вуліцы і дамы, каб годна сустрэць гасцей. А госці для нас — гэта людскі трафік, запоўненыя гасцініцы, загружаныя прадпрыемствы грамадскага харчавання. Думаю, што Магілёўшчына пераканае ўсіх, што Форум рэгіёнаў павінен праходзіць у рэгіёнах».

Чакаецца, што на форум прыедзе не менш за 1000 гасцей. Наступнае пасяджэнне аргкамітэта пройдзе ў ліпені ў Магілёве з удзелам расійскага боку.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ!

ШТО ХВАЛЮЕ ЖЫХАРОЎ ДРОЗДАВА

Канструктыўны дыялог людзей і ўлады павінен даць станоўчыя вынікі

У Доме культуры аграгарадка Лясны Бараўлянскага сельсавета, што пад Мінскам, мясцовыя ўлады і прадстаўнікі ўсіх зацікаўленых бакоў разам з жыхарамі вёскі Дроздава абмеркавалі пытанні далейшага развіцця і ўдасканалення населенага пункта.

— Такія мерапрыемствы ў нас практыкуюцца даволі часта, — сказала **старшыня Бараўлянскага сельскага Савета Жанна ВАРАБЕЙ.** — У студзені-лютым мы збіраліся з жыхарамі аграгарадка Лясны, вёскі Бараўляны, у маі — з жыхарамі вёскі Курганы. Такое абмеркаванне праблем, якія хвалююць людзей, дае станоўчыя вынікі. Таму што пытанні вырашаюцца шляхам адкрытага канструктыўнага дыялогу.

На карце Бараўлянскага сельсавета яшчэ некалькі гадоў таму значылася вёска Дроздава. Затым побач з'явіўся раён індывідуальнай забудовы. Бум будаўніцтва прыйшоўся на пачатак 1990 гадоў. А затым, у 2008—2009-х, тут былі сфарміраваны 383 зямельныя ўчасткі для ўзвядзення дамоў тым, хто меў патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. У выніку колькасць насельніцтва значна павялічылася. Цяпер тут зарэгістравана 959 жыхароў. Мясцовыя ўлады паклапаціліся, каб забяспечыць іх транспартнымі зносінамі з Мінскам, ахапіць медыцынскім абслугоўваннем, уладкаваць дзяцей у школы і дзіцячыя сады сталіцы і населеных пунктаў, што знаходзяцца паблізу...

Але жыццё не стаіць на месцы, настаў час удасканаліць некаторыя аспекты. Для ўдзелу ў сумесных абмеркаваннях запрасілі кіраўнікоў структурных падраздзяленняў Мінскага райвыканкама, спецыялізаваных арганізацый. Менавіта тых людзей, ад якіх залежыць рашэнне ўсіх пытанняў. Перад аўдыторыяй выступілі прадстаўнікі транспартнай арганізацыі, установы аховы здароўя, адукацыі, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Валянціна Курсевіч, дэпутат Мінскага абласнога Савета Андрэй Каролька і іншыя. Яны расказалі, што канкрэтна зроблена для развіцця сельсавета і раёна, што плануецца, а таксама прапанавалі сваю канцэпцыю далейшага ўдасканалення гэтых тэрыторый, у тым ліку і вёскі Дроздава.

Зразумела, што без уліку агульных тэндэнцый нельга планаваць развіццё аднаго населенага пункта, лічыць Жанна Варабей: «Мы павінны ствараць камфортныя ўмовы быту і пражывання грамадзян, але агульнымі намаганнямі, з дапамогай саміх жыхароў, прадпрыемстваў, арганізацый. Неабходны баланс адказнасці як дзяржавы, так і грамадства». Праўда, некаторыя прысутныя выказваліся, што іх цікавяць перш за ўсё перспектывы вёскі Дроздава, паколькі яны тут жывуць. Падчас сустрэчы ў першую чаргу менавіта на праблемы гэтага населенага пункта і звярталася ўвага. Абмяркоўваліся такія пытанні, як удасканаленне транспартных зносін паміж Мінскам, Бараўлянамі, уладкаванне прыпынкаў транспарту, вуліц і тратуараў, медыцынскага абслугоўвання, эфектыўнага выкарыстання зямель 1-й Мінскай птушкафабрыкі, экалагічнага стану навакольнага асяроддзя і іншыя. Жыхары выказалі свае пажаданні, прапановы, якія абавязкова будуць улічаны. Але перад тым, як прыняць канчатковае рашэнне, усе спрэчныя моманты будуць вывучаныя і больш дэталёва прааналізаваныя.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

P.S. *У адным з найбліжэйшых нумароў мы вернемся да гэтай тэмы, да мясцовых праблем жыхароў Дроздава, і больш падрабязна пагаворым пра шляхі іх вырашэння.*

ПАЧУЦЬ РЭГІЁНЫ

Якіх законаў чакаюць дзелавыя колы?

СТАРШЫНЯ Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Уладзімір ПАНЦЮХОЎ прыняў удзел у сходзе Гродзенскага абласнога саюза наймальнікаў. Былі абмеркаваны пытанні павелічэння экспартных паставак, удасканалення заканадаўства ў сферы дзяржзакупак, аховы працы, стан зарплат і пенсій і іншае.

Гродзенская вобласць нядрэнна спрацавала за першы квартал. Чысты прыбытак за студзень-люты склаў 170 млн рублёў, паведаміла **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Алена БУБЕНЧЫК.** Па большай частцы паказчык сфарміраваны за кошт прамысловай галіны, будаўніцтва і сельскай гаспадаркі. На экспарт адпраўлена прадукцыі на 120 млн долараў. У рэгіёне ажыццяўляецца некалькі буйных праектаў — БелАЭС, траса М6; вядзецца будаўніцтва жылля. Разам з тым адчуваецца дэфіцыт інавацыйных праектаў, хоць сродкі на гэтыя мэты ў адпаведным фондзе прадугледжаны. За папярэднія пяць гадоў паступіла толькі сем заявак, якія прафінансаваны. Праўда, сёлета вытворцы актывізаваліся і ўжо прадставілі на разгляд 11 інавацыйных праектаў. Алена Бубенчык зазначыла, што паступова зніжаецца колькасць стратных прадпрыемстваў, чаму садзейнічае і нарматыўная база, якая ўвесь час удасканальваецца. Па словах Уладзіміра Панцюхова, прыезд у рэгіёны дазволіць больш канструктыўна падыйсці да заканадаўчай дзейнасці:

— Мая задача — пачуць і зразумець, што патрэбна змяніць у заканадаўстве, каб пазбегнуць розных хібаў і даць магчымасць працаваць у заўтрашнім дні. А ўдасканальванне закона — гэта прыкмета сённяшняга часу.

Стратэгію развіцця як краіны, так і асобных рэгіёнаў трэба распрацоўваць з улікам задач, пастаўленых на пятым Усебеларускім сходзе і агучаных падчас Паслання Прэзідэнта беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу. Гэта трывалая база для бізнес-планаў кожнага прадпрыемства, падкрэсліў Уладзімір Панцюхоў. Асабліва варта звярнуць увагу на інвестыцыі, якія спрыяюць занятасці насельніцтва, мадэрнізацыі вытворчасці, канкурэнтаздольнасці і ўрэшце — павелічэнню экспарту, прыцягненню валюты ў краіну.

Фота Міхаіла ІСАЧАНКІ.

Уладзімір ПАНЦЮХОЎ з генеральным дырэктарам ААТ «Малочны Мір» Марынай АНІКЕЕВАЙ і намеснікам старшыні Гродзенскага аблвыканкама Аленай БУБЕНЧЫК.

— У Савеце Рэспублікі і Палаце прадстаўнікоў разглядаецца шэраг сур'ёзных законапраектаў, якія могуць паўплываць на эканамічную сітуацыю. Гэта і закон аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве, аб гаспадарчых таварыствах, аб канкурэнцыі, аб інвестыцыях і іншыя, — расказаў Уладзімір Панцюхоў.

Гродзенскіх наймальнікаў хвалюе тэма закупак. Па словах **старшыні абласнога саюза, генеральнага дырэктара Гродзенскага мясакамбіната Анатоля ГРЫШУКА,** сёння кіраўнік вымушаны купляць больш таннае абсталяванне, хоць яму патрэбна іншае. У выніку нехта выйграў тэндар па кошце, а агрэгаты і лініі прастойваюць ці наогул іржавеюць пад плотам. Ад такіх «здзелак» краіна нясе значныя страты. А патрэбнае абсталяванне так і не закуплена. Такі падыход таксама тармозіць развіццё прадпрыемства, зазначыў Анатоль Грышук. А для некаторых несумленных кіраўнікоў гэта яшчэ і шчыліна для махінацый.

Уладзімір Панцюхоў пагадзіўся: тэма сапраўды вострая і вакол яе зараз ідзе шмат спрэчак. Магчыма, што ў хуткім часе гэта пытанне разгледзяць у Савеце Рэспублікі. Будуць улічвацца прапановы з рэгіёнаў, а таксама замежны вопыт.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

«БЫЦЬ НАРОДНЫМІ, А НЕ «ІНШАРОДНЫМІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Дэпутатаў часта называюць пасярэднікамі паміж людзьмі і ўладай. Згодны з такім сцвярджэннем?

— Дэпутаты — гэта сапраўды буфер паміж уладай і народам. Галоўнае — правільна наладзіць цеснае ўзаемадзеянне з першымі і дыялог — з другімі. І тут многае залежыць ад грамадзянскай пазіцыі дэпутата, ад таго, як ён зможа данесці яе да выбаршчыкаў, расказаць, што робіцца ў горадзе і для чаго, за кошт якіх фінансавых крыніц.

Нашы дэпутаты не баяцца наведваць калектывы, сустракацца з людзьмі па самых розных пытаннях. У тым ліку і праблемных. Тут вельмі важна выехаць на месца і ўсталяваць дыялог. Не заўсёды пытанні, якія ставяць грамадзяне, патрабуюць вялікіх капітальных і фінансавых укладанняў. Напрыклад, узнікаюць сітуацыі, калі хтосьці незадаволены тым, што высякаюцца дрэвы. І калі тлумачыш, што гэта абумоўлена аб'ектыўнымі прычынамі, што замест кожнага спілаванага дрэва будзе пасаджана некалькі маладых, то ставяцца з разуменнем.

— Ні адно гарадское мерапрыемства не праходзіць без удзелу дэпутатаў. І ўсё ж мала ўдзельнічаць, вельмі важна і самім праяўляць ініцыятыву.

— Ініцыятыў у нашых дэпутатаў шмат. Адна з іх — выключна дэпутацкія суботнікі, якія плануецца ладзіць двойчы ў год. У прыватнасці, з улікам Года малой радзімы сёлета навядзём парадак на тэрыторыях, якія пустуюць, у месцах агульнага карыстання. Напрыклад, у маі ладзім такое маштабнае мерапрыемства па расчыстцы лесапаласы — з удзелам моладзі — пагутарылі ў нефармальнай абстаноўцы, паказалі моладзі прыклад беражлівага стаўлення да сваёй малой радзімы.

Разам з маладымі дэпутатамі 15 мая, у Дзень сям'і, наведалі Жодзінскі гарадскі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, сустрэліся са шматдзетнымі сем'ямі, пасадзілі разам з імі туевую Алею сяброўства... Упэўнена, маладым дэпутатам гэта было цікава. У сваю чаргу яны падумаюць, чым могуць дапамагчы пажылым людзям, інвалідам, шматдзетным бацькам.

— Ведаю, што Жодзіна — прыклад у рабоце з органамі тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання...

— Тут галоўнае — не толькі зрабіць для людзей нешта карыснае, але і навучыць іх берагчы, цаніць тое, што стварылі для іх іншыя. Таму актыўна фарміруем вулічныя, дваровыя камітэты, выбіраем старшых па доме, пад'ездзе. На кожным з 249 дамоў, 802 пад'ездаў змешчана таблічка з указаннем кантактаў абслугоўвальнай арганізацыі «ЖодзінаЖылЦеплаСэрвіс», прозвішчаў і тэлефонаў дэпутата, старшага па доме, супрацоўніка гарадскога ўпраўлення ўнутраных спраў — тых, хто можа аператыўна вырашыць любое пытанне. Гэтыя падыходы дазваляюць скараціць колькасць зваротаў у гарвыканкам, адпаведныя службы.

Такая работа праводзіцца таксама і з жыллёва-будаўнічымі вытворчымі кааператывамі, таварыствамі ўласнікаў, якіх у горадзе 80. Нашы дэпутаты актыўна ўдзельнічаюць у рэйдах жыллёва-камунальнай службы. Два разы на год, вясной і восенню, сумесна вызначаюць стан дваровых тэрыторый, дзіцячых пляцовак, глядзяць, ці ўстаноўлены тут лаўкі, урны, ці ёсць клумбы, кветнікі, ці спраўныя гульнявыя атракцыёны. Наведваюць літаральна кожны двор. У выніку прымаецца адпаведнае рашэнне, даюцца канкрэтныя даручэнні, а дэпутат кантралюе іх выкананне.

Працуем і з прыватным сектарам. З сакавіка пастаянна ладзяцца рэйды сумесна з эколагамі, міліцыяй, дэпутатамі, санстанцыяй, якія правяраюць, ці няма парушэнняў экалагічнага асяроддзя, праводзяць прафілактычную гутарку. У тым ліку і па ўтрыманні тэрыторыі каля дома, зямельнага ўчастка, фасаду, агароджы.

> Нашы дэпутаты не баяцца наведваць калектывы, сустракацца з людзьмі па самых розных пытаннях.

Мы цесна ўзаемадзейнічаем з гарвыканкамам і яго старшынёй Юрыем Шарым, кіраўнікамі іншых арганізацый.Таму ўсе пытанні вырашаюцца канструктыўна. Толькі камандай можна дабіцца пэўных вынікаў. А ў юбілейны для нашага горада год гэта вельмі неабходна. Жыхары Жодзіна шмат чакаюць ад нас у пытаннях добраўпарадкавання і паляпшэння якасці жыцця.

— Падсумоўваючы нашу гутарку, давайце вызначым, якімі якасцямі павінен валодаць дэпутат?

— У першую чаргу быць неабыякавым. Любую праблему, што ўздымаюць выбаршчыкі, важна ўспрымаць як сваю асабістую, імкнуцца яе вырашыць і ўмець даходліва растлумачыць, калі ёсць часовыя складанасці. Пры гэтым важна не пакрыўдзіць чалавека. Дэпутат выбіраецца народам і падсправаздачны менавіта выбаршчыкам. Таму галоўнае — каб дэпутат быў народны, а не «іншародны».

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

Новы віток партнёрства

Чэшскія бізнесмены прапануюць праекты ў сферы энергетыкі і перапрацоўкі

Аб гэтым было заяўлена падчас работы беларуска-чэшскага бізнес-форуму ў Гродне. У яго рабоце прынялі ўдзел прадстаўнікі ўрадаў дзвюх краін, паслы, кіраўнікі прадпрыемстваў і кампаній.

Па словах намесніка міністра прамысловасці і гандлю Чэшскай Рэспублікі Эдуарда Муржыцкы, плануецца наладзіць больш цесныя кантакты з гродзенскім рэгіёнам. Асаблівая ўвага ўдзяляецца энэргетыцы. Чэшская кампанія ўжо ажыццявіла праект па пастаўцы турбін для Нёманскай ГЭС, зараз рыхтуецца яшчэ адзін значны праект у гэтай сферы, які датычыцца перадачы электраэнергіі і яе акумулявання. Таксама чэшскі бок гатовы прапанаваць новыя тэхналогіі перапрацоўкі для сельскагаспадарчай галіны, што дазволіць атрымаць эканамічны эфект пры экспарце прадукцыі. Тым больш што вобласць валодае багатай сыравіннай базай.

Як зазначыў намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Іван Жук, сувязі з Чэшскай Рэспублікай пакуль недастатковыя. Экспартныя пастаўкі ажыццяўляюць некалькі прадпрыемстваў, у асноўным ААТ «Гродна Азот», завод «Альберцін», прадпрыемствы па дрэваперапрацоўцы. За першы квартал тавараабарот склаў 4 млн долараў. На тэрыторыі вобласці працуюць тры кампаніі з чэшскім капіталам. У ліку самых значных праектаў — вытворчасць крэслаў з буку і арганізацыя вытворчасці драўняна-паліўных брыкетаў. Агульны аб'ём інвестыцый дадзеных праектаў склаў больш за 8 млн долараў.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

ВЫРАШАНА НА СЕСІІ

КАРЭКЦІРОЎКА БЮДЖЭТУ

На мінулым тыдні на пазачарговай сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў гаварылі пра фінансаванне: уносілі змяненні і дапаўненні ў раней прынятыя рашэнні. Жыццё не стаіць на месцы, і размеркаванне бюджэтных грошай патрабуе карэкціровак. У прыватнасці, народныя абраннікі вырашылі выдзеліць 200 тысяч рублёў на мадэрнізацыю абсталявання Летняга амфітэатра — галоўнай сцэнічнай пляцоўкі фестывалю «Славянскі базар у Віцебску».

У ліпені ён пройдзе 27-ы раз. У гэтай зале традыцыйна праводзяць цырымоніі адкрыцця і закрыцця, сольныя выступленні зорак, канцэрты ў рамках Дня Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі і гэтак далей.

Як удакладніла «МС» у дырэкцыі фестывалю, з'явілася неабходнасць у частковай замене камплектуючых гукавой лічбавай мікшарнай сістэмы, якая неабходна для высакаякаснага гукавога суправаджэння. Сістэму набылі ў 2007 годзе, і яна ўжо не адпавядае сучасным тэхнічным патрабаванням. Некаторыя камплектуючыя рамонту не падлягаюць. Поўная замена сістэмы каштуе вельмі дорага, таму больш выгадна замяніць састарэлыя камплектуючыя. Гэта дазволіць у далейшым пазбегнуць значных выдаткаў на дадатковыя паслугі па тэхнічным забеспячэнні і правесці фестываль на сучасным прафесійным тэхнічным узроўні...

Улічваючы, што сёлета абласное свята працаўнікоў сельскай гаспадаркі пройдзе ў Верхнядзвінску, туды пералічаць больш за 727 тысяч рублёў. У райвыканкаме канстатавалі, што да пачатку фестывалю-кірмашу «Дажынкі-2018» трэба адрамантаваць цэнтр культуры, рэканструяваць раённую бібліятэку, мадэрнізаваць аддзяленне дзённага знаходжання пенсіянераў, людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Шмат чаго трэба зрабіць і на цэнтральнай плошчы, іншых аб'ектах.

Больш за 2,4 мільёна рублёў прадугледжана для субсідавання жыллёва-камунальных паслуг насельніцтву, 555 тысяч — на рамонт установаў аховы здароўя.

У Віцебску ў так званым спальным мікрараёне «Білева-2» неабходна дабудаваць дзіцячы садок і школу. Каб вырашыць пытанне фінансавання, у гарвыканкаме вырашылі ажыццявіць выпуск аблігацыйнай пазыкі на 45 мільёнаў рублёў (на 2018—2020 гады), у тым ліку на 12 мільёнаў рублёў — на бягучы год.

Не забылі і пра ўстановы адукацыі вобласці ў цэлым — каб перад пачаткам новага вучэбнага года яны зрабілі рамонт, выдзеляць 5 мільёнаў рублёў.

Унесены і іншыя карэкціроўкі ў размеркаванне бюджэтных грошай.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

МЕРКАВАННІ

СПАЧАТКУ СТВАРЫЦЬ УМОВЫ

Бяспека перш за ўсё. Гэты выраз у адносінах да працы быў актуальны ва ўсе часы і не губляе надзённасць і сёння. Сярод апошніх навін — звесткі пра абрушэнне сцяны на будаўніцтве ў Гродне, выбух на заводзе ў вёсцы Каралёў Стан пад Мінскам. Следчыя разглядаюць некалькі версій, сярод асноўных — парушэнне правілаў бяспекі на працоўных месцах. Мы запыталі, як стварыць бяспечныя ўмовы для супрацоўнікаў, у спецыялістаў па ахове працы.

Пётр САМЧУК, галоўны тэхнічны інспектар працы Беларускага прафсаюза работнікаў лёгкай прамысловасці:

— Пачну са статыстыкі: у 2017 годзе колькасць падобных інцыдэнтаў на вытворчасці па ўсёй рэспубліцы склала 1390. У лёгкай прамысловасці, дзе задзейнічана 46 тысяч працоўных, адбылося 19 няшчасных выпадкаў, з іх чатыры цяжкія. Інцыдэнтаў са смяротным зыходам не было тры гады, тэндэнцыя зніжэння траўматызму назіраецца ўжо пяць гадоў.

Пры прыёме на працу кожны праходзіць уводны і першасны інструктаж па ахове працы, дзе прапісаны ўсе рызыкі для здароўя. Калі ўмовы працы асабліва небяспечныя, аднаго чытання інструкцыі недастаткова, — праводзіцца праверка ведаў па пытаннях аховы працы, стажыроўка. Толькі пасля гэтага пачынаецца самастойная дзейнасць.

Увогуле, можна акрэсліць некалькі блокаў арганізацыі бяспечнай працы: прыняцце лакальных нарматыўных актаў, якія ўтрымліваюць патрабаванні па ахове працы; забеспячэнне сродкамі індывідуальнай аховы; працоўныя са шкоднымі ўмовамі працы павінны праходзіць атэстацыю і медагляд. Калі дырэктар прадпрыемства кожны з гэтых пунктаў будзе мець на ўвазе, думаю, да няшчасных выпадкаў не дойдзе.

Выдатная напрацоўка прафсаюзаў Беларусі — ініцыятыва грамадскіх інспектараў па ахове працы. Яны маюць права выпісваць рэкамендацыі наймальніку. У нашым галіновым прафсаюзе летась такімі актывістамі вызначаны больш за 1200 парушэнняў.

Ала АНІШЧАНКА, старшыня прафсаюзнай арганізацыі філіяла «Энергазбыт» РУП «Мінскэнерга»:

— Пры вырашэнні любых вытворчых задач асноўная мэта — забеспячэнне жыцця і здароўя кожнага працоўнага. Мы, напрыклад, навучаем бяспечным метадам і прыёмам працы, праводзім стажыроўкі на працоўных месцах, інструктажы, супрацьпажарныя трэніроўкі, правяраем веды ў сферы аховы працы, забяспечваем людзей сродкамі індывідуальнай аховы. Самыя важныя меры прафілактыкі няшчасных выпадкаў на вытворчасці? Гэта эфектыўная сістэма кіравання аховай працы, размеркаванне абавязкаў у сферы наладжвання бяспекі, назначэнне адказных за эксплуатацыю пабудоў, машын, механізмаў.

Анатоль СТУЛЬЧЫКАЎ, начальнік аддзела аховы працы прадпрыемства «Белкамунмаш»:

— На нашым прадпрыемстве працуе больш за 1100 чалавек. Усе кіраўнікі трымаюць экзамены па ахове працы. У кожным цэху створана спецыяльная камісія з ліку асоб, якія здалі экзамен заводскай камісіі. У сваю чаргу заводская камісія прайшла такую праверку ў Мінгарвыканкаме.

Уявім сітуацыю, што да нас на прадпрыемства ўладкоўваецца маляр. Ён звяртаецца ў аддзел кадраў, дзе яму выдаюць накіраванне на медагляд. Існуюць пэўныя патрабаванні да стану здароўя патэнцыйнага супрацоўніка. Медыкі выдалі кандыдату станоўчае заключэнне — ён афармляецца і праходзіць уводны інструктаж. Потым маляр накіроўваецца ў сваё падраздзяленне. Там праводзяць першасны інструктаж на працоўным месцы, стажыроўку, праверку ведаў, афармляюць адпаведны пратакол, і навічок пачынае працу. Падчас стажыроўкі за новым працоўным замацоўваецца кіраўнік — майстар або работнік са стажам больш за тры гады на аналагічнай пасадзе. Яшчэ ў аддзеле кадраў яго азнаёмілі з усімі шкоднасцямі працы, вызначылі даплату і дадатковае харчаванне — малако. Выдаецца працоўным і спецыяльнае адзенне.

Марыя ДАДАЛКА.

НЕ ЎПЭЎНЕНЫ — НЕ РЫЗЫКУЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Аналіз завершаных спецыяльных расследаванняў указвае на змяншэнне гібелі і траўмавання работнікаў з прычыны адсутнасці бяспечных умоў працы. Калі ў 2016 годзе пры наяўнасці выключнай віны наймальніка адбылося 30,5 % няшчасных выпадкаў з цяжкімі наступствамі, то ў 2017-м гэты паказчык знізіўся да 25,1 %. Наяўнасць змешанай віны наймальніка і пацярпелага летась прысутнічала ў 23,3 % выпадкаў. А значная колькасць траўмаў адбылася па віне самога пацярпелага, у тым ліку з прычыны яго асабістай неасцярожнасці — амаль 40 %, — адзначае **дырэктар дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Віктар СІДАРОВІЧ.**

Магчыма, справа ў ператамленні работнікаў? Віктар Сідаровіч тлумачыць, што непасрэдна няшчасных выпадкаў, да якіх прывяла б такая прычына, не ўстаноўлена. Але празмерныя фізічныя ці нервовыя нагрузкі могуць выклікаць змены ў стане супрацоўніка. Чалавек можа дапусціць парушэнні патрабаванняў тэхналагічнай інструкцыі, памылкі ў рабоце, у яго зніжаецца адчуванне небяспекі, што ў выніку вядзе да траўмаў.

Летась на вытворчасці загінула 115 чалавек. Больш за ўсё няшчасных выпадкаў са смяротным зыходам было сярод кіроўцаў аўтамабіляў (21), трактарыстаў (10), электраманцёраў (6), жывёлаводаў (6) і падсобных рабочых (3). Асноўныя траўміруючыя фактары — уздзеянне рухомых прадметаў і дэталяў, дарожна-транспартныя здарэнні, падзенне з вышыні, абвальванне канструкцый будынкаў ці матэрыялаў.

Сярэдні ўзрост загінулых склаў каля 46 гадоў. Найбольшую ўдзельную вагу сярод смяротна траўмаваных работнікаў займаюць людзі ва ўзросце 51—60 гадоў — амаль 35 працэнтаў.

Па-ранейшаму актуальная праблема з'яўлення на працы нападпітку і ўжывання спіртных напояў у працоўны час. Нягледзячы на меры, якія прымаюцца, летась у стане алкагольнага ап'янення на момант гібелі знаходзіліся 22 чалавекі — амаль кожны пяты (у 2016-м гэта быў кожны сёмы).

Здароўе адбіраюць машыны

За мінулы год у краіне паменела працоўных месцаў са шкоднымі ці небяспечнымі ўмовамі — з 656 тысяч да 608 тысяч. У асноўным гэта месцы ў арганізацыях, падначаленых Міністэрству прамысловасці (амаль 19 %), Мінэнерга (13 %), канцэрну «Белнафтахім» (11 %), Мінбудархітэктуры (10 %), Мінтрансу (10 %) і Мінлясгасу (6 %).

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Колькасць работнікаў, якія маюць права на пенсію па ўзросце з асаблівымі ўмовамі працы па Спісе № 1 і Спісе № 2, за год знізілася на 5,4 тысячы чалавек. Але на прадпрыемствах канцэрнаў «Белнафтахім» і «Беллеспаперапрам», а таксама міністэрстваў лясной гаспадаркі і будаўніцтва і архітэктуры каля паловы персаналу заняты ў неспрыяльных умовах працы.

Летась зарэгістравана 84 выпадкі прафесійных захворванняў, праяўленых упершыню. Сярод тых, хто захварэў, 66 мужчын і 18 жанчын. Найбольшая колькасць выпадкаў прыпадае на сталіцу і Мінскую вобласць.

Амаль 61 працэнт прафзахворванняў выяўлены ў арганізацыях па вытворчасці машын і абсталявання. Напрыклад, на такіх прадпрыемствах, як Мінскі трактарны завод, «Беларуськалій», МАЗ, «Гомсельмаш», гомельскі ліцейны завод «Цэнтраліт», «Белшына», БелАЗ.

Прычынамі ўзнікнення прафзахворванняў часцей становяцца канструкцыйныя недахопы машын, абсталявання і інструменту (амаль 65 працэнтаў) і парушэнне патрабаванняў бяспекі (31 працэнт). Праз гэта летась дзевяць чалавек атрымалі III групу інваліднасці (у 2016-м статыстыка была горшай — інвалідамі прызналі 15 чалавек).

Што з прафілактыкай?

— Калі аналізаваць вынікі праверак, праведзеных у мінулым годзе, можна сказаць, што ў пераважнай большасці выпадкаў былі выяўлены парушэнні заканадаўства аб ахове працы. Часцей яны датычыліся навучання і інструктавання работнікаў, забеспячэння іх сродкамі індывідуальнай абароны, эксплуатацыі няспраўных машын і станкоў, — каментуе Віктар Сідаровіч.

Праверкі на прадпрыемствах і арганізацыях цяпер праводзіць і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. У плане — абысці 15,2 тысячы аб'ектаў. На сёння праверана ўжо 11 тысяч: гэта гандлёвыя цэнтры, лячэбныя і аздараўленчыя ўстановы, кінатэатры.

— На 80 працэнтах аб'ектаў знойдзены парушэнні, — канстатуе **афіцыйны прадстаўнік МНС Беларусі Віталь НАВІЦКІ.** — Напрыклад, закрытыя шляхі эвакуацыі, самавольная перапланіроўка, адсутнасць кантролю за захаваннем бяспекі. Але большасць парушэнняў носіць рэжымны характар, гэта значыць для іх ліквідацыі не патрэбна грашовых затрат.

Каб знізіць вытворчы траўматызм, упор робяць на прафілактыку. Аналізуюцца выяўленыя падчас нагляду парушэнні, распрацоўваюцца меры па іх ліквідацыі, праводзіцца маніторынг і накіроўваюцца рэкамендацыі па ліквідацыі і недапушчэнні недахопаў. Каб растлумачыць парадак выканання патрабаванняў заканадаўства, праводзяцца прыёмы грамадзян, прамыя і гарачыя тэлефонныя лініі, семінары, круглыя сталы, сустрэчы з выпускнікамі ўстаноў адукацыі.

— Пытанню вытворчага траўматызму ўдзяляецца належная ўвага, бо гэты паказчык вызначае як дэмаграфічную сітуацыю ў краіне, так і якасць працоўных рэсурсаў, прадукцыйнасць працы, — кажа Віктар Сідаровіч.

І пазітыўныя зрухі ёсць. Так, летась колькасць пацярпелых на вытворчасці на тысячу працоўных склала 0,41 (для параўнання: у 1991-м — 4,7). Увогуле, за апошнія 26 гадоў траўмаў на рабоце паменела ў 15,5 раза. А няшчасныя выпадкі са смяротным зыходам сталі адбывацца радзей у 3,5 раза.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

Не жартуйце з токам і каровамі

Сельская гаспадарка — у тройцы самых небяспечных галін. Пра сітуацыю з аховай працы ў гэтай сферы расказаў **галоўны тэхнічны інспектар працы Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу Павел МАНЬКО.**

Самы распаўсюджаны з няшчасных выпадкаў у сельскай гаспадарцы — наезд тэхнікай. Прычына ў тым, што ў полі пры руху назад кіроўца забывае падаць гукавы сігнал. Калі ж здарэнне адбываецца на жывёлагадоўчым комплексе, то справа ў асноўным у неасцярожнасці самога пацярпелага.

Нярэдка работнікі траўмуюцца часткамі агрэгатаў. Пры ўключаным рухавіку пачынаюць рамантаваць ці наладжваць абсталяванне, што прыводзіць да сумных вынікаў, аж да ампутацыі канечнасцяў. У «топе» няшчасных выпадкаў таксама паражэнне электрычным токам з-за таго, што не закрыта электрамантажная шафа ці свабодны доступ да сетак.

Мае месца і траўмаванне жывёламі. Гэта здараецца, калі работнік парушае правілы іх утрымання і вырошчвання. Напрыклад, піхнуў карову — а яна брыкнула ў адказ. Ці не прытрымліваўся нормаў пры пагрузцы жывёл.

— Раз на квартал і перад масавымі палявымі работамі мы праводзім навучанне ў рэгіёнах, папярэджваем работнікаў, каб не дапускалі няшчасных выпадкаў. Апошнім часам паказваем жахлівыя фотаздымкі з траўмамі — магчыма, убачыўшы наступствы неасцярожнасці, людзі задумаюцца. Заўсёды даводзім, што нашы інструкцыі, можна сказаць, «напісаны крывёй». Самая эфектыўная мера — навучыць чалавека самога клапаціцца аб сваёй бяспецы, — лічыць Павел Манько.

Для работнікаў, якія атрымалі траўму на вытворчасці, прадугледжаны грашовыя кампенсацыі. Пры няшчасных выпадках з цяжкімі наступствамі за кожны працэнт страчанай працаздольнасці налічваецца адзін сярэднямесячны заробак. Калі ж работнік загінуў на працоўным месцы, яго сям'і выплачваецца дзесяць сярэднегадавых заробкаў.

— Пры смяротных выпадках ступень віны загінулага не вызначаецца. Чалавек ужо сам сябе дастаткова пакараў...

Дзмітрый КАРАСЬ:

«У «Нацыянальным хіт-парадзе» за сябе не галасую»

У праграме «Нацыянальны хіт-парад», якая ўжо амаль чатыры гады выходзіць на тэлеканале «Беларусь 3», беларускія артысты — вядомыя і не вельмі, а таксама зусім юныя выканаўцы — даюць новае жыццё народным песням, прымяраючы да іх розныя музычныя стылі, аранжыроўкі і манеру выканання. Гледачы праз галасаванне падтрымліваюць ад аднаго да пяці з 15 кандыдатаў, а ў канцы года найлепшыя з найлепшых гучаць у вялікім зборным канцэрце. Нядаўна хіт-парад змяніў «упакоўку» — графічнае афармленне. Якіх перамен чакаць надалей, ці магчыма «накруціць» галасы за сябе і як людзям з вуліцы трапіць у тэлевізар, «Звязда» распытала кіраўніка праграмы і аднаго з яе вядучых Дзмітрыя Карася.



ПЕСНЯ ПРА КАРАСЯ І «ЕЎРАБАЧАННЕ»

— Прыход у праект (летась у кастрычніку) адбыўся амаль выпадкова, як многае ў маім жыцці, — прыгадвае Дзмітрый. — Тады вядучыя Воля Сацюк і Кірыл Ермакоў запісалі адзін з выпускаў на «Славянскім базары», Кірыл спакойна паехаў працаваць у Маскву, але здарыліся нейкія тэхнічныя накладкі, і праграма да Мінска не дайшла. А ў эфір трэба нешта выдаваць, сетка — вось яна. Патэлефанавалі мне з просьбай аператыўна запісаць новы выпуск. І калі Кірыл канчаткова пераехаў у Маскву, кіраўніцтва заўважыла: навошта шукаць кагосьці на замену, калі вось у Дзімы нядрэнна атрымалася. Так я і апынуўся ў камандзе.

— І амаль адразу пачалі спяваць — спачатку са пявачкай Марыдай, потым з Сяргеем Славянскім, і на сёння мы ўжо маем пяючага вядучага, які спявае. Можна было б запытацца, калі ж на «Еўрабачанне»? Але мне перш за ўсё цікава, як вас наогул занесла на гэтыя галеры?

— О, тут быў такі выпадак. На адным з канцэртаў, даведаўшыся, што я спяваю, Лёша Хлястоў гаворыць: «Ведаеш, я б вядучых, якія пачынаюць спяваць, уласнаручна душыў бы». «Згодны, — адказваю, — але што тады рабіць са спевакамі, якія ідуць у тэлевядучыя? Нам жа хутка няма каго будзе прадстаўляць на сцэне! Так што рыхтуйся, летам выходзіць мой сольны альбом». ...Але насамрэч супакою ўсіх патэнцыйных канкурэнтаў: я не прэтэндую на «Еўрабачанне» і наогул не ўспрымаю гэта як сур'ёзнае заняцце вакалам. Хутчэй, гэта самарэалізацыя, спроба сябе ў новым амплуа. Хоць, увогуле кажучы, не такім і новым — раней гэта называлася «Артыст эстрады». Прыгадайце, напрыклад, як Андрэй Міронаў, будучы вядомы артыст тэатра і кіно, разам з тым выконваў песні на канцэртах. Зразумела, я не стаўлю сябе на адну прыступку з гэтым геніяльным акцёрам, аднак, калі выпала магчымаць паэксперыментаваць, — чаму б не? Вядучы на сцэне і спявак — зусім розны стан, цяпер я гэта выразна разумею.

Адбылася ж спроба голасу, як сцвярджае Дзмітрый Карась, пасля яго аўтарскага талент-шоу «Імперыя песні» па выяўленні беларускіх чэмпіёнаў караоке. Сабраўшы каманду з былых удзельнікаў пад назвай «4L», тэлевядучы прывёў навастворaны гурт на нацыянальны адбор «Еўрабачання» і пазнаёміў з кампазітарам Уладзімірам Сукалінскім. Праўда, супрацоўніцтва з гуртом не атрымалася. «І тады я думаю: чаму не магу сам паспрабаваць? Папрасіў: напішы мне песню пра карася, — расказвае Карась. — Уладзімір за два дні напісаў яе, а дзеці маіх сяброў хутка вывучылі на памяць. Нядаўна даслалі відэа, як малыя спяваюць, такое кранальнае — хутка выкладу ў сацыяльных сетках». Потым была песня пра надвор'е, дуэты з прафесійнымі выканаўцамі — сучасныя версіі народных песень «У мураванай мураванцы» і «Капаў, капаў крынічэньку» і яшчэ не апублікаваны эксперымент у жанры шансона. «Адна з песень нават трапіла у нейкі музычны топ, выйшла на зборніку, і на аўтазапраўках можна было набыць дыск, дзе паслухаеш Кіркорава, Білана, Баскава і Карася», — смяецца Дзмітрый.

— Калі стаў прадзюсарам «Нацыянальнага хіт-парада», я пачаў строга сачыць за ратацыяй выканаўцаў у ім. Знялі з эфіру тых, хто знаходзіўся ў ім цэлы год — і я вельмі ўдзячны сваёй сувядучай Вользе Сацюк, песня якой таксама трапіла пад «скарачэнне», што яна адрэагавала на гэта спакойна. Каб часцей з'яўляліся новыя асобы, мы вырашылі праводзіць сезонныя абнаўленні выканаўцаў. Ужо хутка, на пачатку лета, прадставім чарговы шорт-ліст для галасавання. Але ў мяне новай песні няма, таму на лета знікну — можа, якраз з'явіцца час запісаць з кімсьці дуэт.

— Ваш дуэт з Марыдай таксама трымаўся ў хіт-парадзе больш за паўгода — скажыце папраўдзе, прасілі калег і бабуль са сваёй вёскі галасаваць за сябе?

— Мяне самога такі вынік здзіўляў. Напачатку наогул не разумеў, як галасаваць, — гэта было магчыма толькі праз суполку «УКантакце», нейкім не зусім зразумелым для мяне чынам... Уласна, мы і пачалі з таго, што спрасцілі для гледачоў схему галасавання: на сайце тэлеканала «Беларусь 3» ёсць спасылка, і з панядзелка па сераду можна аддаць голас за 1—5 артыстаў, хто вам даспадобы (з аднаго камп'ютара — адзін раз, так што накруткі не атрымаецца). У чацвер падводзім вынікі галасавання, у нядзелю іх агучваем, і барацьба прыхільнікаў пачынаецца наноў. Шчыра прызнаюся, адзін тыдзень я сапраўды прайшоўся па кабінетах калег і папрасіў: галасуйце за Карася. Але да першага месца так і не дайшоў, а потым на гэтыя захады элементарна не засталося часу. Таму цяпер мяне радуе, што вынікі адлюстроўваюцца як ёсць. Часта папулярныя артысты «вылятаюць» з хіт-парада праз тыдзень-другі, а малавядомыя застаюцца надоўга — мабыць, гледачы прагнуць новых, свежых ідэй і выканаўцаў, якія прыўносяць свае цікавінкі ў народныя спевы, больш акуратна і далікатна ставяцца да іх.

ТАЛЕНТЫ І РЭЙТЫНГІ

— Ведаю, што не так даўно вы ладзілі кастынг на новага вядучага «Нацыянальнага хіт-парада», але так нікога і не выбралі. Чаго не хапала кандыдатам?

— Сапраўды, мы меркавалі знайсці трэцяга сувядучага. Было некалькі чалавек, якія нам спадабаліся, але ў праект яны ўсё ж не трапілі. Чаму? Бо хацелася знайсці індывідуальнасць, адметную асобу. Здавалася б, у наш час праблем з самавыяўленнем няма, аднак сапраўды яркіх, харызматычных, запамінальных людзей са сваім бачаннем свету не так і шмат. Усе прыходзяць на тэлебачанне рознымі, але перад камерамі чамусьці робяцца... як усе, прыпадабняюцца да ўжо бачаных вобразаў... Пошукі новых свежых твараў, здольных упрыгожыць і разнастаіць наша тэлебачанне, заўжды працягваюцца, і калі вы адчуваеце сябе такім — калі ласка, запісвайце відэа, дасылайце яго на электронную скрыню тэлеканала, грукайце ва ўсе дзверы. І паверце, калі вы сапраўды таленавітыя і цікавыя — вас заўважаць!

— Але трэба яшчэ ўсведамляць, куды і навошта ідзеш. Мне здаецца, «Сто песень для Беларусі» — гэта не проста каментаванне музыкі, яе неабходна ведаць, разумець і любіць...

— У нас праграма наогул унікальная: я не ведаю іншых каналаў, дзе рабілі б аналагічны прадукт. Мы робім яго самі ад пачатку да канца: стваральнікі праграмы «Наперад у мінулае» Аксана і Анатоль Вечары спачатку знаходзяць народныя песні, запісваюць іх у выкананні мясцовых людзей, потым запрашаюць сучасных артыстаў і ў суаўтарстве з аранжыроўшчыкамі робяць, па сутнасці, ужо новыя песні, манціруюць кліпы, якія ў выніку і становяцца асновай «Нацыянальнага хіт-парада». Такіх кліпаў ужо больш як 200, і гэта насамрэч каласальная і вельмі важная работа.

— Я разумею, што «Нацыянальны хіт-парад» і наогул сацыякультурны тэлеканал «Беларусь 3» — гэта не пра камерцыю. Наколькі дарэчы казаць пра рэйтынгі?

— Яны, між іншым, вельмі неблагія. У тым ліку і з гэтай прычыны мы пакуль што не рызыкуем уносіць у праграму кардынальныя змены, каб не адштурхнуць сваю аўдыторыю. На жаль, яшчэ ёсць праблема са зваротнай сувяззю, бо асноўныя нашы гледачы — дарослыя людзі, найчасцей з правінцыі, якія амаль не карыстаюцца інтэрнэтам, а ў многіх і камп'ютара няма. Калі прыязджаю да сябе ў вёску пад Гервяты, то бабулі-суседкі заўжды гавораць, што глядзелі наш хіт-парад — «так ужо прыгожа спявалі», і не выходзілі палоць градy, пакуль мая песня не прагучыць...

— Мабыць, варта карыстацца старым добрым спосабам — звычайнай поштай і папяровымі лістамі?

— Так, мы заўжды з хваляваннем іх чакаем, атрымліваем і адказваем актыўным гледачам на ўсе заўвагі і прапановы.

РАСКЛАД НА ЗАЎТРА

— Ці будзе ў праграме яшчэ нешта змяняцца, акрамя графічнага аздаблення?

— Мне, дарэчы, вельмі падабаецца новая ўпакоўка, асабліва фота, дзе Вольга ў вяночку, а я ў саламяным капелюшы. А наступная мэта (спадзяюся, летам якраз атрымаецца яе рэалізаваць) — асвяжыць нашу студыю. Але любыя магчымыя перамены будуць служыць галоўнай мэце, калі хочаце, звышзадачы: пракласці музычны мост паміж рознымі пакаленнямі, узбагаціць сучасную эстраду народным песням і даць магчымасць як мага большай колькасці таленавітых выканаўцаў праявіць сябе.

Дарэчы, у Маскве літаральна праз некалькі дзён адбудзецца ўнікальнае фальклорнае «Еўрабачанне» — Міжнародны фолк-фестываль (радыёстанцыі — удзельнікі Еўрапейскага вяшчальнага саюза ладзяць гэты некамерцыйны фэст з 1980 года, і па значнасці ён лічыцца другім пасля песеннага конкурсу. Сёлета нашу краіну на ім прадставіць 17-гадовая Патрыцыя Свіціна — лаўрэатка конкурсу «Маладыя таленты Беларусі» 2016 года. — **Аўт.**). З нецярпеннем чакаю, якія ўражанні і досвед прывязуць адтуль калегі з Беларускага радыё — магчыма, удасца неяк «засвяціць» і наш праект.

— Гэтым летам «Нацыянальнаму хіт-параду» споўніцца чатыры гады — дата не круглая, але ўжо і не маленькая. Ці плануеце неяк адзначаць яе?

— Паколькі ў нас яшчэ не юбілей, мяркую, адзначым сціплай кампаніяй стваральнікаў праграмы, збяромся недзе ў кавярні ды вып'ем па келіху шампанскага. А вось да пяцігоддзя, калі ўсё складзецца, падрыхтуем што-небудзь цікавае для гледачоў і артыстаў. Я, напрыклад, марыў пра песенны марафон, які доўжыўся б з раніцы да вечара... Пакуль загадваць так далёка ўсё ж рана, нават навагоднія выпускі будзем абмяркоўваць толькі ўлетку.

У гэтым сезоне «Нацыянальны хіт-парад» па чарзе вядуць Дзмітрый КАРАСЬ і Вольга САЦЮК.

Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота прэс-службы Белтэлерадыёкампаніі і з сацыяльных сетак.

Вядучыя тэлеканала «Беларусь 3» падтрымліваюць беларускую мову, культуру і традыцыі не толькі словамі, але і справай. Вось так у снежні 2017-га творчая брыгада хадзіла па медыяхолдынгу... калядаваць!

Канікулы? Канікулы!

«МАСКВА — КАСІЯПЕЯ», «ЮНАКІ Ў СУСВЕЦЕ»
МІР, 1 і 2 чэрвеня

Фантастычныя прыгоды савецкіх школьнікаў у далёкім космасе выйшлі на экраны амаль 45 гадоў таму — і, магчыма, сёння многае ў фільмах Рычарда Віктарава падасца наіўным, смешным і невідовішчным.

Аднак гэта зусім не прычына, каб ігнараваць выратавальную экспедыцыю шасці выдатнікаў і аднаго хулігана ў сузор'е Касіяпеі і ацаніць іх вынаходлівасць у барацьбе з робатамі, якія пачалі прымусова «ашчасліўліваць» абарыгенаў. Колькі доўжыцца палёт да Касіяпеі, хто такія робаты-вяршыцелі і якую ролю ў лёсе цэлай планеты сыграў звычайны цвік?..

«ПІТ І ЯГОНЫ ЦМОК»
«Беларусь 2», 2 чэрвеня

Прыгоды, загадкі і фэнтэзі — амерыканскі рэжысёр Дэвід Лоўры скарыстаў грымучую сумесь, каб зрабіць гэтую захапляльную кінагісторыю (дарэчы, рымейк аднайменнага мюзікла 1977 года).

...Недзе ў 1970-х маленькі Піт едзе з бацькамі па лясной дарозе, але трапляе ў аварыю і застаецца зусім адзін. Спалоханы малы ўцякае ў лес, дзе яго акружаюць ваўкі, але раптам тыя разбягаюцца, бо побач з хлопчыкам з'яўляецца вялізны зялёны цмок, падхоплівае дзіця лапамі і ўлятае некуды ўдалечыню. А праз шэсць гадоў Піт і поўны загадкавай магіі цмок, які атрымаў імя Эліят, ужо ў статусе найлепшых сяброў са здзіўленнем бачаць, што ў старажытны лес урываюцца дрывасекі, якія плануюць маштабную вырубку. Праўда, лясны рэйнджар Грэйс спрабуе спыніць незаконныя работы — але тут нехта з прысутных заўважае Піта, а пазней — і Эліята, якога кіраўнік дрывасекаў хоча злавіць і скарыстаць для ўласнага абагачэння...

«ЧОРНАЯ МАЛАНКА»
TV1000Ru, 2 і 3 чэрвеня

Супергероямі не нараджаюцца, а становяцца, прычым часта зусім выпадкова — гэта вядома ўсім аматарам коміксаў. Вось і ў расійскім фантастычным баевіку бесклапотны малады чалавек 20 гадоў Дзіма Майкоў проста атрымлівае ад бацькі падарунак — старэнькую чорную «Волгу-21», а ўжо ў працэсе высвятляе, што яго драндулет умее лятаць у паветры не горш за знішчальнікі.

Хлопец з задавальненнем лунае над маскоўскімі пробкамі, пакуль не здараецца бяда — гібель бацькі, якая прымушае Дзіму пераглядзець жыццёвыя прынцыпы. Ён вырашае скарыстоўваць цудоўную машыну, каб дапамагаць людзям, і хутка становіцца супергероем — улюбёнцам гараджан і журналістаў, якія даюць загадкаваму гоншчыку мянушку «Чорная Маланка». Неўзабаве новаму герою давядзецца ўсур'ёз змагацца са злом у небе над Масквой...

Панядзелак, 28 мая

1 Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 «Добрай раніцы, Беларусь!»
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.40** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 0.20 «Зона Х» (16+).
9.10 «Галоўны эфір».
10.20, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Добрыя намеры» (16+).
12.50, 13.05, 14.35, 15.25 Меладрама «Хросная» (16+).
15.15, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 «Беларуская часінка».
21.00 «Панарама».
21.50 «Векавы рубеж». Фільм першы.
22.20 Серыял «След» (16+).
0.00 Арэна.
1.00 «Дзень спорту».

2 Беларусь 2

7.00 «Тэлераніца» (12+).
9.00, 18.40, 22.10 «Тэлебарометр».
9.30, 20.00 Серыял «Зразумець. Дараваць» (16+).
10.30 «Капейка ў капейку» (12+).
11.00 «Камень, нажніцы, папера» (16+).
11.30 «Спатканне для мамы» (12+).
12.35 «Свет навыварат. Непал» (16+).
13.30 М/с «Качыныя гісторыі» (0+).
14.50 Анімацыйны фільм «Дыназаўр» (0+).
16.10 Драма «Таленавіты містар Рыплі» (16+).
19.15 «Суперлато».
21.00 «Паненка-сялянка» (16+).
22.00 «КЕНО».
22.15 «Арол і рэшка. Кругасветка» (16+).
23.15 «Ідзі сюды і танцуй».
23.20 «Анжаліка». Сіткам (16+).
0.25 «Сыграй мяне, калі зможаш» (12+).

3 Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.20 «Беларуская кухня». Бігас. Халодны суп.
8.05, 12.00, 19.55 Навіны культуры.
8.20, 12.15 «Гэты дзень».
8.25 «Нацыянальны хіт-парад».
9.20 «Навукаманія» (6+).
9.50, 17.00 «Людміла Гурчанка. Бляск і роспач». Дак. фільм (12+).
10.30, 15.30 «Палёты ў сне і наяве». Маст. фільм (12+).
12.50 «Я хачу гэта ўбачыць!» Маладзечна (6+).
13.15 «Наперад у мінулае».
13.45, 22.10 «Курская бітва. Час перамагаць». «Контрудар, адменены Сталіным» (12+).
14.20, 21.05 «Атрад спецыяльнага прызначэння». Маст. фільм. 1-я серыя (12+).
17.40 «Сабака на сене». Камедыя (12+).
20.10 «Майстэрня. Гісторыя аднаго мастака». Сяргей Спрынджук.
20.40 «Калыханка» (0+).

5 Беларусь 5

6.55 Тэніс. Турнір WTA. Страсбург. Фінал.
8.55 Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Фінал 4-х. Фінал.
10.40 Вынікі тыдня.
11.20 Вялікі спорт.
12.00, 22.40 Тэніс. «Ралан Гарос».
14.00 Веславанне на байдарках і каноэ. Этап Кубка свету. Дуйсбург.
15.50 Лёгкая атлетыка. Брыльянтавая ліга. Юджын.
17.55 Час футбола.
18.40 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. БАТЭ (Барысаў) — «Islач» (Мінскі р-н). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
20.40 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

АНТ

6.00, 6.30, 7.00 (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.10, 7.10, 8.10 «Наша раніца».
9.10 «Контуры».
10.00 «Жыць здорава!» (12+).
11.10 «Модны прыгавор» (12+).
12.25, 13.10 Серыял «Ліквідацыя» (16+).
13.55 «Давай пажэнімся!» (16+).
14.55 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
16.20 «Легенды цырка» (12+).
16.55 «Кантрольная закупка» (12+).
17.30, 18.20 «На самай справе» (16+).
18.55 «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
19.00 «Наша жыццё».
20.00 «Час».
21.10 Серыял «Гурзуф» (16+).
23.15 «Спартклуб» (12+).
23.45 Серыял «Спадары-таварышы» (16+).
1.45 «Начныя навіны».

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.25 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
7.40, 20.10, 23.00 «СТБ-спорт».
9.00 «Тыдзень».
10.00 «Тыдзень спорту».
10.40 «Вялікае снеданне» (12+).
11.15 «Следакі» (16+).
11.40 Маст. фільм «Дзяржаўная граніца. Афганскі капкан». (12+).
13.50 Маст. фільм «Дзяржаўная граніца. Смяротны ўлоў». (12+).
15.35 «Ежа багоў» (16+).
16.50 «Вялікі горад».
17.35 Маст. фільм «Дзяржаўная граніца. Ілжывая мэта». (12+).
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Белыя ваўкі». Серыял (16+).
22.00 «Глядзець усім!» (16+).
23.05 «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
23.45 «Загадкі чалавецтва» (16+).
0.35 Драма «Дзявяткі». (16+).

МІР

6.20, 8.05 Серыял «Нянавісць». (16+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00 Навіны (бягучы радок).
9.30, 10.05, 13.15 Серыял «АСА» (16+).
14.00, 4.50 «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
15.00 «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
16.15, 1.35 «Гульня ў кіно» (12+).
17.10, 3.00 Серыял «Вяртанне Мухтара-2». (16+).
19.20 Серыял «Джамайка». (12+).
23.00, 0.10 Маст. фільм «Дачны раманс» (16+).
2.30 «Іншы свет» (12+).

РТР—Беларусь

7.00 «Раніца Расіі».
10.55 Надвор'е на тыдзень.
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.40 «Пакой смеху». (16+).
13.35 «Наша справа». (16+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
— Дэпутат не зможа купіць спецадзенне або нейкія сродкі першаснай абароны, але звярнуць увагу на іх адсутнасць можа і павінен, — лічыць **старшыня Клічаўскага раённага Савета дэпутатаў Уладзімір КНІГА.** — Пры рабоце ў працоўных калектывах мы нагадваем і пра недапушчальнасць ужывання алкаголю на рабочым месцы, і пра выкананне правілаў бяспекі і службовых інструкцый, і пра наяўнасць інструктажаў. На ведамасных семінарах і тых, што праводзяцца пад эгідай прадстаўнікоў сельскай гаспадаркі, упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, гэтаму ўдзяляецца шмат увагі. Але дэпутаты там часцей працуюць і як прадстаўнікі канкрэтных арганізацый. Сярод нас шмат кіраўнікоў, якія адказваюць за тэхніку бяспекі непасрэдна па сваіх службовых абавязках. Але своечасова папярэдзіць нешта і прадухіліць бяду — доўг любога грамадзяніна. Вось у нас нядаўна быў выпадак у раёне, калі загінуў работнік аднаго з прыватных прадпрыемстваў. Чалавек быў п'яны, але ніхто не звярнуў на гэта ўвагі. Звычайна пасля трагедыі знаходзяцца людзі, якія нешта бачылі, ведалі, але не думалі, што здарыцца дрэннае. Мы ўсе павінны быць сумленнымі.

Не хапае ведаў

— Для дэпутата вельмі важна, каб на працоўных месцах былі дысцыпліна і парадак, — згодная з калегамі **старшыня Краснапольскага раённага Савета дэпутатаў Анжаліка ГОМАН.** — Аднойчы на базе нашай гаспадаркі «Краснапольскі» праходзіў семінар, дзе пытанне бяспекі на рабочым месцы было ў цэнтры ўвагі. Удзел у ім прымалі прадстаўнікі дзяржаўнай інспекцыі працы, упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, ратавальнікі. Усе мы ведаем, што правілы накіраваны на тое, каб садзейнічаць захаванню жыцця, здароўя і працаздольнасці людзей на рабоце. Але, на жаль, хапае прыкладаў, калі яны ігнаруюцца, а гэта можа аднойчы прывесці да сумных наступстваў. Тое мерапрыемства прайшло з відавочнай карысцю. Было шмат пытанняў да спецыялістаў. Адчувалася, што многія ўдзельнікі папоўнілі прабелы ў ведах заканадаўства па ахове працы і пажарнай бяспецы.

Ёсць у вобласці і канкрэтныя прыклады, калі дзякуючы неабыякавасці народных абраннікаў былі значна палепшаны ўмовы працы некаторых работнікаў. У пасёлку Глуша Бабруйскага раёна дэпутаты дабіліся, каб у мясцовай краме паставілі кандыцыянер, бо працаваць там у летнюю спякоту было немагчыма. А яшчэ дзякуючы дэпутацкім клопатам у сталовай пасялковай участковай бальніцы памянялі старыя пліты на новыя.

— Дэпутат — гэта чалавек, якому аказалі вялікі давер, а значыць, ён павінен быць прынцыповым ва ўсіх пытаннях, — лічыць **старшыня Глушанскага сельскага Савета Марыя СУШЧАНКА.** — І мне імпануе, што сярод дэпутатаў нашага Савета шмат такіх людзей.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

❍ У тэму

Старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК:

— Шмат у каго з дэпутатаў пытанні бяспекі на працоўных месцах звязаны непасрэдна з іх прафесійнай дзейнасцю. Гэта кіраўнікі ўстаноў, арганізацый, прадпрыемстваў, гаспадарак. Клопат пра людзей заўсёды быў у дэпутатаў на першым месцы. Адзін з асноўных напрамкаў нашай работы — гэта калі мы адсочваем спраўнасць пячнога абсталявання, патрабуем ад кіраўнікоў сельскіх Саветаў праводзіць тлумачальную работу з насельніцтвам, кантраляваць абстаноўку разам з МНС. Многія нашы раёны запланавалі на найбліжэйшых сваіх сесіях разгледзець гэтыя пытанні і прыняць меры па прафілактыцы няшчасных выпадкаў. Калі людзі будуць дысцыплінаваныя ў адносінах да сябе, яны не будуць дапускаць парушэнняў і на рабочым месцы.

У АДКАЗЕ ЗА БЯСПЕКУ

Ці варта караць тых, хто пацярпеў па ўласнай віне?

Здаецца, прыцягваць да адказнасці тых, хто і так пацярпеў, не зусім гуманна. Ды і Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях не прадугледжвае пакарання работнікаў, якія атрымалі вытворчую траўму з-за ўласнай халатнасці. За парушэнні заканадаўства аб ахове працы прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці службовыя і юрыдычныя асобы, а работнікі нясуць адказнасць дысцыплінарную. Між тым палова выпадкаў у Гродзенскай вобласці, якія прывялі да траўматызму і нават гібелі, звязаны з невыкананнем пацярпелымі тэхнікі бяспекі.

ЗАСЦЯРОГА НЕ ЛІШНЯЯ

— Чаму сёння работнік, які мае кваліфікацыю, прайшоў стажыроўку, навучанне, праверку ведаў, забяспечаны індывідуальнымі сродкамі, парушае правілы бяспекі? — задаецца пытаннем **начальнік Гродзенскага абласнога ўпраўлення дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Мікалай ЛЯНКО.** — А часта менавіта чалавечы фактар становіцца прычынай траўматызму.

> Дарэчы, у міжнароднай практыцы існуюць і меры ўздзеяння на самих пацярпелых. Растлумачылі ў інспекцыі. Гэта пытанне шырока абмяркоўвалася і ў нашай краіне, нават было вынесена на разгляд дэпутатаў. Але пакуль ніякіх рашэнняў па ім не прынята.

А між тым нямала фактаў, якія сведчаць аб халатнасці самих работнікаў. У першым квартале года з 20 цяжка траўмаваных работнікаў восем пацярпелі па ўласнай віне — альбо не праявілі засцярогі, альбо не выканалі элементарных мер бяспекі, альбо знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення. Мікалай Лянко прыводзіць такія факты. У лютым гэтага года прычынай няшчаснага выпадку з рабочым Іўеўскай сярэдняй школы было халатнае стаўленне да бяспекі. Замест таго, каб прымяніць лесвіцу пры прачыстцы трубаправода, ён стаў на выпадковыя падстаўкі і, страціўшы раўнавагу, упаў і атрымаў цяжкія траўмы. У лютым 2018 года рамшчык Слонімскага ЖКГ праводзіў на тэрыторыі аграсядзібы распілоўку дрэва, пры руху назад аступіўся і ўпаў на калодку, у выніку чаго атрымаў цяжкую траўму пазваночніка. У сакавіку быў цяжка траўмаваны жывёлавод сельгаспрадпрыемства Шчучынскага раёна, які знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення. Мужчына ўпаў і трапіў рукой у рухавік транспарцёра. А нецвярозы машыніст асфальтаўкладчыка ў зону работы транспарцёра трапіў нагой, што таксама прывяло да траўмы. У Воранаўскім раёне пацярпела жанчына, якая не выканала элементарных правілаў бяспекі і зайшла ў загон для жывёл, дзе была траўмавана быком.

Работнікам варта праяўляць прынцыповасць, лічыць Мікалай Лянко. Калі чалавек прыйшоў на працу, ён мае права патрабаваць у наймальніка забяспечыць яго ўсім неабходным для папярэджання няшчаснага выпадку. А работнікі часам маўчаць.

(Заканчэнне на 14-й стар. «МС».)

У АДКАЗЕ ЗА БЯСПЕКУ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ДРОБЯЗЯЎ НЕ БЫВАЕ

Толькі за першы квартал гэтага года падчас маніторынгаў выяўлена больш за 1760 парушэнняў, амаль 270 чалавек звольнены з працы, 43 работнікі прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці. Адміністрацыйныя пакаранні вынесены 60 службовым і юрыдычным асобам, штрафы склалі больш за 10 тысяч рублёў.

У вобласці працягваецца расследаванне трох выпадкаў гібелі работнікаў. Парушэнні ў арганізацыі працы выяўлены на Лідскім торфабрыкетным заводзе, дзе ў лютым гэтага года пры выпрабаванні трываласці брыкету смяротна траўмавана 37-гадовая лабарант. Яе адзенне наматалася на барабан, а сама ўстаноўка не адпавядала стандартам.

Адсутнасць працоўнага дагавора выявілася пры гібелі 32-гадовага падсобнага рабочага на цэментным заводзе Ваўкавыскага раёна. У выніку абрушэння нараста цэменту пацярпелі два чалавекі, адзін з якіх загінуў на месцы, другі атрымаў траўму.

Найбольшая колькасць выпадкаў траўматызму назіраецца ў сферы АПК. І пакуль гэты ўзровень не ўдаецца знізіць, заяўляе Мікалай Лянко. Аналіз паказаў, што асноўнымі прычынамі няшчасных выпадкаў у сельскагаспадарчай галіне Гродзеншчыны ў мінулым годзе сталі парушэнні пацярпелымі працоўнай і вытворчай дысцыпліны, інструкцый па ахове працы. Не ўсе кіраўнікі і спецыялісты выконваюць свае службовыя абавязкі па арганізацыі працы.

Асаблівую заклапочанасць выклікаюць факты, якія паўтараюцца з году ў год. Але чамусьці не ўсе вучацца на чужых памылках. Дарэчы, два гады запар у вобласці адбываюцца няшчасныя выпадкі пры шынамантажы. У мінулым годзе траўмавана некалькі чалавек у Смаргоні, а сёлета сур'ёзныя наступствы напаткалі работнікаў сельгаспрадпрыемства Навагрудскага раёна. Пры дэмантажы кола яны не выпусцілі з шыны паветра, а сталі грэць гайку, каб адкруціць гэта кола. Адбыўся пнеўмавыбух, у выніку якога адзін з работнікаў (1964 г. н.) загінуў, а другі быў цяжка траўмаваны. Аналагічны выпадак адбыўся ў сакавіку ў Лідскім раёне. Разрыў кола нанёс цяжкія траўмы кіроўцу МАЗа.

— На жаль, людзі гінуць з-за дробязяў, з-за адсутнасці кантролю з боку службовых асоб, — адзначае Мікалай Лянко. — Прыязджаем у гаспадарку, бачым — тэхніка не падрыхтавана, ці павароты не працуюць, ці вогнетушыцеля няма, ці іншыя непаладкі. За гэта адказвае ў тым ліку і спецыяліст па ахове працы. У кожнай гаспадарцы яны павінны быць, але пасаду далёка не ўсюды займаюць работнікі з адпаведнай тэхнічнай адукацыяй. Прыкра, калі парушэнні выяўляюцца падчас спецыяльных даследаванняў, звязаных з траўмаваннем ці нават з гібеллю людзей.

Па аператыўных даных Гродзенскага ўпраўлення дзяржінспекцыі працы, у вобласці за першы квартал загінулі 4 чалавекі і 20 атрымалі цяжкія вытворчыя траўмы. У параўнанні з такім жа перыядам мінулага года сітуацыя больш спрыяльная, і ўсё ж...

> У інспекцыі па працы ўносяць прапанову паўсюдна праводзіць месячнікі і нават тыдні і дэкады бяспекі. У гэтым годзе такі месячнік станоўча паўплываў на правядзенне вяснова-палявых работ. І як вынік — за гэты перыяд у вобласці не было ніводнага выпадку смяротнага і цяжкага траўмавання.

СПАГАНЯЦЬ ЗА РАЗГІЛЬДЗЯЙСТВА

Гродзенская абласная тыпаграфія — прадпрыемства з павышанай рызыкай траўматызму. І хаця няшчасных выпадкаў тут не прыгадаюць, Сяргей Вішнеўскі, які ўзначаліў тыпаграфію паўтара года таму, адразу ўзяўся за парадак у ахове працы. Гэты кірунак ён лічыць важным і як дэпутат гарадскога Савета. Таму, акрамя работніка, які адказвае за меры бяспекі, прадпрыемства карыстаецца паслугамі прыватнага агенцтва працы. Згодна з дагаворам спецыяліст агенцтва рэгулярна праводзіць абследаванне ўмоў працы, падказвае, што трэба палепшыць, праводзіць інструктаж і знаёміць з новымі прававымі нормамі. Як наймальнік Сяргей Вішнеўскі гатовы ствараць усе ўмовы для бяспечнай працы, але і работнік, на яго думку, павінен адказваць за парушэнні, якія прыводзяць да няшчасных выпадкаў.

— Заканадаўства прадугледжвае дысцыплінарныя меры адказнасці работнікаў, якія дапусцілі няшчасны выпадак, у тым ліку і звальненне з працы, — адзначае Сяргей Вішнеўскі. — Але варта прадугледзець і фінансавыя меры да таго, хто пацярпеў з-за сваёй халатнасці. Няхай гэта будуць невялікія сродкі, але чалавек павінен ведаць, што ён таксама адкажа за сваё разгільдзяйства. Магчыма, ён пачне ставіцца да ўласных абавязкаў па-іншаму.

ТРЫВОЖНАЯ ТЭНДЭНЦЫЯ

У Гродзенскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў свая пазіцыя. Тут звяртаюць увагу на адказнасць наймальнікаў — нездавальняючую арганізацыю работ, эксплуатацыю абсталявання, якое не адпавядае патрабаванням бяспекі, недахопы ў навучанні і інструктажы, незабяспечанасць работнікаў неабходнымі сродкамі індывідуальнай абароны. А няшчасныя выпадкі звязваюць з неналежным кантролем за выкананнем работнікамі заканадаўства аб ахове працы, а таксама з элементарнымі нормамі бяспекі. І хоць сітуацыя па траўматызме паляпшаецца, прафсаюзы занепакоены новай тэндэнцыяй: людзі паміраюць на працы з-за стану здароўя. Пры гэтым сітуацыя насцярожвае. Па словах **старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі па Гродзенскай вобласці Рамуальда ЮРОЎСКАГА,** па гэтай прычыне за мінулы год на Гродзеншчыне не вярнуліся з працы 45 работнікаў, у 2016 годзе — памерлі на рабоце па стане здароўя 42 чалавекі. За першы квартал гэтага года такі ж лёс напаткаў яшчэ 17 работнікаў.

Чалавеку становіцца дрэнна ў асноўным з-за праблем сардэчна-сасудзістай сістэмы. Нямала выпадкаў, калі кіроўцы паміраюць за рулём аўтамабіля альбо іншай тэхнікі. Больш за ўсё такіх здарэнняў адбылося ў сферы АПК. У групе рызыкі — мужчыны ва ўзросце ад 40 да 60 гадоў. Прафсаюзы лічаць неабходным больш увагі ўдзяляць стану здароўя работнікаў — распрацаваць з Міністэрствам аховы здароўя план па прафілактыцы сардэчна-сасудзістых захворванняў для тых, каму за 40, асабліва для мужчын. Абавязваць наймальнікаў накіроўваць такіх работнікаў на паглыбленае медыцынскае абследаванне не радзей чым адзін раз на пяць гадоў. Стымуляваць тых, хто клапоціцца аб сваім здароўі і вядзе адпаведны лад жыцця.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

(Заканчэнне. Пачатак на 13-й стар. «МС».)

4 июля 2018 г. **ИЗВЕЩЕНИЕ** **№8-А/2018**

о проведении открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле

№ лота	Адрес земельного участка: г. Гомель	Кадастровый номер участка	Площадь, га	Целевое назначение	Наличие ограничений	Срок аренды, (лет)	Начальная стоимость, руб.	Сумма задатка, руб.	Расходы на подготовку документации, руб.
1	Район индивидуальной жилой застройки Романовичи (участок № 549 по генплану)	340100000008002882	0,0810	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	Охранная зона объектов газораспределительной системы	99	5 572,80	200,00	2 679,05
2	В районе улиц Фадеева – Евремова	340100000003003245	0,2793	Для строительства и обслуживания объекта общественного питания с системой по типу МакДрайв	Охранная зона сетей и сооружений канализации	5	41 368,04	2 000,00	2 488,07
3	По ул. Олимпийской (в районе существующей АЗС)	340100000002006063	0,1948	Для строительства и обслуживания ветеринарной клиники	Охранная зона электрических сетей, объектов газораспределительной системы	5	29 976,06	1 000,00	3 898,13
4	В микрорайоне № 18 (позиция № 40в и № 40г)	340100000001006402	0,1406	Для строительства магазина продовольственной группы товаров и бара на 30 мест	Охранная зона линий связи и радиофикации, электрических сетей, сетей и сооружений канализации	5	23 397,08	1 000,00	3 054,16
5	Ул. Юбилейная (в районе торговые ряды «Юбилейные»)	340100000001006464	0,0022	Для размещения легкотипного торгового киоска	Ограничений в использовании не имеет	5	437,28	30,00	2 625,47
6	По ул. Индендантской, 1А	340100000003003312	0,1829	Для строительства и эксплуатации здания административно-хозяйственного	Охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, сетей и сооружений канализации	5	21 770,37	1 000,00	2 838,06
7	В парке «Фестивальный»	340100000006005545	0,0252	Для размещения детского развлекательного комплекса	Ограничений в использовании не имеет	5	3 211,71	200,00	2 532,64
8	В микрорайоне Энергетиков, 16	340100000005007402	0,0020	Для размещения легкотипного торгового павильона	Ограничений в использовании не имеет	5	89,35	30,00	2 534,24

1. Организатор аукциона – коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).
2. Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданным эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» (г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. № 3–6, № 3–14).
3. **Аукцион состоится 4 июля 2018 г. в 15.00 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115,** при наличии не менее двух участников на каждый лот. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем, право аренды земельного участка предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.
4. К участию в аукционе допускаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр», в указанные в извещении сроки, следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка за каждый лот в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе.** Кроме того, **НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указание транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка за участие в аукционе** (в случае непобеды на аукционных торгах) – это только для физических лиц. Индивидуальные предприниматели и юридические лица производят оплату задатка со своего расчетного счета.
Необходимые документы:
4.1 граждане – копию документа, содержащего их идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;
4.2 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
4.3 идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;
4.4 представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;
4.5 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
4.6 представители иностранногогражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;
4.7 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность и его копию.
5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.
6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».
7. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государсвенным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 25 мая по 29 июня 2018 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3–6, 3–14.**

Контактный телефон 41-97-86. Информация размещена на сайте: www.gomel.gov.by либо geodezcentr.by

ПАТРЭБНАЕ «ЗВЯНО»

Грамадскі фонд па добраўпарадкаванні і сцэнарый урачыстай рэгістрацыі... Чым яшчэ займаюцца дэпутаты сельскага Савета?

ПАДЧАС выбарчых кампаній у мясцовыя Саветы дэпутатаў гучаць розныя меркаванні наконт каэфіцыента карыснага дзеяння дэпутатаў сельскіх Саветаў. Некаторыя лічаць, што такі прадстаўнічы орган цяпер зусім не патрэбны. Маўляў, на вёсцы дастаткова выканкама з яго невялікім штатам. А дэпутатаў у сельскай мясцовасці выбіраюць фармальна — добраахвотна-прымусова накіроўваюць у названы орган улады спецыялістаў, дзе яны потым толькі лічацца, значацца на паперы...

Завялі мы гэтую размову са **старшынёй Вольнаўскага сельскага Савета дэпутатаў Баранавіцкага раёна Наталляй ІБРАГІМАВАЙ.** А ў яе іншае меркаванне. Наталля Пятроўна толькі ў гэтым годзе абраная старшынёй сельскага Савета і пакуль што яна адназначна «за» дэпутатаў. У Вольнаўскім сельскім Савеце іх 11 — чацвёра засталіся з мінулага склікання, а ў астатнія акругі прыйшлі новыя людзі. На думку старшыні, іх дэпутаты не фармальныя, а дзейныя. Некаторыя раней былі старастамі вёсак.

У ДЭПУТАТЫ — СА СТАРАСТАЎ...

Менавіта са старасты вырасла ў дэпутата **Святлана ВЯЛЕНКА,** бібліятэкар з Паланечкі. Святлана — чалавек вясковы напалову. Як гэта? Хоць нарадзілася, школу скончыла яна ў горадзе, але кожнае лета праводзіла менавіта тут, у сваіх бабуль. А потым і лёс свой тут знайшла. Вось яе ўсе і ведаюць. Як сапраўдны работнік культуры заўсёды была чалавекам актыўнай жыццёвай пазіцыі. Ніколі не праходзіла міма нейкага непарадку, была завадатарам вясковых мерапрыемстваў.

— Аднойчы паехала ў раён на нараду па бібліятэчных справах, — расказвае Святлана Уладзіміраўна, — вяртаюся, а бабулькі-суседкі мне кажуць: «Мы цябе старастай вёскі абралі». Такім чынам, гэта адбылося на агульным сходзе нават без мяне. Ну выбралі, значыць, выбралі. І першае, што зрабіла паводле даўняй звычкі бібліятэчнага работніка, — завяла адмысловы журнал, куды ўсе неадкладныя справы стала запісваць. Вось, напрыклад, каля сядзібы пенсіянеркі трэба абкасіць, бо яна сама гэта зрабіць не можа. Знайшлі работніка, зрабілі гэтую справу. Запісана — значыць, і налета не забудзецца. Вёска Паланечка не малая — 436 чалавек, ёсць клуб, школа, крамы. Парадак каля грамадскіх устаноў і на прыватных падворках трэба падтрымліваць пастаянна, — бывае, і нагадаю іншаму, я не з тых, хто прамаўчыць, бо саромеецца.

А самае галоўнае, за што ўзяліся талакой, — навядзенне парадку на могілках. Там раслі векавыя дрэвы, якія даўно сталі аварыйнымі. Найперш сабралі грошы.

— Гэта не так проста. Цудоўна разумею, што для пенсіянера 30 рублёў — значная сума. Але размаўляла з людзьмі, пераконвала, і ўсе згаджаліся. Пазнаходзіла тэлефоны нашчадкаў у Мінску, іншых гарадах, і адгукнуліся тыя, чые родныя тут пахаваныя. Сабралі мы грошы, нанялі спецыялістаў, зрэзалі каля 30 дрэў, засталося яшчэ прыкладна паўтара дзясятка. Грошы ўжо сабраныя, будзем завяршаць гэтую работу. І таму вельмі прыемна, што, калі ўсе сабраліся для асвячэння могілак, людзі падыходзілі, дзякавалі, выказвалі парады, меркаванні. Гэта значыць, добрую справу мы робім разам.

...З НЕФАРМАЛЬНЫХ ЛІДАРАЎ

— Не адзін суботнік яна тут арганізавала, а, можа, дваццаць, — уступае ў гаворку старшыня сельвыканкама Наталля Ібрагімава. — І выканкам тут працаваў, і школа, і работнікі культуры, не кажучы ўжо пра пенсіянераў. Але ж некаму трэба было ўзяць на сябе функцыі арганізатара. І Святлана Уладзіміраўна тут аказалася на сваім месцы. Цяпер нават адказнага за могілкі выбралі на сходзе. Чалавек прыходзіць раз на тыдзень ці на два тыдні, аглядае, прыбірае нязначныя агрэхі. Вось, скажам, як узнікаюць стыхійныя звалкі? Вецер аднёс кветку з нейкай магілы пад куст. Прыехаў чалавек наведаць могілкі, паглядзеў, што пад кустом смецце, і сваё туды кінуў, за ім трэці — вось праз некалькі месяцаў і сметнік. А так адказны пройдзе і прыбярэ. Ідзе размова пра тое, што кожны жыхар будзе здаваць 50 капеек у месяц на добраўпарадкаванне могілак — гэта дасць магчымасць рэгулярна падкошваць траву, мінімальна прыбіраць тыя магілы, да якіх ужо няма каму прыехаць. І людзі ўжо гатовыя да таго, каб стварыць такі фонд. А гэта таксама клопат дэпутата з Паланечкі.

Яшчэ адзін дэпутат, які шмат гадоў пражыў у вёсцы, — **Міхаіл ТАБАЛА** з Задзвеі. Некалі Міхаіл Міхайлавіч загадваў пажарна-ратавальным пастом, цяпер ён на пенсіі. У названай вёсцы працаваў многія гады, мае несумненны аўтарытэт у насельніцтва. Ён не першы раз становіцца дэпутатам, хоць і не быў старастам, але ўвесь час лічыўся нефармальным лідарам вёскі. Каму патрабавалася дапамога, асабліва са старых адзінокіх, даўно прывыклі звяртацца да Міхаіла Табалы. У Задзвеі таксама востра стаяла пытанне добраўпарадкавання могілак. На гэтую справу сабралі 6000 рублёў. Паставілі новую агароджу, знеслі лішнія дрэвы. Вядома, галоўная справа — арганізацыйная. На суботнік, перш за ўсё клопатамі Міхаіла Міхайлавіча, удалося сабраць больш за 50 чалавек, у тым ліку і гарадскіх нашчадкаў. Маецца на ўвазе маштабны суботнік, а колькі было невялікіх, калі Міхаіл Табала арганізоўваў пэўную колькасць чалавек! Працавалі па меры неабходнасці па некалькі гадзін. Адным словам, зрабілі ўсё па-гаспадарску.

Старшыня Вольнаўскага сельскага Савета дэпутатаў Наталля ІБРАГІМАВА, старшыня Баранавіцкага райсавета дэпутатаў Сяргей СЛІВА, дэпутат сельскага Савета Святлана ВЯЛЕНКА.

...З МЯСЦОВАГА СЕЛЬВЫКАНКАМА

Савічы, Нагорнае і Чэрніхава ў сельскім Савеце вось ужо трэцяе пакаленне прадстаўляе **кіраўнік спраў сельвыканкама Аляксандра ПЯТКЕВІЧ.** Цікава, што падчас выбараў яна адна з адзінаццаці кандыдатаў атрымала 100 працэнтаў галасоў у сваю падтрымку. Пры галасаванні за астатніх хоць адзін ці два галасы былі «супраць», за Аляксандру Міхайлаўну ж выказаліся аднадушна. Па-першае, яна даўно тут працуе: як прыехала ў 1985 годзе маладым аграномам па размеркаванні, так і засталася ў вёсцы, а з 1991 года — у сельвыканкаме. На пытанне, што яна робіць менавіта як дэпутат, Аляксандра Пяткевіч адказала сціпла:

— Ды нічога асаблівага. Тыя пытанні, якія перыядычна ўзнікаюць, вырашаем у рабочым парадку. Людзі прывыклі тэлефанаваць, калі трэба падправіць дарогу, калі ўзнікаюць праблемы з той жа аўтакрамай, ды і іншыя самыя розныя. Я ж ведаю, у якую службу пазваніць, каго папрасіць... Вось, скажам, у Нагорным 38 жыхароў, большасць з якіх пенсіянеры. Зразумела, што паўстала пытанне аб закрыцці магазіна. Правялі сход яшчэ восенню, краму закрылі, у вёску стала прыходзіць гандлёвая машына. Зіму людзі пацярпелі і пачалі скардзіцца. Ну і давялося зноў аднаўляць работу стацыянарнай крамы. Прадаўца знайшлі, устанавілі графік работы. Людзі зараз задаволеныя... А яшчэ важныя самі стасункі. У маёй акрузе ўсе вёскі маленькія, жыхары ў большасці пажылыя. Ім важна адчуваць, што пра іх не забыліся. Таму трэба абавязкова пабываць у кожнай вёсцы, пагаварыць, пацікавіцца жыццём ды праблемамі.

> Кожны жыхар будзе здаваць 50 капеек у месяц на добраўпарадкаванне могілак — гэта дасць магчымасць рэгулярна падкошваць траву, мінімальна прыбіраць тыя магілы, да якіх ужо няма каму прыехаць.

Наталля Ібрагімава лічыць, што цяперашні склад дэпутатаў вельмі ўдалы. Усе людзі зацікаўленыя, нераўнадушныя. «Галоўная гісторыка-культурная каштоўнасць нашай тэрыторыі — былы палац Радзівілаў у Паланечцы, — расказвае старшыня. — Яго ўжо некалькі разоў спрабавалі прадаць. Пошук інвестара працягваецца, і мы вельмі спадзяёмся, што нашу славутасць адновяць. Мы з дэпутатамі ўжо прадумалі сцэнарый урачыстай рэгістрацыі шлюбу, а таксама нованароджаных. Менавіта ў палацы, прыгожым, велічным, былым княжацкім доме».

Святлана ЯСКЕВІЧ,
Баранавіцкі раён.

Сяргей СЛІВА, старшыня Баранавіцкага раённага Савета дэпутатаў:

— Лічу, што дэпутаты сельскіх Саветаў — патрэбнае звяно ў сістэме прадстаўнічай улады. Многае залежыць ад падыходаў да вылучэння кандыдатаў у дэпутаты. Калі мець на ўвазе толькі кіраўнікоў: сельгаспрадпрыемства, школы, устаноў культуры і аховы здароўя, — гэта будзе свайго роду «савет кіраўнікоў», якія толькі на сесіі сустрэнуцца, паціснуць адзін аднаму рукі, а нейкую частку абавязковай дэпутацкай работы могуць перакласці на падначаленых... А вось тая ж паштальёнка, што кожны дзень абыходзіць дамы, можа быць больш паспяховым і патрэбным дэпутатам, чым нехта з вельмі занятых кіраўнікоў. У тым жа Вольнаўскім сельскім Савеце актыўнасць у новым скліканні праяўляюць дэпутаты самых розных прафесій і роду заняткаў. Сярод іх — галоўны інжынер сельгаспрадпрыемства, медработнік, страхавы агент, пенсіянер.

ГРОШАЙ ШМАТ НЕ БЫВАЕ

Як мясцовыя падаткі папаўняюць бюджэты сельсаветаў

Мясцовыя падаткі і зборы маюць на мэце стварэнне прыбытковых крыніц мясцовых бюджэтаў. Да мясцовых падаткаў і збораў адносяцца, напрыклад, падатак за валоданне сабакамі, курортны збор, збор з нарыхтоўшчыкаў. У Мазырскім раёне, адзначае старшыня раённага Савета дэпутатаў Валянціна НАЗАРАНКА, за студзень — красавік 2018 года ў бюджэт паступіла амаль 46 тысяч рублёў мясцовых падаткаў і збораў (за адпаведны перыяд мінулага года — 44 тысячы).

— Пры гэтым прыбытковая частка бюджэту Мазырскага раёна на 2018 год сфарміравана ў аб'ёме крыху больш за 114 млн рублёў — за кошт падатковых і непадатковых плацяжоў. Мясцовыя падаткі і зборы спаганяюцца на працягу многіх гадоў. Паводле інструкцый, якія зацверджаны на падставе рашэння Мазырскага раённага Савета дэпутатаў (і адпаведна з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Падатковы кодэкс Рэспублікі Беларусь»), курортны збор залічваецца ў бюджэты па тэрытарыяльнай прыналежнасці — па месцы размяшчэння санаторна-курортных арганізацый. У нашым раёне такія ўстановы размешчаны на тэрыторыі Крынічанскага і Козенскага сельсаветаў — яны і атрымліваюць гэтыя сродкі. За студзень — красавік 2018 года паступіла курортнага збору амаль 33 тысячы рублёў (пры гадавым плане 95,5 тысячы рублёў), ці 34 %. Збор з нарыхтоўшчыкаў залічваецца ў бюджэт па месцы ажыццяўлення прамысловай нарыхтоўкі дзікараслай прадукцыі. За чатыры месяцы паступленні збору з нарыхтоўшчыкаў у раённы бюджэт склалі 3,3 тысячы рублёў, ці 21,2 % гадавога плана. Падатак за валоданне сабакамі застаецца па месцы рэгістрацыі ўладальнікаў сабак. З пачатку года паступленні падатку за валоданне сабакамі ў раённы бюджэт склалі звыш 9 тысяч рублёў, ці 39,2 % гадавога плана. Сабак з кожным годам людзі ўтрымліваюць усё больш, але часта неахвотна рэгіструюць іх у ЖЭУ. Таму прыходзіцца праводзіць з насельніцтвам індывідуальную работу на гэты конт.

Яшчэ адна крыніца папаўнення бюджэту сельсавета, якая дазваляе вырашаць шматлікія паўсядзённыя праблемы, — гэта сродкі самаабкладання. Сабраныя грошы, як правіла, накіроўваюцца на самыя неадкладныя сельскія патрэбы. Гэтыя добраахвотныя ўзносы — істотная дапамога для сельсаветаў, адзначае Валянціна Назаранка:

— Сельскія Саветы дэпутатаў Мазырскага раёна максімальна выкарыстоўваюць нададзенае ім у адпаведнасці з законам «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні права ўводзіць на сваіх тэрыторыях збор сродкаў на фінансаванне мэт, вызначаных мясцовым сходам. Так, за мінулы год у бюджэт сельсаветаў Мазырскага раёна паступіла звыш 34 тысяч рублёў. Гэтыя накіраваны на добраўпарадкаванне тэрыторый сельскіх населеных пунктаў.

У бюджэтах сельсаветаў на гэты год запланавана паступленне сродкаў самаабкладання ў суме звыш 33 тысяч рублёў. На гэты момант паступіла крыху больш за 8 тысяч, з якіх выкарыстана каля 3. У адпаведнасці з рашэннямі агульных сходаў жыхароў сельскіх населеных пунктаў, сёлета сродкі самаабкладання былі накіраваны на выраб інфармацыйных адрасных таблічак, скошванне пустазелля, рамонт агароджаў, выраб інфармацыйных альбомаў і іншае. Галоўнае тут — працаваць з насельніцтвам, даносіць да людзей інфармацыю, на што выкарыстоўваюцца іх грошы.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ПРАВЕРКА ПАКАЗАЛА

За парушэнне рэжыму водаахоўных зон і забруджванне вод у сакавіку — красавіку работнікі Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь склалі 135 пратаколаў. Пра тое, каго і за што пакаралі, расказалі самі спецыялісты.

Праверку стану патэнцыйна небяспечных аб'ектаў дзяржінспектары пачалі яшчэ ў канцы зімы. Папярэдне ўсе кіраўнікі такіх прадпрыемстваў (у асноўным сельскагаспадарчай галіны і ЖКГ) атрымалі прадпісанні, якія абавязвалі іх прыняць меры па недапушчэнні забруджвання навакольнага асяроддзя. Многіх праблем, якія наспявалі, дзякуючы гэтаму атрымалася пазбегнуць — папераджальны кантроль падзейнічаў. Але, на жаль, не на ўсіх.

Адміністрацыйны працэс пачалі дзяржінспектары Мінскай вобласці ў дачыненні да лагойскіх камунальнікаў. Прыступіўшы да рэканструкцыі ачышчальных збудаванняў горада, яны скідалі адходы без усялякай ачысткі ў раку Гайну. Канцэнтрацыя некаторых рэчываў у месцы ўпадзення сцёкаў перавышала дапушчальную ў дзясяткі разоў. Шкода, нанесеная прыродзе, ацэньваецца ў 123 тысячы рублёў.

На Мсціслаўшчыне з-за забруджвання адходамі мясцовага свінакомплексу загінула рыба на вадаёме каля вёскі Гутароўшчына. Накапляльнік вадкай арганікі перапоўніўся, сцёкі выцеклі і трапілі ў канал, а па ім — у вадаём. Прававую ацэнку дзеянням кіраўніцтва фермы дасць Мсціслаўскі РАУС.

Праблемы са сховішчамі арганікі праявіліся яшчэ ў перыяд раставання снегу. Як высветлілі інспектары падчас праверак, многія сховішчы не абсталяваны воданепранікальнымі зборнікамі для жыжы, а некаторыя перапоўненыя. Адходы могуць быць лёгка змытыя дажджамі ў каналы і адтуль трапяць у рэкі, што адаб'ецца на якасці вады і складзе іхтыяфаўны.

У Чэрвеньскім раёне з-за бяздзейнасці кіраўніцтва малочнатаварнага комплексу адбылося забруджванне арганічнымі сцёкамі вод меліярацыйнага канала, які ўпадае ў раку Чарняўку. Работнікі Бярэзінскай міжрайінспекцыі пачалі працэс у дачыненні да юрыдычнай асобы і галоўнага агранома.

> Канцэнтрацыя некаторых рэчываў у месцы ўпадзення сцёкаў перавышала дапушчальную ў дзясяткі разоў. Шкода, нанесеная прыродзе, ацэньваецца ў 123 тысячы рублёў.

У Полацкім раёне «пад артыкул» трапілі шэсць кіраўнікоў фермаў. Адходы гэтых гаспадарак уяўлялі патэнцыйную пагрозу для мясцовых вадаёмаў — азёр Лонне і Белае, рэк Струнка, Рабінаўка, Заходняя Дзвіна.

Праз паломку помпы на станцыі Полацкводаканала ў канцы красавіка сцёкавыя воды апынуліся ў раўчуку каля вёскі Чарнешчына. Вада ў ім стала шэрай і непрыемна запахла. Далей сцёкі трапілі ў Заходнюю Дзвіну. Абсталяванне станцыі ўдалося аператыўна адрамантаваць. Тым не менш за гэтае парушэнне вінаватыя панясуць адказнасць — адміністрацыйны працэс вядуць эколагі з Мінпрыроды, з якімі дзяржінспектары заўсёды супрацоўнічаюць пры вырашэнні падобных пытанняў.

Не спраўляюцца з адходамі гарадской сеткі і прадпрыемстваў ачышчальныя збудаванні г. Ашмяны — скідаюць умоўна ачышчаныя сцёкі ў раку Ашмянку. Месяц таму работнікі Смаргонскай міжрайінспекцыі выдалі дырэктару Ашмянскай ЖКГ прадпісанне ўрэгуляваць сітуацыю, цяпер давялося аштрафаваць кіраўніка за бяздзейнасць. Мяркуючы па брудных плямах і паху ў месцы скіду адходаў у раку каля вёскі Багданішкі, у вадзе відавочна перавышаныя нормы канцэнтрацыі хімічных рэчываў. Са 135 пратаколаў, складзеных дзяржінспектарамі ў сакавіку — красавіку, 42 датычацца юрыдычных асоб, 93 — фізічных (работнікі прадпрыемстваў-парушальнікаў, якія не выканалі належным чынам свае службовыя абавязкі па прадухіленні забруджванняў). Штраф для юрыдычных асоб складае да 500 базавых велічынь (забруджванне) і да 50 базавых велічынь (парушэнне рэжыму), для фізічных асоб — да 20 і да 10 базавых велічынь адпаведна.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ!

А З НАШАГА АКНА ВІДАЦЬ... ПРАБЛЕМА

Што рабіць, калі замінае дрэва ў двары

МАЙ. Усё вакол квітнее, буйна разрастаецца маладая зеляніна — прыгажосць, ды і толькі! Але не для ўсіх. Ёсць тыя, хто зусім не рады, што ў іх вокны падчас моцнага ветру настойліва стукаюць галінкі разрослага дрэва, ад пылку нідзе няма збаўлення, а сонечнага святла пакоі не бачылі, здаецца, ніколі. Мы пастараліся высветліць, як знайсці ідэальны баланс паміж прыгажосцю і камфортам, пры гэтым не сапсаваўшы адносіны з суседзямі.

У маёй сяброўкі ёсць дзядуля, ён жыве адзін у «хрушчоўцы». Нягледзячы на тое, што дзеці і ўнукі стараюцца рэгулярна яго наведваць, пажылому чалавеку не хапае зносін. І, як і многія іншыя, ён знайшоў сабе «суразмоўнікаў», заўсёды гатовых яго выслухаць, а менавіта... гарадскія службы. Літаральна праз паўгода пасля позняга выхаду на пенсію дзядуля даследаваў усе навакольныя двары на прадмет парушэнняў: аблезлае дзіцячае абсталяванне, зламаныя лаўкі, прыпаркаваныя на газонах машыны — нішто не схаваецца ад яго пільнага вока. Зараз на парадку дня новая праблема — вялізны клён, які быццам бы павышае ў кватэры вільготнасць. Звычайна ўнучка падтрымлівае ўсе пачынанні дзеда, але цяпер яна і сама не ведае, што рабіць: з аднаго боку, не хочацца псаваць адносіны з суседзямі, якім наяўнасць гэтага клёна вельмі нават падабаецца, з другога, у кватэры заўжды змрочна і халаднавата. Як быць у такой сітуацыі?

> Калі камісія падчас абследавання вырашыць, што нормы парушаюцца і дрэва сапраўды перашкаджае, яго ссякуць. Пры гэтым меркаванне іншых мясцовых жыхароў улічана не будзе: правілы ёсць правілы.

Галоўнае, што неабходна засвоіць: у падобнай сітуацыі ні ў якім разе нельга прымяняць меры самому. Высечка дрэў — справа адказнай за гэта арганізацыі. Самавольнае ўмяшанне можа пацягнуць за сабой немаленькі штраф — аж да 50 базавых велічынь. Прычым гэта датычыцца не толькі высечкі, але і абрэзкі: калі зрабіць яе не ў час, можа загінуць усё дрэва. Лепш звярнуцца да спецыялістаў, якія сапраўды ведаюць, што і як рабіць. У дварах дамоў часцей за ўсё дрэвы знаходзяцца на кантролі жыллёва-камунальнай службы.

Важкіх прычын, каб выдаліць дрэва ў двары, можа быць некалькі. Напрыклад, яно расце бліжэй, чым за пяць метраў ад дома, не прапускае святло ў кватэру, перашкаджае праходзіць па тратуары, небяспечна нахілена або мае карані, якія выступаюць на паверхню, засохла ці хварэе. Перш чым прыняць рашэнне аб выдаленні дрэва, сітуацыю вывучыць спецыяльная камісія. Калі дрэва будзе прызнана сапраўды пашкоджаным, то кампенсацыйныя пасадкі праводзіцца не будуць. А вось калі яго збяруцца высекчы з-за таго, што яно перашкаджае эксплуатацыі будынка, тады замест аднаго «нязручнага» зялёнага прыгажуна з'явіцца дзесяць новых. Але не абавязкова каля таго ж самага дома: хутчэй за ўсё, саджанцы будуць «раскіданы» па ўсім раёне. Дарэчы, самому папоўніць недахоп зеляніны таксама нельга. Дрэвы і нават кусты можна высаджваць толькі пасля ўзгаднення з камунальнымі службамі, бо падчас росту яны могуць пашкодзіць камунікацыі. Адзінае, чым можна займацца самастойна, дык гэта кветкамі.

За апошнія два гады тэлефон 115 трывала замацаваўся ў свядомасці мінчан, як і адрас партала 115.бел. Аднак звяртацца ў гэтыя службы мы б не рэкамендавалі — усё ж такі яны займаюцца больш аператыўнай працай. Лепш напрамую звязацца з жыллёва-камунальнай службай раёна — КУП ЖКГ. Але па тэлефоне (праверана на ўласным вопыце) падобныя прэтэнзіі прымаць адмаўляюцца. Затое даходліва тлумачаць, як скласці зварот. Ён павінен быць пісьмовым, і ў ім неабходна падрабязна расказаць, чаму вы лічыце неабходным выдаліць дрэва. Як мы даведаліся, калі камісія падчас абследавання вырашыць, што нормы парушаюцца і дрэва сапраўды перашкаджае, яго ссякуць. Пры гэтым меркаванне іншых мясцовых жыхароў улічана не будзе: правілы ёсць правілы.

Вядома, высечка дрэў у двары — не самая прыемная працэдура, часам здаецца, што страчваеш жывога сябра. Але думаць — у першую чаргу пра сваю бяспеку і бяспеку сваіх блізкіх неабходна.

Дар'я КАСКО.

Выпас жывёлы — па правілах

Праблема безнагляднага выпасу жывёлы і выхаду яе на чыгуначныя пуці па-ранейшаму актуальная.

Сутыкненне цягнікоў са свойскімі жывёламі (каровамі, коньмі і г. д.) цягне за сабой не толькі іх гібель, але і стварае пагрозу бяспецы руху, наносіць эканамічную шкоду чыгункі, а таксама з'яўляецца прычынай збояў у графіку руху пасажырскіх і грузавых цягнікоў. Акрамя таго, у выніку экстраннага тармажэння або сутыкнення ўзнікае небяспека траўмавання пасажыраў і работнікаў лакаматыўных брыгад.

Паводле інфармацыі прэс-цэнтра магістралі, у 2017 годзе і за чатыры месяцы гэтага адбылося 12 выпадкаў наезду рухомага саставу на жывёл, у выніку чаго іх загінула 46, а за аднаведны папярэдні перыяд зафіксавана дзевяць падобных здарэнняў, загінула 29 галоў жывёлы.

У сувязі з пачаткам сезона масавага выпасу жывёлы на лугах паблізу чыгуначных пуцей Беларуская чыгунка звяртаецца да кіраўнікоў сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, старшыняў сельскіх выканаўчых камітэтаў, а таксама ўладальнікаў прыватных падворкаў з просьбай выконваць патрабаванні, якія прад'яўляюцца да выпасу жывёлы паблізу чыгункі і прагону яго цераз чыгуначныя пуці.

Таксама падчас правядзення палявых работ актуальнай з'яўляецца праблема праезду сельскагаспадарчай тэхнікі праз чыгуначныя пераезды на забараняльны сігнал святлафора.

Сяргей РАСОЛЬКА.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 24 мая 2018 года.